Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

16 КРАСАВІКА 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 71
(26429)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

АТЭРАСКЛЕРОЗ САСУДАЎ РУК, НОГ І ГАЛАВЫ

Пры атэрасклерозе галаўнога мозгу можа быць інсульт, пры гэтай жа хваробе ног — гангрэна... Атэрасклераты чныя паражэнні артэрый праяўляюцца болем пры хадзе, а праз нейкі час — і ў стане спакою. Паступова ўзнікае неабходнасць аператыўнага ўмяшання, праўда, сёння тыя ж гангрэны лечацца з захаваннем канечнасцяў. Аб дыягностыцы атэрасклераты чных паражэнняў артэрый, лячэнні гангрэнаў з захаваннем канечнасцяў, прафілактыцы інсультаў можна даведацца ад **загадчыка аддзялення сасудзістай хірургіі Мінскай абласной клінічнай бальніцы Паўла Паўлавіча АЎДЗЕЯ.**

«Прамая лінія» з яго ўдзелам адбудзецца **24 красавіка, у пятніцу, з 15.00 да 16.00 па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.** *Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).*

Сёлета плануецца атрымаць не менш як 9,4 млн тон збожжа

Беларусь у 2009 годзе плануе атрымаць ураджай збожжа ў аб'ёме не менш як 9,4 млн тон у вазе пасля дапрацоўкі, паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль Седзін, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

У мінулым годзе ў рэспубліцы атрымана 9,015 млн тон збожжа ў вазе пасля дапрацоўкі.

Сяўбу ранніх яравых збожжавых у большасці гаспадарак Беларусі плануецца завяршыць не пазней за 20 красавіка. «Паўночныя раёны могуць сеяць да 25 красавіка, усе астатнія павінны завяршыць сяўбу ранніх яравых збожжавых да 20 красавіка, усе ўмовы для гэтага ёсць», — сказаў Васіль Седзін. Цяпер па тэмпах пасяўная кампанія выйшла на ўзровень мінулага года, нягледзячы на тое, што сяўба ў краіне пачалася на 10 дзён пазней. Яравыя збожжавыя і зернебабовыя культуры пасеяны на 664,7 тыс. га, або 65,6 працэнта да плана.

«Намечаны сур'ёзныя меры па падтрымцы асабістых падсобных гаспадарак, — расказаў намеснік міністра. — Рыхтуецца спецыяльная праграма, спадзяёмся, што ў бліжэйшы час яна будзе ажыццёўлена». «Калі раней некаторыя недаацэньвалі значэнне асабістых падсобных гаспадарак, то сёння, ва ўмовах крызісу, іх развіццё асабліва актуальна, — дадаў Васіль Седзін. — Мы павінны аказваць дапамогу такім гаспадаркам, актыўна працаваць з насельніцтвам, паколькі менавіта ад яго мы атрымліваем значны аб'ём малака, бульбы і іншай прадукцыі раслінаводства».

Сярэдняя зарплата ў лютым — 906,2 тысячы рублёў

Паводле папярэдніх звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у студзені-лютым гэтага года аб'ём грашовых даходаў насельніцтва склаў 13,2 трыльёна рублёў і ў параўнанні з адпаведным леташнім перыядам павялічыўся на 22,9 % пры росце спажывецкіх цэнаў на тавары і паслугі за гэты перыяд на 15,4 %. У выніку рэальныя грашовыя даходы (з улікам індэкса спажывецкіх цэнаў) павялічыліся на 6,5 %.

Асноўнымі крыніцамі фарміравання грашовых даходаў насельніцтва з'яўляюцца аплата працы і трансферы насельніцтву (пенсіі, дапамогі і стыпендыі). Намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата работнікаў у студзені-лютым 2009 года склала 912,2 тысячы рублёў, у тым ліку ў лютым — 906,2 тысячы і ў параўнанні са студзенем гэтага года зменшылася на 1,5 %, ці на 13,5 тысячы рублёў. Рэальная налічаная зарплата (зарплата, разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэнаў на тавары і паслугі) у лютым у параўнанні з лютым мінулага года павялічылася на 2,7 %, у параўнанні са студзенем гэтага года — зменшылася на 2,7 %.

У сакавіку сярэдні памер пенсіі, назначанай органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, склаў 390,6 тысячы рублёў, пенсіі па ўзросце — 408,9 тысячы, па інваліднасці — 361,3 тысячы, па выпадку страты карміцеля — 244,2 тысячы, сацыяльнай пенсіі — 176,1 тысячы рублёў. Рэальны памер прызначанай пенсіі ў сёлетнім сакавіку ў параўнанні з леташнім зменшыўся на 2,8 %, у параўнанні з лютым гэтага года — на 0,6 %.

Ігар ГРЫШЫН.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗБІРАЛЬНІКІ СОНЦА

Геліограф, усталяваны на станцыі фонавага маніторынгу «Бярэзінскі запаведнік», вылічвае выпраменьванне сонечнага святла, а дакладней, колькасць гадзін чыстага сонца за дзень, тыдзень, месяц, год. Гэта адна з задач станцыі па вывучэнні антрапагеннага ўздзеяння на біясферу праз вызначэнне фонавага стану. Працуючы па праграме Глабальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя, станцыя вядзе працы па двух асноўных напрамках: геахімічным і геафізічным маніторынгах. А гэта гідрабіялагічныя назіранні, назіранні за кліматам, узроўнем радыяцыі, забруджваннем паветра і колькасці ападкаў. Сёлета спаўняецца роўна трыццаць гадоў, як пачала дзейнічаць гэтая ўстанова, дарэчы, адзіная ў краіне. З дня яе адкрыцця калектывам метэаролагаў кіруе выпускнік Адэскага гідраметэаралагічнага інстытута інжынер ***Анатоль СРЫБНЫ*** *(на фотаздымку), беларускі палярнік. У васьмідзесятых гадах А. Срыбнаму давялося ўдзельнічаць у 31-й Савецкай антарктычнай экспедыцыі і несці вахту на Паўднёвым полюсе на станцыях «Дружная» і «Новалазараўская». Збіраць і аналізаваць звесткі прыродных з'яў на тэрыторыі Бярэзінскага запаведніка Анатолю Срыбнаму падабаецца, як і некалі на Паўднёвым полюсе.*

Да лета дачная нерухомасць вакол Мінска можа патаннець на 20—30 працэнтаў

Такі смелы прагноз нашаму выданню прапанаваў дырэктар Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ. Адразу ўдакладнім, што гаворка ідзе аб жыллёвай нерухомасці на невялікіх сотках у садаводчых таварыствах і дачных кааператывах адлегласцю не больш за 30—50 км ад Мінска.

Рынак актывізаваўся

Менавіта ў красавіку пачаў з'яўляцца рэальны попыт на загародную нерухомасць. Да апошняга часу кліенты са свабоднымі грашыма больш звярталі ўвагу на патанелыя кватэры ў Мінску і абласных цэнтрах. Пасля адкрыцця новага дачнага сезона актывізаваўся попыт і на зямельныя ўчасткі з невялікімі пабудовамі ў садаводчых таварыствах і вёсках побач з транспартнымі магістралямі. Мікалай Прасталупаў адзначае, што агульная тэндэнцыя на патаннение нерухомасці закранула і гэты сегмент рынку ўжо ў лютым—сакавіку, але яшчэ і цяпер тут назіраецца вельмі вялікі роскід цэнаў на садовыя домікі, часам даволі падобных характарыстык.

Самыя танныя, але не вельмі якасныя дачы прапануюцца па маладзечанскім напрамку адлегласцю да 35—40 кіламетраў ад Мінска ў садаводчых таварыствах «Холмы-95» побач з Вязынкай, у с.т. «Уша» (Радашковічы), у с.т. «Здароўе» і «Медтэхнік» (Баяры). Зямельныя ўчасткі плошчай каля 5—6 сотак з сезоннымі жылымі домікамі плошчай да 25 квадратных метраў ці ўвогуле бытоўкамі да 15 «квадратаў» каштуюць ад 5 да 10 тысяч долараў. Па мядзельскім напрамку ў садаводчым таварыстве «Лясное» (25 км ад МКАД) садовы жылы дом на 8 сотках каштуе каля 8—9 тысяч долараў.

Па брэсцкім напрамку недалёка ад Фаніпаля самыя танныя 6 сотак з бытоўкамі, электрычнасцю і сезонным водазабеспячэннем каштуюць ад 8 да 10 тысяч долараў. Невялікія садовыя домікі па лагойскім кірунку прапануюцца ўжо мінімум па 15—16 тысяч долараў. Абсалютна гатовыя для жылля дачы па маскоўскім кірунку побач з Гарадзішчам (18 км ад МКАД), Дамашанамі (20 км), Малым Залужжам (22 км) каштуюць мінімум каля 20 тысяч долараў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Запасы гатовай прадукцыі ў I квартале ўзраслі да 91,8 працэнта сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці

паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

На 1 сакавіка 2009 года аб'ём нерэалізаванай прадукцыі складаў 91,3 працэнта. На прадпрыемствах машынабудавання і металаапрацоўкі запасы дасягнулі больш як Br3 трлн, або 166,3 працэнта да сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці. Хоць за апошні месяц намецілася іх некаторае зніжэнне, паколькі на 1 сакавіка запасы складалі 167,7 працэнта. Але ў аўтамабільнай галіне гэты паказчык склаў 295,6 працэнта, запасы — на Br1,255 трлн. У лёгкай прамысловасці аб'ём нерэалізаванай прадукцыі крыху знізіўся за тры месяцы — 195,7 працэнта на Br586,8 млрд, у студзені-лютым было 196 працэнтаў. У тэкстыльнай галіне запасы склалі на 1 красавіка 201,8 працэнта, у швейнай — 175,5 працэнта, гарбарнай, футравай, абутковай — 194,1 працэнта. Дастаткова вялікія аб'ёмы нерэалізаванай прадукцыі ў дрэваапрацоўчай (107,6 працэнта), цэлюлозна-папяровай прамысловасці (113,2 працэнта), у харчовай (96,8 працэнта), у тым ліку ў цукровай (рост у 6,2 раза). У адпаведнасці з пастановай урада ад 9 сакавіка 2009 года № 298 у прамысловасці Беларусі ўстаноўлены нарматывы запасаў. Да канца года гэты паказчык у прамысловасці павінен скласці не больш як 57,5 працэнта да сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці. У першым квартале суадносіны складскіх запасаў і сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці планаваліся на ўзроўні не больш як 77 працэнтаў, у першым паўгоддзі — 69 працэнтаў, за дзевяць месяцаў — 63 працэнты. Па выніках першага квартала заданне па зніжэнні запасаў гатовай прадукцыі выканалі прадпрыемствы і арганізацыі Мінбудархітэктуры, Мінгандлю, Мінтранса, Мінфіна, Мінскай і Магілёўскай абласцей.

Захарава, Цыскарыдзэ, Увараў танцавалі тут

Зоркі вялікага балета ўпершыню выйшлі на сцэну Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.

Пётр Чайкоўскі, «Лебядзінае возера». З гэтага балета пачаўся адлік Года культуры Расіі ў Беларусі. Наўрад ці можна прыдумаць, якая яшчэ пастаноўка найлепш бы адлюстроўвала дух расійскага балета. Таксама як і цяжка прыдумаць, якое мастацтва лепш за балет заявіла б пра ўзровень расійскай культуры: яна па-ранейшаму па ўзроўні балета наперадзе планеты ўсёй. Мы пра гэта ведалі, а цяпер яшчэ атрымалі магчымасць упэўніцца на свае вочы: Дзяржаўны акадэмічны Вялікі тэатр Расіі дагэтуль не выступаў у Беларусі. Падзея сапраўды гістарычная.

Натуральна, каб паказаць рускі балет ва ўсёй красе, ніхто не разменьваецца — пастаноўку прывезлі ў Мінск з усімі дэкарацыямі ў дзвюх фурах, і з усімі зоркамі, ушанаванымі ганаровымі званнямі, тытуламі, талент якіх прызнаны ва ўсім свеце. У артыстаў быў час асвойтацца на новай для сябе сцэне, парэпеціраваць. Тым больш што ў іх Вялікім тэатры зараз таксама вядзецца рэканструкцыя...

Як высветлілася, прыстасавацца, прывыкнуць да новых умоў асабліва важна для Святланы Захаравай — Адэты-Адылііі. Прыма Вялікага была настроена рашуча, каб адолець сцэну Мінскага тэатра. Расійскія артысты ведалі, што ён толькі адкрыўся пасля рэканструкцыі. Аднак пры гэтым яны прывезлі з сабой спецыяльнае пакрыццё на падлогу, на якім танчыць зручна, звыкла, а галоўнае — надзейна.

Аднак галоўная засцярога ад любых нечаканасцяў — вера ў партнёра. Калі Андрэй Увараў прыехаў у Мінск загадзя і таксама прыстасоўваўся да новых умоў, то яго антыпод на сцэне Мікалай Цыскарыдзэ прыляцеў у Мінск толькі напярэдадні выступлення. Ён з тых зорак, пад якіх любая сцэна прыстасуецца сама...

Перамога дабрыні над злымі сіламі ў балеце Чайкоўскага — добры знак для адкрыцця важнай міждзяржаўнай акцыі. Нездарма ж кажуць: як год пачнеш, так і правядзеш. І калі меркаваць па колькасці гасцей, якія прыехалі ў Мінск, з расійскай культурай мы будзем знаёміцца грунтоўна.

На адкрыццё Года культуры ў Беларусь прыехала вялікая дэлегацыя з Расіі на чале з Міністрам культуры Аляксандрам Аўдзеевым. У Нацыянальным мастацкім музеі ён сустрэўся з беларускім калегам Уладзімірам Мацвейчуком. Двум міністрам было што абмеркаваць: чакаецца, што сёлета будзе падпісана пагадненне аб культурным супрацоўніцтве паміж нашымі дзяржавамі. Паводле дамоўленасцяў у наступным годзе сваіх суседзяў мы будзем здзіўляць сваімі культурнымі набыткамі — падчас Года Беларусі ў Расіі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

белагропромбанк

традиции будущего

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2009 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	277 229,4	165 847,8
3	Средства в Национальном банке	1102	2	198 943,6	172 591,2
4	Ценные бумаги:	1103		1 160 153,2	371 077,0
	для торговли	11031	3	—	—
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	4,8	—
	в наличии для продажи	11033	3.2	1 160 148,4	371 077,0
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	212 793,2	297 934,1
6	Кредиты клиентам	1106	5	14 090 147,3	7 668 349,7
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	24 945,6	6 662,6
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	415 739,5	296 253,5
9	Прочие активы	1109	8	148 184,6	50 605,6
10	**ИТОГО активы**	110		16 528 136,4	9 029 321,5
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	1 663 747,3	596 415,1
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	2 128 027,7	1 450 106,8
14	Средства клиентов	1206	11	8 089 714,8	4 578 446,7
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		116 802,1	68 424,4
16	Прочие обязательства	1209	12	134 157,9	60 069,7
17	**ВСЕГО обязательства**	120		12 132 449,8	6 753 462,7
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	3 828 633,5	1 878 635,0
20	Эмиссионный доход	1212		—	—
21	Резервный фонд	1213		41 861,8	30 726,0
22	Накопленная прибыль	1214	14	298 687,4	190 316,9
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	226 503,9	176 180,9
24	**ВСЕГО капитал**	121		4 395 686,6	2 275 858,8
25	**ИТОГО обязательства и капитал**	12		16 528 136,4	9 029 321,5
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	14 197 474,7	8 537 825,9
28	Обязательства	1302	17	3 149 742,0	1 660 629,3

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2009 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2009 г.	2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		468 142,3	198 613,5
2	Процентные расходы	2012		343 908,3	129 564,1
3	Чистые процентные доходы	201	18	124 234,0	69 049,4
4	Комиссионные доходы	2021		50 835,2	36 666,9
5	Комиссионные расходы	2022		5 009,9	3 066,7
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	45 825,3	33 600,2
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	(-121 368,4)	7 489,5
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	(-882,9)	(-431,1)
9	Доход в форме дивидендов	205		—	—
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	49 195,6	12 480,8
11	Прочие доходы	207	23	159 176,0	5 573,8
12	Операционные расходы	208	24	91 021,2	71 345,0
13	Прочие расходы	209	25	13 680,2	2 084,1
14	Налог на прибыль	210		19 421,6	11 504,8
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		33 665,4	17 867,1

Председатель Правления **С.Н. Румас**

Главный бухгалтер **М.А. Шаповалова**

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

время работы 8.00-22.00 без выходных и праздничных дней:
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (Life:), Velcom, МТС) -
по тарифам операторов мобильной связи.
www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ГОДОВОЙ БАЛАНС

ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» за 2008 год

220013, г. Минск, ул. Я. Коласа, 38, тел. 209 41 11, 285 76 22

лицензия № 02200/0447184, 06.02.2009 г. — 26.03.2014 г., выдана МФ РБ, УНП 101063229 *млн. руб.*

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	**30 230,3**	**Источники собственных средств, всего**	**17 680,7**
Нематериальные активы	**62,5**	в том числе: уставный фонд	10 752,7
Финансовые вложения, всего	**4 801,7**	резервный фонд	704,6
в том числе: инвестиции в дочерние общества	—	добавочный фонд	1 954,3
инвестиции в другие организации	542,8	фонд накопления	3 645,3
облигации и другие долговые обязательства		фонд потребления	1,6
прочие финансовые вложения	4 258,9	целевое финансирование	—
Доля перестраховщиков в страховых резервах	**337,1**	нераспределенная прибыль прошлых лет	219,9
		нераспределенная прибыль отчетного года	402,3
Дебиторы, всего	**7 540,9**	**Страховые резервы и фонды, всего**	**48 922,2**
в том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	253,4	в том числе: страховые резервы	40 921,9
		фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	8 000,3
		гарантийный фонд	—
депо премий по рискам, принятым в перестрахование	—	**Кредиторы, всего**	**5 696,2**
		в том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	532,1
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	7 287,5	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	—
Прочие активы, всего	**31 649,1**	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	—
в том числе: незавершенное строительство	609,8	заемные средства	1 074,8
материальные ценности и затраты	4 107,5	кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	4 089,3
денежные средства	26 931,8	**Прочие пассивы**	**2 322,5**
собственные акции (доли)	—		
прочие активы	—		
Непокрытые убытки прошлых лет	—		
Непокрытые убытки отчетного года	—		
БАЛАНС	**74 621,6**	**БАЛАНС**	**74 621,6**

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ

ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко» за 2008 год

млн. руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни		
Страховые взносы (премии)	010	—
Страховые выплаты	020	—
Изменения резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	—
Отчисления в фонды	040	—
Расходы на ведение дела	041	—
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	**050**	**—**
II. Страхование иное, чем страхование жизни		
Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование	064	86 772,7
Изменения резерва незаработанной премии — нетто перестрахование (+ или -)	067	- 2 749,9
Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование (+ или -)	082	54 463,5
Изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -)	092	- 8 520,7
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	
Изменение других страховых резервов (+ или -)	105	
Отчисления в фонд предупредительных мероприятий и гарантийные фонды	110	3 585,7
Расходы на ведение дела	120	20 349,0
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	3,9
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	980,5
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	**130**	**- 3 872,7**
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I		
Операционные доходы	140	21 133,2
Операционные расходы	145	18 262,9
Внереализационные доходы	150	5 273,6
Внереализационные расходы	155	972,2
Платежи и расходы производимые из прибыли	156	252,8
Финансовый результат	157	3 046,2
Использование прибыли	158	2 643,9
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	**170**	**402,3**

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО БУХГАЛТЕРСКОЙ (ФИНАНСОВОЙ) ОТЧЕТНОСТИ (С ВЫРАЖЕНИЕМ БЕЗУСЛОВНО ПОЛОЖИТЕЛЬНОГО АУДИТОРСКОГО МНЕНИЯ)

Директору ОАСО «БИ ЭНД БИ ИНШУРЕНС КО» Меднику Борису Бениаминовичу

Аудируемое лицо:

Открытое акционерное страховое общество «БИ ЭНД БИ ИНШУРЕНС КО» 220013, г. Минск, ул. Я. Коласа, 38/16, к. 2.

Зарегистрировано в Комстрахнадзоре при Минфине РБ, едином государственном реестре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, УНН 101063229, в качестве налогоплательщика зарегистрировано в Первомайской ИМНС г. Минска.

Аудиторская организация:

Индивидуальный предприниматель Волчкова Алина Константиновна;

Местонахождение: г. Минск, ул. Жилуновича, д. 37, кв. 47;

УНН: 100961335, свидетельство № 0067877 от 4.03.2002 г. выдана администрацией Заводского района г. Минска, лицензия на осуществление аудиторской деятельности выданная 28.11.2008 года № 02200/0040484 Министерством Финансов РБ срок действия до 22 января 2014 г., квалификационный аттестат аудитора № 0000894 от 30.07.2003 года выданный Министерством Финансов РБ.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАСО «БИ ЭНД БИ ИНШУРЕНС КО», состоящей из:

бухгалтерского баланса на 01.01.2009 г.;

отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств, отчета о платежеспособности страховой организации, расчета чистых активов, приложения к бухгалтерскому балансу за 2008 г.;

пояснительной записки.

Руководство ОАСО «БИ ЭНД БИ ИНШУРЕНС КО» несет ответственность за подготовку и представление бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данной бухгалтерской (финансовой) отчетности и соответствии совершенных ОАСО «БИ ЭНД БИ ИНШУРЕНС КО» финансовых (хозяйственных) операций законодательству, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями республиканских правил аудиторской деятельности. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытия информации в бухгалтерской (финансовой) отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля ОАСО «БИ ЭНД БИ ИНШУРЕНС КО» с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а не для выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

Мнение.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАСО «БИ ЭНД БИ ИНШУРЕНС КО», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАСО «БИ ЭНД БИ ИНШУРЕНС КО» на 1 января 2009 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2008 г., при этом совершенные ОАСО «БИ ЭНД БИ ИНШУРЕНС КО» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

Аудитор — индивидуальный предприниматель:

Волчкова А.К.

Дата подписания аудиторского заключения: «24» февраля 2009 г.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 16.04.2009 г. (для б/н разлікаў)

		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
▲	1 долар ЗША ... 2 823,00		
▼	1 еўра ... 3 732,01	Цэнтрабанк РФ	
	1 латвійскі лат ... 5 263,35	USD ... 33,4507	
	1 літоўскі літ ... 1 080,76	10 UAH ... 41,8003	
	1 чэшская крона ... 139,57	1000 BYR ... 11,8788	
	1 польскі злоты ... 871,55	EUR ... 44,2653	
▲	1 расійскі рубель ... 84,39		
	1 украінская грыўня ... 351,53		

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў віцэ-спікера верхняй палаты парламента А. Рубінава з 70-годдзем

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў намесніка старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Анатоля Рубінава з 70-годдзем.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Канал «Беларусь-ТВ» з 15 красавіка будзе транслявацца ў ЗША

Канал «Беларусь-ТВ» будзе транслявацца ў ЗША ў складзе пакета «RTN Platinum». Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-цэнтры Белтэлерадыёкампаніі.

Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Беларусі падпісала дагавор з Russian Media Group, LLC аб бязвыплатным распаўсюджванні тэлеканала «Беларусь-ТВ». З 15 красавіка гледачы «RTN Platinum» змогуць глядзець беларускія праграмы. «RTN Platinum» — гэта пакет з васьмі рускамоўных тэлевізійных каналаў, якія распаўсюджваюцца кампаніяй Russian Media Group, LLC (Нью-Джэрсі) кругласутачна.

Падпісчыкі «RTN Platinum» ёсць у 1100 гарадах 39 штатаў. Больш за ўсё гледачоў налічваецца ў Нью-Ёрку, Нью-Джэрсі, Лос-Анджэлесе, Чыкага, Сан-Францыска, Філадэльфіі, Бостане.

БЕЛТА.

Белгазпрамбанк: рэйтынг расце

Насуперак фінансаваму крызісу, калі ў свеце адзначаецца пагаршэнне рэйтынгаў шэрагу банкаў, паспяховыя вынікі працы, якія дэманструе ААТ «Белгазпрамбанк», на днях ацэненыя Fitch Ratings: міжнароднае агенцтва пацвердзіла доўгатэрміновы рэйтынг дэфолту эмітэнта («РДЕ») Белгазпрамбанка на ўзроўні «B» са «стабільным» прагнозам і павысіла індывідуальны рэйтынг банка з узроўню «E» да «D/E».

Адначасова агенцтва пацвердзіла астатнія рэйтынгі банка. Спецыялістамі Fitch пры павышэнні індывідуальнага рэйтынга банка браліся ў разлік здольнасці Белгазпрамбанка абсарбіраваць страты, а таксама прагрэс, дасягнуты ў плане зніжэння канцэнтрацыі крэдытнага партфеля, захаванне значнай прыбытковасці, добры ўзровень ліквіднасці і добры стан на сёння якасці актываў згодна са справаздачнасцю. Акрамя таго, індывідуальны рэйтынг банка адлюстроўвае паспяховую гісторыю дзейнасці ў галіне крэдытавання малога і сярэдняга бізнэсу, асаблівую ролю, якую адыгрывае банк у сістэме разлікаў Газпрама, і прымальныя сістэмы кіравання рызыкамі. Рэйтынгі дэфолту эмітэнта Белгазпрамбанка і яго рэйтынг падтрымкі «4» адлюстроўваюць меркаванне Fitch аб верагоднасці атрымання падтрымкі з боку кантралюючых акцыянераў банка — расійскіх ААТ «Газпрам» і афіліраванага з ім ААТ «Газпрамбанк». Міжнароднае агенцтва лічыць высокай здольнасць і гатоўнасць Газпрама аказаць падтрымку Белгазпрамбанку ў выпадку неабходнасці.

Ігар ГРЫШЫН.

Незаконны даход пенсіянеркі — каля 1,2 млрд рублёў

Каля 1,2 млрд рублёў былі атрыманы ад аптовай рэалізацыі садавіны і гародніны: тавар набываўся ў Мінску і іншых гарадах, а прадаваўся гандлёвым структурам у Бабруйску.

Як паведамілі ў прэс-цэнтры Магілёўскага УУС, цяпер гэтую шырокую прадпрымальніцкую дзейнасць праваахоўныя органы называюць незаконнай. Больш за год — са студзеня 2008-га па сёлетні люты — 60-гадовая бабруйчанка, супраць якой цяпер распачата крымінальная справа, разам з 36-гадовым мужчынам, які афіцыйна не працуе, гандлявала без адпаведных дзяржаўных рэгістрацыі і ліцэнзіі. Гэта выкрылі міліцыя і дэпартамент фінансавых расследаванняў КДК.

Алена КАЗЛОВА.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ОБРАЩЕННОГО В ДОХОД РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ:

Лот № 1 – квартира № 25 и квартира № 26 (объединенные в одну квартиру общей площадью 153,5 м кв., жилой площадью 108,1 м кв.), расположенные по адресу: г. Минск, проспект Независимости, д. № 76а в г. Минске. Начальная цена – 505 546 200 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Задаток в размере 50 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Аукцион состоится **04 мая 2009 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **30 апреля 2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефон для справок: (017)227 48 36.

Утерянный филиалом Белгосстраха по г. Минску **бланк строгой отчетности** обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь **серии АЖ № 3624050 считать недействительным.**

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ УСЯЖСКОГО СЕЛЬИСПОЛКОМА

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в *д. Новодворье Смолевичского района:* **Лот № 1:** земельный участок пл. 0,0999 га, кадастровый № 624885605101000071. Начальная цена – 3 500 000 бел. рублей. **Лот № 2:** земельный участок пл. 0,1001 га, кадастровый № 624885605101000070. Начальная цена – 3 500 000 бел. рублей. В непосредственной близости имеются сети электроснабжения, водоснабжения. Задаток 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, – 540 000 бел. руб. по каждому лоту. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **19.05.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 13.05.2009 г. до 17.00 по указанному адресу.

Тел: (8 017) 224 61 36. Сайт в интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

Утерянный представительством № 1 по г. Минску Белгосстраха **страховой полис** по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу **серии БЛ № 0618521 считать недействительным.**

ПРА АМНІСТЫЮ, ЗАРПЛАТУ, РЭГІСТРАЦЫЮ...

Парламенцкі дзённік

Дэпутаты прынялі ў двух чытаннях законапраект аб амністыі

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу прыняла ў двух чытаннях законапраект «Аб амністыі ў сувязі з 65-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

Праект закона быў унесены ў парламент у студзені гэтага года Прэзідэнтам краіны. Нарматыўны акт прадугледжвае правядзенне амністыі ў Беларусі ў 2009 годзе.

Як падкрэсліў выконваючы абавязкі міністра ўнутраных спраў Беларусі Анатоль Куляшоў, у Беларусі прымяняецца прынцып гуманізму адносна асобаў, якія адбываюць пакаранне. Паводле яго слоў, будучая амністыя закране асобаў, якія становяць характарызуюцца ў ходзе адбывання пакарання. Цяпер у Беларусі адбываюць пакаранне 37 тыс. 578 чалавек, з іх 46 працэнтаў — за ўчыненне злачынстваў, накіраваных супраць уласнасці і парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці.

У адпаведнасці з праектам закона традыцыйна будуць вызваленыя ад крымінальнай адказнасці непаўналетнія, цяжарныя жанчыны, пенсіянеры, інваліды, хворыя на актыўную форму туберкулёзу, ВІЧ-інфіцыраваныя, ветэраны баявых дзеянняў, удзельнікі ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый і асобы, якія пацярпелі ад гэтых аварый. У названым пераліку таксама асобы, якія атрымалі раненні пры выкананні абавязкаў у перыяд праходжання службы, якія ўчынілі злачынствы, што не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі (да 2 гадоў пазбаўлення волі) і менш цяжкія злачынствы (да 6 гадоў пазбаўлення волі). Акрамя таго, будуць вызваленыя ад крымінальнай адказнасці жанчыны і адзінокія мужчыны, якія маюць няпоўнагадовых дзяцей.

Згодна з законапраектам іншыя катэгорыі асобаў будуць вызваляцца ад пакарання ў выглядзе арышту, абмежавання волі, накіравання ў дысцыплінарную воінскую часць, пазбаўлення волі пры асуджэнні: за злачынствы, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі; за менш цяжкія злачынствы — пры адбыцці не менш за адну чвэрць тэрміну пакарання; за асобныя цяжкія эканамічныя злачынствы — крадзеж, махлярства, прысваенне або растрату, крадзеж шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі ў буйным і асабліва буйным памеры (за выключэннем асобаў, якія ўчынілі злачынствы ў складзе арганізаванай групы) — пры адбыцці не менш за адну трэць тэрміну пакарання; за іншыя злачынствы — калі да заверашэння тэрміну адбывання пакарання засталося менш за адзін год.

Разам з тым амністыя, праводзімая ў 2009 годзе, не будзе распаўсюджвацца на асобаў, да якіх раней прымяняліся амністыя або памілаванне і якія зноў учынілі наўмыснае злачынства. Не падпадуць пад амністыю асобы, якія не кампенсавалі нанесены злачынствамі ўрон (за выключэннем вышэйназваных ільготных катэгорый грамадзян), а таксама якія злосна парушаюць парадак у час адбывання пакарання, прызнаныя асабліва небяспечнымі рэцыдывістамі, асуджаныя да пажыццёвага зняволення, якія ўчынілі наўмысныя забойствы або згвалтаванне, злачынствы супраць дзяржавы, якія стварылі злачынную арганізацыю або ўдзельнічалі ў ёй, якія ўчынілі карупцыйныя злачынствы.

Анатоль Куляшоў адзначыў, што паводле папярэдніх падлікаў будучая амністыя дасць магчымасць эканоміць амаль Br2 млрд рэспубліканскага бюджэту.

Па праекту закона ад далейшага адбывання пакарання прагназуецца вызваленне з папраўчых устаноў закрытага тыпу 2495 чалавек і з устаноў адкрытага тыпу — 1849. Усяго розным формам амністыі падлягаюць 29 тыс. 594 чалавекі.

Асобы, якія вызваляцца з месцаў пазбаўлення волі ў выніку амністыі, не створаць праблем грамадству.

«Як правіла, людзі, да якіх была прыменена амністыя, даражаць гэтым актам і разумеюць, што наступнага разу не будзе», — адзначыў Анатоль Куляшоў. Ён дадаў, што да 37 працэнтаў зняволеных адбываюць пакаранне ўпершыню.

Хворыя на туберкулёз, якія трапілі пад амністыю, не застануцца без медыцынскага нагляду.

У месцах пазбаўлення волі ўтрымліваюцца амаль 3 тыс. чалавек, якія хворыя на адкрытую форму туберкулёзу. Чакаецца, што па амністыі будуць вызвалены амаль 30 з іх.

Беларускія зняволеныя маюць запазычанасць больш як Br1 трлн.

Выканаўчыя лісты маюць 74 працэнты ўсіх зняволеных.

Напрыклад, пакаранне адбываюць больш як 2 тыс. злосных неплацельшчыкаў аліментаў, якія павінны кампенсаваць амаль Br8 млрд.

У ходзе амністыі ў першую чаргу з месцаў пазбаўлення волі будуць вызваляць асобаў, якія добраахвотна пагасілі свае запазычанасці.

Анатоль Куляшоў таксама адзначыў, што 97 працэнтаў усіх зняволеных працаўладкаваны. Сярэдняя заработная плата складае Br68 тыс., пры гэтым утрыманне аднаго зняволенага каштуе дзяржаве Br336 тыс. у месяц.

Амністыя зняволеных магчыма і ў наступным годзе

Аб гэтым старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Віктар Гумінскі заявіў на прэс-канферэнцыі.

«Я не выключаю, што ў наступным годзе да 65-годдзя Вялікай Перамогі таксама будзе праведзена амністыя», — сказаў Віктар Гумінскі. Пры гэтым ён выказаў думку, што дасягнуць значнага зніжэння колькасці зняволеных за кошт правядзення амністыі наўрад ці ўдасца. На думку дэпутата, для гэтага неабходна ўносіць істотныя змяненні ў заканадаўства і ў сістэму назначэння пакаранняў.

Паводле слоў Віктара Гумінскага, цяпер у Беларусі распрацоўваецца новае крымінальнае заканадаўства, дзе ў корані пераглядаецца падыход да назначэння пакарання. Пры гэтым уважліва будуць вывучаны англа-амерыканская, франка-нямецкая і іншыя крымінальныя сістэмы.

«Відавочна, што людзі, якія ўчынілі злачынствы па неасцярожнасці, ненаўмысныя эканамічныя злачынствы, не павінны знаходзіцца на ўтрыманні ў падаткаплацельшчыка, а павінны пагасіць урон і, можа, дадаткова заплаціць штраф», — сказаў парламентарый.

Ён адзначыў, што з 37 тыс. зняволеных, якія ёсць у Беларусі цяпер, 47 працэнтаў асуджаны за эканамічныя злачынствы.

Асігнаванні на павелічэнне заработнай платы закладзены ва ўдакладненнях да бюджэту-2009

Ва ўдакладненнях да бюджэту Беларусі на 2009 год закладзены асігнаванні на павелічэнне заработнай платы — 5 працэнтаў тарыфнай стаўкі першага разраду. Аб гэтым паведаміў міністр фінансаў Беларусі Андрэй Харкавец, адказваючы на пытанні дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў.

«Але калі раней мы планавалі гэта павышэнне ў маі, то сёння эканамічная сітуацыя паказала, што бюджэт не зможа забяспечыць гэта павышэнне менавіта ў гэтым месяцы. Таму мы будзем прымаць рашэнні аб павелічэнні заработнай платы і пенсій адэкватна існуючым рэсурсам», — сказаў Андрэй Харкавец.

Згодна з падрыхтаваным Міністэрствам фінансаў удакладненнем да бюджэту плануецца рэалізацыя шэрагу мераў па скарачэнні бюджэтных расходаў. «Скарачэнне прадугледжваецца значнае, гэта будуць дастаткова радыкальныя меры ў бюджэтным працэсе».

«Тым не менш першы квартал гэтага года мы завяршылі, збалансаваўшы расходы бюджэту з існуючымі рэсурсамі. Бюджэтная сфера хоць і адчула скарачэнне расходаў, разам з тым былі забяспечаны поўнасцю ўсе мераприемствы, якія планаваліся для рэалізацыі бюджэтнымі арганізацыямі».

Андрэй Харкавец пацвердзіў зацікаўленасць беларускага боку ў атрыманні крэдыту Сусветнага банка ў памеры $1 млрд. Міністэрства фінансаў Беларусі разлічвае правесці ў красавіку перагаворы з Расіяй аб прыцягненні двух крэдытаў — 100 млрд расійскіх рублёў і $2 млрд.

Дэпутаты прынялі да ведама дэкрэт, што спрашчае рэгістрацыю суб'ектаў гаспадарання

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прыняла да ведама Дэкрэт Прэзідэнта «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання».

Прадстаўляючы гэты дэкрэт, міністр юстыцыі Беларусі Віктар Галаванаў растлумачыў, што дакумент уводзіць паўнацэнны заяўны прынцып дзяржаўнай рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання, акрамя банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый.

У адпаведнасці з дэкрэтам, дзяржаўная рэгістрацыя суб'ектаў гаспадарання ажыццяўляецца ў дзень падачы неабходных дакументаў. У якасці прыкладу Віктар Галаванаў прывёў Арменію, дзе для такой рэгістрацыі неабходна 30 дзён, Расію — 5 дзён, Украіну — 3 дні.

Акрамя таго, максімальна скарочаны пералік дакументаў, неабходных для рэгістрацыі. У прыватнасці, для юрыдычнай асобы заяўнік прадастаўляе адпаведную заяву, статут, які цяпер не трэба натарыяльна засведчваць, і дакумент, які пацвярджае аплату дзяржаўнай пошліны. Пры прадастаўленні неабходнага пакета дакументаў адмова ў дзяржаўнай рэгістрацыі не дапускаецца.

БЕЛТА.

Абзац

■ Каля 1,5 тыс.куб.м сточных водаў было скінута на заліўны луг побач з ракой Сож у выніку аварыі на очышчальных збудаванняў каля Слаўгарада. Адбыўся размыў абвалавання палёў фільтрацыі гарадскіх очышчальных збудаванняў у раёне вёскі Курганаўка. Па вынікаў аналізу вады будзе зроблена ацэнка ўрону, нанесенаму навакольнаму асяроддзю. Паморку рыбы пакуль не выяўлена. Вядуцца работы па ліквідацыі наступстваў аварыі. Адной з прычын надзвычайнага здарэння, як лічаць спецыялісты, маглі стаць моцныя дажджы, што прайшлі напярэдадні.

■ **21 жыхар сталічнага рэгіёна аштрафаваны за незаконную нарыхтоўку бярозавіку. Цяпер супрацоўнікі Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслінnага свету праводзяць рэйдавыя праверкі па выяўленні фактаў несанкцыянаванага збору гэтага прыроднага напою. Спецыялісты адзначаюць, што асаблівую занепакоенасць выклікаюць выпадкі варварскай здабычы соку, калі бярозы ўнізе ствала падсякаюцца сякерай, пасля чаго дрэва, як правіла, засыхае. Штраф за парушэнне складае да 20 базавых велічыняў.**

■ Агульная колькасць абанентаў сотавай рухомай электрасувязі на 1 красавіка г.г. дасягнула ў Беларусі 8,5 млн. З пачатку года колькасць абанентаў выраслa на 4,9%. Сотавай электрасувяззю ахоплена 97,3% тэрыторыі краіны.

■ **Міні-цэх па вытворчасці фальсіфікаванага алкаголю знішчаны ў Івацэвічах. Нелегальную вытворчасць наладзілі ў сваёй кватэры два браты, мясцовыя жыхары. Прадукцыю яны рэалізоўвалі ў Брэсцкай вобласці і ў Мінску. Аператыўнікі канфіскавалі ў іх 606 бутэлек фальшывай гарэлкі, 1138 падробленых акцызных марак Украіны, этыкеткі, коркі, а таксама цыгарэты імпартнай вытворчасці таксама без акцызных марак Беларусі. Узбуджана крымінальная справа.**

■ Урад Латвіі вырашыў ліквідаваць адну са спецслужбаў краіны — Службу аналізу інфармацыі (CAI). Такое рашэнне было прынята з мэтай эканоміі дзяржаўных сродкаў. CAI падпарадкоўваецца кіраўніку ўрада, яе супрацоўнікі аналізуюць звесткі, што паступаюць з сіламвых структур, і перадаюць іх Савету па дзяржаўнай бяспецы. Сёлета на фінансаванне Службы было прадугледжана $737 тыс. Сярэдняя зарплата супрацоўніка ведамства складае каля $46,4 тыс. у год. Латвійскім міністэрствам, хутчэй за ўсё, давядзецца скарачаць свае бюджэты не на 20%, як меркавалася, а на 40%.

Поўны абзац

■ **Грошы, якія жанчына схавала ў бюстгальтары, выратавалі ёй жыццё падчас нападу на аўтобус у Бразіліі. Інцыдэнт адбыўся ў горадзе Сальвадоры. Тут рабаванні аўтобусаў праходзяць даволі часта, таму 58-гадовая жанчына, што ехала на дачу, схавала свае 150 рэалаў (каля$69) у бюстгальтары. У перастрэлцы, што адбылася падчас налёту паміж бандытамі і паліцыяй, жанчына была параненая ў грудзі. І хоць потым хірургам усё ж давялося даставаць кулю з грудзей жанчыны, жыццё яе ўдалося выратаваць дзякуючы грошам, якія прынялі на сябе асноўную моц удару. Выратавала тое, што сума складалася з дробных банкнотаў — дапамагло вядомае нам «дробненькае, але многа».**

■ Нацыянальная служба аховы здароўя Вялікабрытаніі будзе плаціць людзям ад 70 да 425 фунтаў стэрлінгаў за пахудзенне. Пілотны праект гэтай праграмы запушчаны ў графстве Кент. На 400 месцаў удзельнікаў прэтэндуюць каля 2 тыс. чалавек. 40 медсясцёр, якія таксама маюць лішнюю вагу, будуць удзельнічаць у праграме разам з пацыентамі. Для атрымання ўзнагароджання чалавеку давядзецца прайсці 13-месячную праграму пахудзення. За пахудзенне на 7 кг удзельнік праграмы атрымае 70 фунтаў, на 13,5 кг — 125 фунтаў, а тым, хто пазбавіўся больш чым 22 кг, заплацяць 425 фунтаў стэрлінгаў. Штогод нацыянальная служба аховы здароўя траціць больш за мільярд фунтаў на барацьбу з атлусненнем.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Ліга чэмпіёнаў: без сенсацый, але нервова

Без абароны вырашылі пагуляць у Лондане ў другім матчы 1/4 фіналу Лігі чэмпіёнаў «Чэлсі» і «Ліверпуль». Абодва галкіперы дапускалі памылкі, а палявыя гульцы паказалі зайздросную выніковасць. Матч закончыўся з лікам 4:4, прычым госці былі блізкія да сенсацыі — выхаду ў паўфінал. У другой сустрэчы таксама адбылася нічыя — 1:1. Мюнхенская «Баварыя» на гэты момант «Барселоне» не супернік.

Твае правы

ДЗЕНЬ ПА КАНТРАКЦЕ — ПРЫ ЛЮБЫМ РАСКЛАДЗЕ

Крама працуе з 9 да 19 гадзін у зімовы і з 9 да 20 гадзін — у летні сезон. Да таго ж — без абеду. Аднак адметна: апошнім часам у сувязі са змяншэннем тавараабароту тут ніхто не можа выканаць нормы выручкі. І, адпаведна, усе гандляры аформленыя ўсяго на 0,7 стаўкі... Зразумела, спасылкі на выпрацаўку заўсёды слушныя. Але не менш відавочнае ў гэтым выпадку і іншае — парушэнне заканадаўства. Паколькі гандляры маюць па 0,7 стаўкі, яны павінны працаваць не па 10-11, а толькі па 5-6 гадзін у дзень.

Тым часам, як аднавіць працоўную кніжку, ці абавязковы «лішні» дзень водпуску па кантракце і якім чынам плацяць зарплату на прадпрыемствах, што апынуліся ў стане банкруцтва? Гаворка аб усім гэтым ішла падчас чарговай «выязной прыёмнай» Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, што была наладжана для жыхароў Петрыкаўскага, Лельчыцкага і Жыткавіцкага раёнаў Гомельшчыны.

Не даў падпісаць, значыць, не звольніў

З-за паломкі аўтобуса работнік спазніўся на сваё працоўнае месца больш чым на 3 гадзіны. Гэта палічылі за прагул, вынікам стала звальненне. Па вялікім рахунку, нічога незвычайнага тут няма: калі наймальнік палічыў прычыну няўважлівай, то развітацца з работнікам ён мае поўнае права. Аднак пытанні тут усё ж узніклі. Ці павінны былі ўзяць з работніка тлумачальную і ці павінны былі познаёміць таго ж работніка з загадам аб звальненні?

— Адсутнасць тлумачальнай, а таксама неазнаямленне работніка «пад роспіс» з загадам аб звальненні на працягу 5 дзён пасля яго выдання з'яўляецца парушэннямі, — кажа **намеснік дырэктара Дэпартамента дзяржінспекцыі працы Ірына ШЫЛЯЕВА.** — Таму ў гэтай сітуацыі ў работніка ўзнікаюць падставы звярнуцца ў суд. І, да слова, калі суд прызнае звальненне незаконным, з даты аднаўлення на ранейшым месцы работніку павінны выплачваць сярэдні заробак як за вымушаны прагул.

Недаплаціў? Праіндэксуй

У апошні дзень работы «на рукі» выдаецца працоўная кніжка і праводзіцца канчатковы разлік. Прычым у выпадку затрымкі разліку работніку павінна працягвацца налічэнне яго сярэдняга заробку за кожны дзень «адтэрміноўкі». Усё гэта нібыта зразумела. Аднак цікавая сітуацыя: «асноўную» зарплату работніку пры звальненні аддалі. А вось падвоеную аплату за працу па выхадных — не.

— У такім разе варыянт адзін, — распавядае Ірына Шыляева. — Недаплачаныя сумы павінны вярнуць, і да таго ж гэту суму неабходна праіндэксаваць з улікам інфляцыі.

Заяўка мусіць быць канкрэтнай

Выпускніку навучальнай установы даюць размеркаванне на пасаду галоўнага інжынера ў сельгаспрадпрыемстве. Але пасля прыезду туды высвятляецца: галоўны інжынер у гаспадарцы ёсць. Таму маладому спецыялісту прапануюць месца інжынера-механіка... з удвая меншай зарплатай.

— Калі малады спецыяліст з прапановай не згодны, то тэма не яго праблемы, — падкрэслівае Ірына Шыляева. — Гаспадарка давала канкрэтную заяўку, і яна павінна яе задаволіць. А калі зрабіць гэта сельгаспрадпрыемства па тых ці іншых прычынах не можа, то малады спецыяліст мае поўнае права звярнуцца ў сваю навучальную ўстанову — з тым, каб яго або пераразмеркавалі, або выдалі «свабодны дыплом».

Без подпісаў контракты несапраўдныя

Ёсць верагоднасць, што з работнікам не працягнуць кантракт і, калі рабіць гэта наймальнік насамрэч не пажадае, то ніякім чынам паўплываць на яго рашэнне ніхто не зможа. Прынамсі, законных падстаў на тое няма. Аднак сітуацыя атрымліваецца ўсё ж не такая адназначная. Сутнасць у тым, што цяперашні кантракт быў складзены толькі ў адным экзэмпляры і да таго ж пад кантрактам работнік... свой подпіс не ставіў.

— Калі пад цяперашнім кантрактам работнік свой подпіс не ставіў, то лічыцца, што працоўныя адносіны працягваліся на няпэўны тэрмін, — адзначае Ірына Шыляева. — Адпаведна, зараз звольніць работніка ў сувязі з заканчэннем тэрміну кантракта ўжо нельга. Бо работнік адновіцца на сваім месцы праз суд, а наймальнік павінен будзе выплаціць заробак за ўвесь час вымушанага прагула.

Тым часам таксама пікантны момант — прапанова падпісаць кантракт, у якім... нічога няма. Падпісаць проста чысты аркуш паперы.

— Кантракт — гэта пагадненне двух бакоў, якое павінна быць аформлена дакументальна, — заўважае Ірына Шыляева. — Таму, калі прапануюць падпісаць чысты аркуш, рабіць гэтага ні ў якім разе нельга. У адваротным выпадку ёсць рызыка загнаць самога сябе ў пастку.

Страту кампенсуе дублікат

Будаўнік пэўны час працаваў у Расіі. Сітуацыя нібыта звычайная, калі б не адна акалічнасць — у суседняй краіне згубілася працоўная кніжка. Што рабіць зараз?

— Праблема вырашаецца проста, — распавядае Ірына Шыляева. — Пры працаўладкаванні ў Беларусі на новым месцы наймальнік завядзе дублікат працоўнай кніжкі. Прычым у гэты дублікат будуць занесеныя ўсе звесткі аб ранейшых месцах працы, якія пацвярджаюцца дакументальна.

Не замест, а разам

Пасля пераводу на кантракты супрацоўнікам арганізацыі вызначылі даволі някепскую дадатковую меру стымулявання — павышэнне тарыфнай стаўкі адразу на 30 %. Аднак пры гэтым адпачынак застаўся ранейшым. Ці правільна гэта?

— Паводле Дэкрэта ад 29 ліпеня 1999 года пры пераводзе на кантракт работнікам вызначаюцца наступныя меры стымулявання — павелічэнне тарыфнай стаўкі ці акладу да 50 % і выдзяленне да 5 дадатковых дзён водпуску, — нагадвае Ірына Шыляева. — Прычым абедзве гэтыя нормы павінны не замяняць адна адну, а ўводзіцца адначасова. Таму прадставіць як мінімум 1 дадатковы дзень адпачынку наймальнік абавязаны. А ў выпадку адмовы тут можа нават адбыцца прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці — штрафу ад 4 да 20 базавых велічынь.

Першая ўмова — згода

Просьба выйсці на працу ў выхадны — з'ява нярэдкая. Аднак ці не самае галоўнае пытанне ў гэтым выпадку — якія ўмовы падобнага выхаду?

— Наймальнік павінен выдаць спецыяльны загад, а работніку неабходна азнаёміцца з гэтым загадам пад роспіс, — падкрэслівае Ірына Шыляева. — Прычым трэба мець на ўвазе: за выключэннем патрэбы ў ліквідацыі наступстваў аварый, стыхійных бедстваў, эпідэмій і іншых форс-мажорных выпадкаў, выхад у выхадныя магчымы толькі са згоды работніка. Да таго ж, падобны выхад або аплачваецца ў двайным памеры, або кампенсуецца выдзяленнем іншага дня адпачынку.

Прадаць маёмасць. А пасля зарплата

Рынак — рэч зменлівая. І калі адны могуць знаходзіцца на ўздыме, то іншыя — у крытычным стане. Статыстыка сведчыць, што ў пачатку года ў Беларусі ў працэдуры банкруцтва знаходзілася 91 арганізацыя. Прычым 3 такія арганізацыі размешчаныя на тэрыторыі не самага вялікага па памерах Петрыкаўскага раёна.

Для пачатку працэдуры банкруцтва дастаткова трох адначасовых умоў: наяўнасці дакладных дакументальных звестак аб неплацежздольнасці арганізацыі, невыкананя арганізацыяй прымусовых патрабаванняў на працягу 3 месяцаў, а таксама запазычанасці перад крэдыторамі ў памеры больш за 100 ці, у дачыненні да горадаўтваральных прадпрыемстваў, — больш за 2500 базавых велічынь. Словам, патрапіць у непрыемную сітуацыю не так і складана. Якімі бываюць наступствы ў сацыяльным плане?

— Паводле заканадаўства, пасля прыняцця рашэння аб пачатку працэдуры банкруцтва ў арганізацыю прызначаецца антыкрызісны кіраўнік, — кажа **начальнік Гомельскага абласнога тэрытарыяльнага аддзела па санацыі і банкруцтве Міністэрства эканомікі Аляксандр ГАРБУН.** — Кіраўнік прымае ад крэдытораў патрабаванні і спрабуе ўрэгуляваць пытанні даўгоў у парадку пэўнай чаргі.

Чарга фарміруецца наступным чынам. Пасля пачатку працэдуры банкруцтва сродкі арганізацыі перш-наперш ідуць на судовыя, камунальныя і іншыя бягучыя выдаткі. Па-другое — на выплаты работнікам, якія атрымалі вытворчыя траўмы (зарплата работнікам, што застаюцца ў арганізацыі, знаходзіцца ў чарзе далей), па-трэцяе — на плацяжы ў бюджэт, па-чацвёртае — на кампенсацыі крэдыторам, звязаныя з закладам маёмасці, і г.д.

Разам з тым чарговасць плацяжоў, якія ўзнікаюць ужо непасрэдна падчас працэдуры банкруцтва, выглядае крыху інакш — на першых месцах тут выплаты работнікам, якія атрымалі вытворчыя траўмы, выхадныя дапамогі і зарплаты, а таксама плацяжы ў бюджэт.

— Працэдуру санацыі праблемнай арганізацыі заканадаўства вызначае тэрмінам да 18, а працэдуру ліквідацыі — да 30 месяцаў, і гэты час магчыма працягваць, — заўважае Аляксандр Гарбун. — Адпаведна, выплаты зарплаты работнікам тут таксама могуць зацягнуцца. Часцяком адзіная крыніца пагашэння даўгоў — рэалізацыя вытворчага абсталявання і маёмасці. Інакш кажучы, ліквідацыя запазычанасці па зарплаце робіцца па меры іх продажу, аднак у выпадку затрымак уключаецца механізм індэксацыі.

Правілы звальнення з арганізацый-банкрутаў з'яўляюцца агульнымі. У выпадку ліквідацыі работніку робіцца паведамленне не пазней чым за два месяцы або, як варыянт, тэрмін паведамлення замяняецца 2-месячнай сярэдняй зарплатай. Пасля ж уласна звальнення робіцца выплата выхадной дапамогі — 3 сярэднямесячныя заробкі.

Сяргей ГРЫБ.

Петрыкаўскі раён.

Да лета дачная нерухомасць вакол Мінска можа патаннець на 20—30 працэнтаў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Увогуле, як паведамілі рэдакцыі ў агенцтве нерухомасці «Твая сталіца», стандартныя жылыя дачы на 6—9 сотках у садаводчых таварыствах, бліжэйшых за 25 кіламетраў ад Мінска, каштуюць не менш за 19—20 тысяч долараў.

Масавы продаж дач пачнецца ў маі

Вядома, што цэны «абвальваюцца» ў тым выпадку, калі прапанова ў некалькі разоў перавышае попыт. Сёння на рынку загараднай нерухомасці яшчэ не вельмі шмат прапаноў менавіта па стандартных садаводчых доміках. Цяпер у продажы знаходзіцца толькі каля 20 дач па кожным са стратэгічных напрамкаў з Мінска. Менавіта ў другой палове красавіка і ў маі гаспадары садовых домікаў пачнуць актыўна наведваць дачы і канчаткова вырашаць іх далейшы лёс. Многія садовыя таварыствы знаходзяцца на пэўнай адлегласці ад лініі электрычак і аўтобусных маршрутаў. Тут трэба заўважыць, што сусветны фінансавы крызіс і цяжкасці з атрыманнем крэдытаў не дазволіў пэўнай частцы садаводаў набыць уласныя аўтамабілі. Спецыялісты ўпэўненыя, што і гэты фактар у тым ліку прымусіць гаспадароў загараднай нерухомасці больш актыўна прадаваць свае садовыя домікі. Эксперты рынку дачнай нерухомасці адзначаюць, што з пачатку года сярэдні кошт недарагіх садовых домікаў знізіўся прыкладна на 7—15 працэнтаў. Разам з тым сёння на рынку загараднай нерухомасці прысутнічаюць яшчэ дачы па кошце да 30—35 тысяч долараў. Менавіта такія пабудовы будуць істотна таннець у першую чаргу. Цяпер пры рэальных здзелках гаспадары садовых домікаў згаджаюцца на зніжэнне кошту сваёй нерухомасці ў памеры 2—5

РАЗМЕРКАВАННЕ: ЯК ЗАХАВАЦЬ І СВАЕ, І ДЗЯРЖАЎНЫЯ ІНТАРЭСЫ?

На ўсе пытанні, якія датычацца парадку размеркавання і ўладкавання на першым працоўным месцы, адказваюць старшыня прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА і галоўны прававы інспектар працы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК.

(Працяг. Пачатак у нумары за 15 красавіка.)

☎ Я з'яўляюся маладым спецыялістам, які працуе па размеркаванні ў школе з верасня 2007 года. Адпаведна, і дагавор паміж мной і наймальнікам быў заключаны з верасня 2007 года. Аднак даплату мне выплацілі толькі за студзень і люты 2009 года. Чаму?

Ці павінны выплачваць педагогу, які атрымлівaў адукацыю на платнай аснове, 77 тысяч, якія належаць да выплаты маладым спецыялістам?

У адпаведнасці з пунктам 1 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 26.01.2009 года № 86 «Аб некаторых пытаннях аплаты працы работнікаў устаноў адукацыі», у агульнаадукацыйных установах, спецыяльных установах адукацыі, установах, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, установе адукацыі «Рэспубліканскі цэнтр рэабілітацыі дзяцей дашкольнага ўзросту з парушэннямі слыху», якія фінансуюцца з бюджэту і карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі, вызначаны штомесячныя даплаты маладым спецыялістам з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй з кола педагагічных работнікаў, якія навучаліся, так бы мовіць, на «бюджэце», а таксама спецыялістам з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй з кола педагагічных работнікаў, якія атрымлівалі адукацыю на платнай аснове і былі накіраваныя на працу па размеркаванні, на працягу двух гадоў з дня заключэння з імі працоўнага дагавора (кантракта) у памеры адной тарыфнай стаўкі першага разраду, устаноўленай Саветам Міністраў для аплаты працы работнікаў дзяржаўных арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту і карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі. Гэтыя даплаты выплачваюцца па асноўным месцы працы маладога спецыяліста і спецыяліста, які атрымліваў адукацыю на ўмовах аплаты, прапарцыянальна адпрацаванаму часу, аб'ёму выкананых работ, але іх памер не можа перавышаць адну тарыфную стаўку першага разраду.

Выходзячы з таго, што вышэйзгаданая пастанова Савета Міністраў уступіла ў сілу з 1 студзеня 2009 года, усе вызначаныя гэтым дакументам выплаты ажыццяўляюцца з той жа даты. Нормаў аб выплаце маладым спецыялістам даплат за перыяд да 1 студзеня 2009 года названая пастанова не ўтрымлівае.

Педагогу, які атрымліваў адукацыю на ўмовах аплаты, вышэйзгаданая даплата прызначаецца толькі ў тым выпадку, калі ў перыяд з 1 студзеня 2009 года ён працуе ва ўстанове адукацыі па размеркаванні па падставе накіравання ўстановы адукацыі, якая выдала яму дыплом аб атрыманні адукацыі.

Трэба дадаць, што выпускнікі, якія атрымлівалі адукацыю на ўмовах аплаты, па іх жаданні могуць накіроўвацца на працу на месцы, што засталіся пасля размеркавання выпускнікоў, якія навучаліся на бюджэтных месцах. Такая магчымасць прадугледжваецца пунктам 4 Палажэння аб размеркаванні.

☎ Сын закончыў БНТУ год таму і прыступіў па размеркаванні да работы ў таварыстве з абмежаванай адказнасцю. Працаваў на поўную стаўку інжынерам-тэхнолагам. Але калі восенню падымалася тарыфная стаўка першага разраду, кіраўніцтва ТАА, каб не павялічваць сыну зарплату, прымусіла яго напісаць заяву аб пераходзе па ўласным жаданні на 0,7 стаўкі. Кола абавязкаў і аб'ём работы пры гэтым у яго не змяніліся, малады чалавек працуе 8 гадзін у дзень, хоць у табелі яму залічваюцца 5,6 гадзіны. Хлопец напісаў нядаўна заяву аб пераводзе яго на поўную стаўку, але кіраўніцтва адмаўляецца задаволіць яго просьбу. Нават пагражаюць звольніць за неадпаведнасць займаемай пасадзе. Ці можа ў такой сітуацыі малады чалавек перараз-меркавацца ў іншую арганізацыю і якія дакументы яму трэба сабраць?

У адпаведнасці з артыкулам 118 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, няпоўны працоўны дзень ці няпоўны працоўны тыдзень могуць устанаўлівацца па пагадненні паміж работнікам і наймальнікам як пры прыёме на працу, так і пазней.

Пры няпоўным працоўным дні павінна змяншацца норма працягласці штодзённай работы, вызначаная правіламі ўнутранага распарадку ці графікам работы ў наймальніка. Пры няпоўным працоўным тыдні скарачаецца колькасць рабочых дзён у тыдзень. Няпоўны працоўны час можа таксама заключацца ў адначасовым змяншэнні нормаў працягласці штодзённай работы і колькасці працоўных дзён у тыдзень. Пагадненне аб няпоўным працоўным часе можа быць заключана на пэўны ці няпэўны тэрмін. І паколькі размова ідзе пра пагадненне, то і пры вырашэнні пытання аб пераводзе на поўную стаўку павінна быць згода абодвух бакоў.

Пунктам 36 Палажэння аб размеркаванні выпускнікоў устаноў адукацыі, зацверджаным пастановай Савета Міністраў РБ 10.12.2007 года № 1702, вызначана, што звальненне маладых спецыялістаў магчымае толькі ў наступных выпадках: пераходу іх на выбарную пасаду (пункт 4 артыкула 35 Працоўнага кодэкса РБ); прыняцця ўстановай адукацыі рашэння аб перараз-меркаванні маладога спецыяліста або выдачы яму даведкі аб самастойным працаўладкаванні; залічэння ва ўстанову адукацыі на дзённую форму атрымання адукацыі больш высокага ўзроўню (ступені); парушэння наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага ці працоўнага дагавора (артыкул 41 Працоўнага кодэкса); звальнення па ініцыятыве наймальніка на падставах, прадугледжаных у пунктах 1,2 4-9 артыкула 42, а таксама па абставінах, якія не залежаць ад волі бакоў, прадугледжаных у пунктах 1-3, 5, 6 артыкула 44 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Але звольніць маладога спецыяліста па пункце 3 артыкула 42 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь — неадпаведнасць работніка займаемай пасадзе ці выконваемай рабоце па прычыне недастатковай кваліфікацыі, якая перашкаджае працягваць гэтую работу — не могуць.

У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, у той сітуацыі, якая склалася на гэты момант у маладога спецыяліста на працы, дадатковых падстаў для яго перараз-меркавання няма. Тым не менш, у адпаведнасці з пунктам 22 Палажэння аб размеркаванні, установа адукацыі, якая выдала накіраванне на працу, на працягу двух гадоў пасля атрымання маладым спецыялістам вышэйшай адукацыі мае права вырашаць пытанні яго перараз-меркавання ў выпадку пераводу гэтага маладога спецыяліста з яго згоды ад аднаго наймальніка да іншага (пункт 4 артыкула 35 Працоўнага кодэкса) па ўзгадненні паміж імі ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю (прафесіяй) і прысвоенай кваліфікацыяй.

☎ Галіна Сцяпанаўна Марзан. Іванаўскі раён. Сын і нявестка закончылі ў мінулым годзе Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт па будаўнічай спецыяльнасці. Былі размеркаваныя ў Брэст, у дзяржаўныя будаўнічыя арганізацыі. Інтэрната ім пакуль не даюць, хоць у арганізацыях, дзе яны працуюць, ёсць свае інтэрнаты. Адпаведна рэгістрацыі ў Брэсце ў іх няма, і стаць на чаргу на будаўніцтва жылля яны не могуць, вымушаны знімаць і аплачваць кватэру. У сувязі з гэтым пытанне: як павінны вырашацца жыллёвыя праблемы маладых спецыялістаў? Ці абавязаны наймальнік, які накіроўвае заяўкі на маладых спецыялістаў, клапаціцца пра іх рэгістрацыю?

У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, наймальнік не абавязаны забяспечваць маладых спецыялістаў жылымі памяшканнямі. У адпаведнасці з пунктам 28 Палажэння аб размеркаванні выпускнікоў установ адукацыі, маладым спецыялістам, якія прыбылі на працу па размеркаванні, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, а таксама арганізацыі пры недастатковасці ўласнага жыллёвага фонду могуць выдзяляць сродкі з мэтай кампенсацыі выдаткаў на найм жылых памяшканняў у грамадзян.

Умова аб выдзяленні маладым спецыялістам жылога памяшкання наймальнікам можа быць агавораана ў накіраванні на працу, працоўным дагаворы (кантракце), калектыўным дагаворы. Што тычыцца рэгістрацыі па месцы жыхарства, то маладыя спецыялісты павінны вырашаць такія пытанні самастойна, калі папярэдне яны не дамовіліся аб гэтым з наймальнікам. У выпадку неабходнасці, малады спецыяліст можа звярнуцца да наймальніка з просьбай пасадзейнічаць яму ў вырашэнні пытання з рэгістрацыяй. Калі малады спецыяліст з'яўляецца членам прафсаюза, можна таксама параіць яму звярнуцца для вырашэння яго праблем у адпаведную пярвічную прафсаюзную арганізацыю.

Надзея НІКАЛАЕВА.

(Працяг будзе.)

АБ ІЛЬГОЦЕ ЛІКВІДАТАРУ

У газеце «Звязда» быў надрукаваны Закон аб абароне насельніцтва, якое пацярпела ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. У мяне да 20 красавіка гэтага года ўстаноўлена не група, а працэнты да пенсіі, я ліквідатар. Працэнты я ўжо не атрымліваю. Пайшоў у райсабес пацікавіцца, калі іх зноў стануць плаціць, а мне сказалі, што яшчэ няма рашэння. Вы ўжо надрукавалі Закон, падкажыце, калі ён увойдзе ў сілу.

І.С., *Гомельская вобласць*

Вы ўзнімаеце пытанне кампенсацыі шкоды здароўю, якая была прычынена ў выніку захворвання або калецтва, што ўзнікла ў сувязі з выкананнем работ па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і прывяло да стойкай страты працаздольнасці (без устанаўлення інваліднасці).

Законам Рэспублікі Беларусь ад 22.02.1991 г. «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» была прадугледжана выплата такой кампенсацыі пунктам 15 часткі першай артыкула 19 для асобаў, якія прымалі ў 1986 — 1987 гадах удзел у работах па ліквідацыі наступстваў катастрофы ў межах зоны эвакуацыі (адчужэння) або былі занятыя ў гэты перыяд на эксплуатацыі ці іншых работах на Чарнобыльскай АЭС (у тым ліку накіраваных або камандзіраваных), з уключэннем вайскоўцаў і ваеннаабавязаных, што былі прызваныя на спецыяльныя зборы і прыцягнутыя да выканання работ, звязаных з ліквідацыяй наступстваў гэтай катастрофы.

Гэты пункт страціў сілу 17.12.2007 г. у адпаведнасці з артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 14.06.2007 г. № 239-З «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян».

Да цяперашняга часу гэта выплата не ўзноўлена.

Новы Закон Рэспублікі Беларусь ад 6.01.2009 г. № 9-З «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, іншых радыяцыйных аварый» надрукаваны ў газеце «Звязда» ад 15 студзеня 2009 года № 6. Згодна з артыкулам 44 гэтага Закона, ён уступае ў сілу праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Аднак новым Законам выплата вышэйназванай кампенсацыі, якую вы атрымлівалі, таксама не прадугледжана.

Кватэрнае пытанне

Ветэрану, адзінокаму, непрацуючаму інваліду адмовіць не маглі

У мінулым годзе майму бацьку — пенсіянеру, які знаходзіцца на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, адмовілі ў выдзяленні жылога памяшкання сацыяльнага карыстання.

Прашу патлумачыць, хто мае права на атрыманне такога жылля?

Г. Палюховіч, *Брэсцкая вобл.*

У лісце, на жаль, не пазначаны матывы адмовы. Магчыма, не падышла чарга... Але, хутчэй за ўсё, у бацькі не было падстаў для атрымання жылога памяшкання сацыяльнага прызначэння.

У адпаведнасці з Палажэннем аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадастаўленне жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565) права на атрыманне ў вызначаным парадку жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання маюць як асобныя катэгорыі грамадзян незалежна ад даходу ў іх сем'ях і маёмаснага становішча (напрыклад, ветэраны і інваліды Вялікай Айчыннай вайны, дзеці-сіроты, непрацуючыя адзінокія інваліды I і II групы, пенсіянеры і некаторыя іншыя), так і катэгорыі грамадзян, у якіх сярэднямесячны сукупны даход на кожнага члена сям'і не перавышае зацверджанага бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, вылічанага за 12 месяцаў, якія папярэднічалі месяцу пастаноўкі на ўлік (і на дзень прадастаўлення жылога памяшкання сацыяльнага карыстання), і якія валодаюць заяўленай маёмасцю, агульны кошт якой не перавышае памеру кошту кватэры тыповых спажывецкіх якасцяў зыходзячы з максімальнай нормы прадастаўлення агульнай плошчы жылога памяшкання сацыяльнага карыстання на аднаго члена сям'і (20 кв. метраў). Да апошніх таксама адносяцца інваліды I і II групы, пенсіянеры, асобы, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту (жанчыны — 55 гадоў, мужчыны — 60 гадоў).

Такім чынам, калі названы даход будзе перавышаць адпаведную велічыню бюджэту пражыткавага мінімуму (пастановай Савета Міністраў ад 27 студзеня 2009 г. № 96 БПМ вызначаны ў памеры 234 370 рублёў на перыяд з 01.02.2009 па 30.04.2009), то грамадзянін не можа прэтэндаваць на атрыманне жылога памяшкання сацыяльнага карыстання.

Права на атрыманне ў вызначаным парадку жылога памяшкання сацыяльнага карыстання незалежна ад даходу маюць непрацуючыя адзінокія інваліды I і II групы і пенсіянеры. Пад непрацуючымі адзінокімі разумеюцца грамадзяне, якія не ажыццяўляюць працоўнай дзейнасці і не маюць працаздольных членаў сем'яў, якія абавязаны па законе іх утрымліваць, і пражываюць сумесна або ў адным населеным пункце.

Пераразлік зробяць, калі...

Наш дом будуецца па долевым удзеле. Асноўныя будаўніча-мантажныя работы ўжо завершаныя, і бачна, што ў некаторых кватэрах агульная плошча адрозніваецца (розніца — да 1 кв. метра і больш) ад праектнай. Ці павінны па гэтых кватэрах дольшчыкам зрабіць пераразлік кошту будаўніцтва?

В. Мамонаў, *г. Мінск.*

На практыцы, да ўступлення ў сілу Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2006 г. № 396 «Аб долевым будаўніцтве шматкватэрных жылых дамоў», у выпадку адхілення фактычнай агульнай плошчы кватэр ад праектнай у дамах, пабудаваных з долевым удзелам грамадзян, пераразлік кошту кватэры не ажыццяўляўся. Гэта не прадугледжвалася і Тыпавым дагаворам аб долевым будаўніцтве жылля, які быў зацверджаны загадам Мінскбудархітэктуры ад 24 мая 1999 г. № 136.

З уступленнем у сілу з 1 ліпеня 2006 г. Указа № 396 становішча змянілася. У зацверджанай гэтым Указам (з улікам змяненняў і дапаўненняў, унесеных Указам ад 31 студзеня 2009 г. № 55) форме прыкладнага дагавора стварэння аб'екта долевага будаўніцтва прадугледжана (падпункт 6.4.4), што забудоўшчык абавязаны прад'явіць дольшчыку абгрунтаваны разлік-даведку кошту аб'екта долевага будаўніцтва на працягу месяца з дня зацвярджэння камісіяй акта аб прыёмцы дома ў эксплуатацыю. Пры гэтым, калі фактычная плошча аб'екта долевага будаўніцтва будзе меншай (большай) за агавораную ў дагаворы, забудоўшчык ажыццяўляе пераразлік кошту аб'екта долевага будаўніцтва.

Неабходна таксама мець на ўвазе, што дзеянне Указа № 396 не распаўсюджваецца на дагаворы аб долевым будаўніцтве, заключаныя да 1 ліпеня 2006 г., а таксама на аб'екты долевага будаўніцтва, у дачыненні да якіх дазвол на правядзенне будаўніча-мантажных работ дадзены ў вызначаным парадку да пазначанага тэрміну. Дагаворы на будаўніцтва такіх аб'ектаў, а таксама дагаворы аб долевым будаўніцтве, заключаныя да 1 ліпеня 2006 г., дзейнічаюць на працягу вызначанага ў іх тэрміну і не падлягаюць прывядзенню ў адпаведнасці з патрабаваннямі Указа № 396.

Віктар САВІЦКІ.

Пытальнік

ІЛЬГОТЫ ДЛЯ ІНВАЛІДА, ЯКОГА НЕ ІСНУЕ?

У мяне да вас вялікая просьба. Я інвалід II групы (звязана з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС). Пражываю адзін, але па неабходнасці прапісаў да сябе працаздольнага ўнука. Якімі льготамі ў гэтай сітуацыі я магу карыстацца?

Н.В. Сіроцін, *г. Маладзечна.*

Падавалася б, звычайнае пытанне — адно са шматлікіх, якія штодня атрымлівае рэдакцыя. Аднак даць на яго належны адказ, як прасіў заяўнік, і як мы самі ўвесь час імкнёмся, не атрымалася, хоць часу на гэты ліст было затрачана дастаткова шмат і некалькімі супрацоўнікамі газеты, і работнікамі ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Маладзечанскага райвыканкама. Не, вядома ж, па нашай просьбе спецыялісты з Маладзечна даслалі нам пералік дзяржаўных сацыяльных ільгот, правоў і гарантый для грамадзян — інвалідаў II групы, што пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Вялікага сэнсу друкаваць яго мы не бачым, тым больш, што заяўнік (яго ліст мы прывялі ў скарочаным варыянце) добра падкаваны ў гэтым сэнсе. Справа некалькі ў іншым. Пасля праверкі выкладзеных фактаў нам паведамілі, што па названым адрасе ў Маладзечне знаходзіцца... дзяржаўная ўстанова. Праверка ў такой сітуацыі — цалкам лагічнае і неабходнае мерапрыемства. Пагадзіцеся, даць адказ на нейкае пытанне абстрактна і зыходзячы з канкрэтных жыццёвых умоў пэўнага чалавека — гэта, як кажуць, дзве вялікія розніцы. Калі заяўнік сапраўды мае патрэбу ў дапамозе, менавіта падчас такіх праверак высвятляюцца ўсе патрэбныя для яе аказання акалічнасці: уласна жыллёвыя ўмовы, памер даходаў, у чым найперш мае патрэбу чалавек і інш.

З Маладзечна нам паведамілі, што «прадаставіць больш канкрэтную інфармацыю пра сям'ю не ўяўляецца магчымым, паколькі грамадзянін Сіроцін Н.В. па названым у лісце адрасе не пражывае і на ўліку ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Маладзечанскага райвыканкама як атрымальнік пенсіі не стаіць».

P.S. Аналагічны — адразу ананімны — зварот нядаўна паступіў у рэдакцыю і з адной са сталічных фірмаў: не плацяць зарплату. З усіх «рэквізітаў» заяўнікаў — толькі агульны электронны адрас офіса і некалькі разоў прадубляваны тэлефон дырэктара фірмы, па якіх нам настойліва раяць звяртацца...

Факт

ТАЛОН ДА СТАМАТОЛАГА — ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

У Мінску з 13 красавіка гэтага года ўкаранёна паслуга заказу талонаў на прыём да доктара ў стаматалагічных паліклініках праз інтэрнэт. Пра гэта паведамілі ў Мінгарвыканкаме.

Падабраць паліклініку, патрэбнага спецыяліста і заказаць талон можна на стаматалагічным партале Мінска (http://smile-city.by). Жыхары сталіцы могуць выбраць талоны да стаматолагаў-тэрапеўтаў і хірургаў на платнай і бясплатнай аснове. Пры выбары платных паслуг месца жыхарства (рэгістрацыі) не мае значэння.

Нагадаем, што паслугу заказу талонаў на прыём да доктара праз інтэрнэт упершыню апрабавала 13-я мінская паліклініка яшчэ ў пачатку 2006 года, калі яе пацыенты атрымалі магчымасць самастойна выбіраць зручны для наведвання час і патрэбнага доктара. Па такой схеме сёння працуе большасць паліклінік Мінска.

Паводле ацэнкі саміх медыкаў, такая форма заказу талонаў вельмі зручная, і яна атрымала станоўчыя водгукі медрэгістратараў. Да таго ж не патрабуецца вядзення журнала ўліку талонаў і папярэдняга запісу, што, адпаведна, эканоміць час. У гэтай сувязі і было прынята рашэнне Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама аб распаўсюджванні такой паслугі на ўсе паліклінікі Мінска.

Аксана ШЫКУЦЬ, *БЕЛТА.*

«ШТО Ў ВАС ДОБРАГА?»

Святлана НАБЕЖКА, палатная медсястра Гарадзішчанскай бальніцы Баранавіцкага раёна:

— Дзеці, муж добры, які не п'е, не курыць, вядзе здаровы лад жыцця, зарабляе для сям'і адносна прыстойныя грошы. Хоць шчасце, як кажуць, не ў грашах, вельмі дрэнна, калі жывеш ад зарплаты да зарплаты. Таму добра, што жывём не горш за іншых: ёсць дом, агарод. Вельмі радуюць дочкі. Малодшая Галіна вучыцца ў 5-м класе, летась заняла першае месца ў рэспубліканскім конкурсе «Буслік», другое месца па раёне — па матэматыцы. Добра вучыцца ў 8-м класе і старэйшая Кацярына. Як кажуць настаўнікі, (цьфу-цьфу-цьфу, каб не сурочыць) у школе няма больш такіх вучаніц. Яшчэ ў мяне сяброўка добрая ёсць, яна для мяне як сястра. Заўсёды падтрымае словам і справай, разумеем мы адна адну не тое каб з паўслова, а з паўпозірку.

Іван КАЗАК, намеснік старшыні Ельскага райвыканкама:

— Хм... Цікавы, філасофскі падыход... Калі гаварыць пра працу, дык, напэўна, тое, што адчуваеш, як твае намаганні, твая праца ў выніку прыносяць плён, карысць. Што вырашаюцца нейкія сітуацыі, ёсць канкрэтныя вынікі. Гэта сапраўды прыносіць задавальненне, я сказаў бы, з'яўляецца нават своеасаблівым відам адпачынку. Калі так здараецца, і на жыццё іначай глядзіш, з большым аптымізмам. Калі ўсё атрымліваецца, нават фінансавы крызіс не падаецца нечым такім страшным. Галоўнае, працаваць і знаходзіць у працы задавальненне.

Ірына САМУСЕНКА, навуковы супрацоўнік лабараторыі арніталогіі Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах:

— Тое, як паспяхова вучыцца мой маленькі сын. Яму гэты працэс вельмі падабаецца. З гэтага года ён ходзіць у секцыю па плаванні (сама яго плаваць навучыць не магла), па поспехах у групе — першы. Займаецца ў секцыі дзюдо, лічу, для хлопчыка гэта можа быць вельмі карысным, бо зможа пастаяць за сябе. Харэаграфіяй у школе займаецца, гэта вельмі прыгожа... Малым дзеткам адзнакі яшчэ не ставяць, аднак настаўнікі па ўсіх прадметах, калі б першыя ўжо былі, кажуць, што займаецца ён арыенціровачна на «дзясяткі». Чытае шмат, усё запар, кожны тыдзень мы ходзім з ім у бібліятэку. Я, безумоўна, настойваю, каб перавагу аддаваў класічным мастацкім творам. Зразумела, апроч іншага, цікавіцца птушкамі. Займаецца ён у 2-м класе, аднак з лёгкасцю парашаў заданні па алімпіядзе для вучняў 3-га класа. Настаўніца сказала, што калі б сын удзельнічаў у ёй — абавязкова заняў бы першае месца.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Жорсткіх рэкамендацый — што выпісваць настаўнікам — не існуе»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

У рэдакцыю патэлефанавала настаўніца з Кобрынскага раёна (прозвішча і назва школы, дзе яна працуе, у нас ёсць) з пытаннем наконт удзелу педагогаў у падпісцы на тыя ці іншыя друкаваныя перыядычныя выданні.

— Нам даводзяць цэлы спіс газет, якія мы павінны выпісваць — ад раённай, абласной і да рэспубліканскіх выданняў. А калі нічога з гэтага пераліку мне не падабаецца ці, як у выпадку з адной з ведамасных газет, я знаходжу ў ёй няшмат карыснага? Вось «Звязда» мне падабаецца, я лепш бы яе выпісвала. А даходзіць вось да чаго: нягледзячы на тое, што на школу ідзе па два-тры экзэмпляры газеты і з ёй можна пры жаданні падрабязна азнаёміцца на працы, адміністрацыя кажа, каб тое ж самае выданне мы яшчэ выпісвалі і на свой хатні адрас. Дарэчы, нагадаю, што сума грошай, якая выдзяляецца штомесяц настаўнікам для набыцця метадычнай літаратуры, працяглы час не змянялася і складае 7,5 тысячы рублёў, — гаварыла нам заяўніца.

Паводле слоў загадчыка аддзела адукацыі Кобрынскага райвыканкама Валянціна Трубчыка, якога мы папрасілі даць адказ на пытанне настаўніцы, ніхто ніколі не прымушаў педагагічных работнікаў выпісваць пэўныя перыядычныя выданні, нейкіх афіцыйна зацверджаных пералікаў тут няма і быць не можа. Існуюць толькі рэкамендацыі.

— Пагадзіцеся, любы чалавек павінен цікавіцца мясцовымі навінамі, абласнымі, ведаць, што адбываецца ў краіне. Тым больш настаўнік, якому, апроч іншага, патрэбна для працы і спецыяльная літаратура. Мы цікавімся, вывучаем пытанне: што выпісваюць педагагічныя работнікі, чаму аддаюць перавагу. Уласна, для гэтага і даюцца пэўныя рэкамендацыі, аднак яны не з'яўляюцца жорсткімі. Ведаеце, на жаль, часам высвятляецца, што некаторыя настаўнікі ўвогуле нічога не выпісваюць. Але нават у такой сітуацыі мы не маем права прымусіць чалавека на нешта падпісацца, калі ён сам не хоча, — сказаў Валянцін Васільевіч. — Што да штомесячнай сумы для набыцця метадычнай літаратуры, дык яна, як і па ўсёй краіне, сапраўды складае 7,5 тысячы рублёў. Я б не сказаў, што гэта зусім мала, асабліва калі памножыць яе на 12 месяцаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

BelSwissBank
БЕЛОРУССКО-ШВЕЙЦАРСКИЙ БАНК

Наименование банка:
ЗАО «Белорусско-Швейцарский банк БелСвиссБанк»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2009 года

(в млн. белорусских руб.)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	01.04.09	01.04.08
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	23 469,3	16 384,8
3	Средства в Национальном банке	1102	2	8 165,9	8 415,7
4	Ценные бумаги	1103		3 951,2	12 038,5
	для торговли	11031	3	134,5	1 471,6
	удерживаемые до погашения	11032	3.1.	—	—
	в наличии для продажи	11033	3.2.	3 816,7	10 566,9
5	Кредиты и другие стредства в банках	1105	4	60 145,5	26 772,6
6	Кредиты клиентам	1106	5	3 859,8	4 743,6
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	15,0	15,0
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	30 124,1	14 247,6
9	Прочие активы	1109	8	6 395,1	12 805,8
10	ИТОГО активы	110		136 125,9	95 423,6
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	—	—
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	31 451,6	26 367,8
14	Средства клиентов	1206	11	65 742,0	46 621,5
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	208		386,1	136,5
16	Прочие обязательства	1209	12	1 884,1	609,5
17	ВСЕГО обязательства	120		99 463,8	73 735,3
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	26 400,0	15 875,0
20	Эмиссионный доход	1212		—	
21	Резервный фонд	1213		3 972,1	2 786,7
22	Накопленная прибыль	1214	14	816,5	690,4
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	5 473,5	2 336,2
24	Всего капитал	121		36 662,1	21 688,3
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		136 125,9	95 423,6
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	37 540,5	24 009,9
28	Обязательства	1302	17	40 622,1	22 119,3

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2009 года

(в млн. белорусских руб.)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	1 апреля 2009 г.	1 апреля 2008 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		767,7	574,8
2	Процентные расходы	2012		1 321,2	316,1
3	Чистые процентные доходы	201	18	- 553,5	258,7
4	Комиссионные доходы	2021		2 472,5	1 405,6
5	Комиссионные расходы	2022		285,7	169,8
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	2 186,8	1 235,8
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	5 376,5	3 399,4
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	21,1	- 214,9
9	Доход в форме дивидендов	205		—	—
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	- 67,0	102,2
11	Прочие доходы	207	23	367,5	592,9
12	Операционные расходы	208	24	4 429,5	3 336,3
13	Прочие расходы	209	25	136,6	148,5
14	Налог на прибыль	210		538,9	103,3
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		2 360,4	1 581,6

Председатель Правления **В.А. Казбанов**

Главный бухгалтер **И.И. Трепашко**

Лицензия Национального банка РБ на совершение банковских операций № 7 от 29.12.2008 г.

ЯК НЕ ХАВАЙ ГРОШЫ ДОМА...

...калі ў кватэры няма сігналізацыі, дык іх могуць украсці. Або падабраўшы ключы, або ўзламаўшы замкі. Так яно і адбылося апошнімі днямі ў Гомелі і Мазыры. У першым выпадку з кватэры жанчыны 1965 года нараджэння зніклі залатыя ўпрыгажэнні, 2 тысячы долараў, 700 еўра і паўмільёна рублёў. А ў другім — 8 мільёнаў рублёў, 3 тысячы долараў і 3 тысячы еўра.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

КАНТРАФАКТ «ЗАВАЖЫЎ» 70 МЛН

У Гродне на адным з рынкаў супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі УУС і УКДБ затрымалі трох мясцовых індывідуальных прадпрымальнікаў. Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, высветлілася, што гора-бізнэсмены рэалізоўвалі кантрафактныя DVD-дыскі. У прадпрымальнікаў праваахоўнікамі канфіскавана 5377 дыскаў на агульную суму 70 мільёнаў рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

Яўгена ПЯСЕЦКАГА
ФОТА СЛОВА

Спяшаемся, каб не спазніцца,
Хаця, спазняемся нямала,
І не спакой ўначы нам сніцца,
А ўсцяж бяссонныя вакзалы.
Спяшаць – сучасная прыкмета,
Не лепшая, але адзіная...
...Адно, каб толькі ў тлуме гэтым
Нам не забыцца пра Радзіннае.

Шануй сваё!

ПАКУЛЬ ГАРЫЦЬ «СВЕЧКА»...

Абраз Казанскай Божай Маці ўжо не першае стагоддзе ахоўвае людзей ад няшчасцяў

1942 год. Згарэлі ў Бярэзінскім раёне суседнія вёскі Чырвонае і Узнаж. Наваселле, як партызанская вёска, таксама падлягала знішчэнню. Жыхары з дня на дзень чакалі дрэнную навіну. І вось ад партызанаў прыйшлі звесткі: збіраецца карны атрад. Перад тым, як бегчы ў лес, людзі вырашылі правесці старадаўні рэлігійны абрад, пра які чулі ад старажылаў. «Свечку», як называлі яго ў народзе, забаранілі з прыходам савецкай улады. Аднак многія яго памяталі са свайго дзяцінства.

* * *

Сабраліся ў хаце Аляксея Раманька, што жыў у самым пачатку вёскі. Людзей набралася — поўная хата. З пустымі рукамі прыходзіць нельга, таму па традыцыі кожны ўзяў з сабою «аброк» — міску мукі для гаспадара за тое, што прыняў усіх у сябе. Прынеслі абраз Казанскай Божай Маці, запалілі свечку і пачалі разам маліцца за здароўе ўсіх прысутных.

Не прайшло і паўгадзіны, як наляцеў карны атрад. Гітлераўцы сагналі ўсіх у вялікае гумно. Абшукалі гарышчы і скляпы, знайшлі схаваных дзетак і іх такцыю. І цяпер «Свечка» праходзіць двойчы ў год.

***

Кажуць, што традыцыя гэтая існавала ў вёсцы яшчэ ў Пятроўскую пару.

— Гэты святы рытуал праводзіўся штогод 4 лістапада, у Дзень Казанскай Божай Маці, — распавядае Фёдар Фёдаравіч. — Аднак у вёсцы пасля вайны вырашылі ўшаноўваць традыцыю і на Ушэсце, праз сорак дзён пасля Вялікадня.

Здаўна абрад праводзіўся так. Спачатку неабходна было з лёну спрасці нітку, з якой затым саткаць ручнік. Зрабіць гэта патрэбна было за дзень з адной умовай: працэс павінен быць бесперапынным. Таму для гэтага збіраліся разам усе жанчыны і садзіліся за прасніцы, а адна бралася за кросны. Пасля гэтым новасатканым ручніком трэба было абнесці вёску. Яшчэ адзін абавязковы атрыбут, ад якога і пайшла назва ўсёй дзеі, была свечка. Гаспадары, якія трымалі пчол, ахвяравалі воск на яе выраб.

— Яшчэ ў пару майго дзяцінства свечка была самаробная, тоўстая, з пчалінага воску, — успамінае Фёдар Фёдаравіч. — Аднойчы, калі быў малы, і мне даверылі скатаць яе. Сёння ж такую ўжо і не адшукаеш. Таму даводзіцца купляць.

Падпаленую свечку разам з абразом пераносілі з той хаты, дзе адбываўся рытуал мінулы раз, у хату наступную. Побач з абразом заўсёды ляжаў ліст для запісу блізкіх, за здароўе якіх павінен быў памаліцца бацюшка, а таксама стаяла талерка для ахвяраванняў. І пакуль гарэла свечка, святар служыў малебен за здароўе, асвячаў прынесеную ў хату ваду, а ўсе прысутныя маліліся разам з ім. Пасля малебну ўся вёска набірала сабе асвечанай вады, ну а потым усе збіраліся за агульным святочным сталом.

— Сёння абрад праводзіцца гэтак жа. Ёсць толькі некалькі адрозненняў: ручнік ужо ніхто не тчэ, дый свечка ўжо даўно не самаробная, — кажа Фёдар Сіняк. — А ў астатнім мы ўсё выконваем так, як заведзена спрадвеку. І вось ужо каторы год Казанская Божая Маці ахоўвае вёску ад няшчасцяў. Шкада толькі, што многія скептычна ставяцца да цуду, што адбыўся ў 1942 годзе. Аднак мне здаецца, што факт гаворыць сам за сябе: пасля вайны амаль усе вёскі вакол Навасселля ляжалі спаленыя. А наша вёска засталася стаяць. І гэта не адзіны цуд, які адбыўся дзякуючы заступніцтву Багародзіцы. Напрыклад, у Навасселлі пасля вайны і да нашых дзён ніколі не было тапельцаў, у той час, як у суседніх вёсках нярэдка здараліся выпадкі ўтаплення... Яшчэ цуд: у жанчыны, хворай на рак, перад якой лекары разводзілі рукамі, хвароба нечакана знікла! Кабета шчаслива дажыла да васьмідзесяці з гакам гадоў! А вось зусім свежы прыклад: пасля апошняга правядзення «Свечкі» жанчына адмовілася ад алкаголю. Да гэтага бязбожна піла, яе малое дзіця падкормлівалі суседзі, сама ж яна заўсёды адмаўлялася ад удзелу ў абрадзе. А восенню прыняла запрашэнне... Дарэчы, наступная «Свечка» пяройдзе ў яе хаце.

Пасля некаторай паўзы Фёдар Фёдаравіч дадае:

— Яшчэ шкада, што моладзь гэтую традыцыю не падтрымлівае, не спраўляе «Свечку» разам з намі. Не хацелася б, каб гэты абрад знік, забыўся. Гэта ж нашы карані, наша гісторыя, наша вера і наша культура. Наша аснова.

Таццяна ДАНІЛУШКІНА.
Фота з асабістага архіва Фёдара СІНЯКА.

Асобы і вобразы

У мастацтве, як і ў любой творчасці, вельмі цяжка ісці сваім шляхам. Многія творцы выкарыстоўваюць напрацоўкі мінулых пакаленняў і не імкнуцца здзівіць свет. Калі праца застаецца ў чатырох сценах, то гэта мала каго турбуе, а калі ўсталёўваецца на стагоддзі ў цэнтры горада...

Праект помніка ў гонар 1000-годдзя Брэста, які запланавана ўзвесці на перакрыжаванні вуліц Савецкай і Гогаля, шмат у чым пераклікаецца з манументам, прысвечаным тысячагоддзю Расіі, які быў устаноўлены ў Ноўгарадзе ў 1862 годзе.

Гэтая блізкасць асабліва стала праглядацца, калі адбылася карэкціроўка кампазіцыі на калоне помніка. Напачатку там перад Божай Маці на каленях стаяў купец. Пазней Марыю замянілі на анёла. У Ноўгарадзе манумент хоць і пампезны, але велічны — імперскі. Там на помніку ў бронзе размешчана 109 знакамітых асобаў, якія пакінулі свой след у гісторыі Расіі.

На вялікі жаль, брастаўчанін, аўтар гэтага помніка, не ўлічыў той момант, што 21-е стагоддзе ўсё ж не дзевятнаццатае і патрэбна іншая канцэпцыя — сучасны мастацкі падыход. А шчыра кажучы, праект помніка глядзіцца куртатым, у ім парушаны прапорцыі, суадносіны элементаў з цэлым — гэта кідаецца ў вочы адразу.

Тым не меней не гэта прымусіла мяне ўзяцца за напісанне артыкула.

12 студзеня Брэсцкі аблвыканкам прыняў канчатковы варыянт манументальнага помніка ў гонар 1000-годдзя Брэста. Трох'ярусная кампазіцыя будзе зроблена з бронзы і граніту. Як мы ведаем, на калоне будуць знаходзіцца анёл з купцом, а ніжэй, у сярэднім ярусе, павінны стаяць шэсць гістарычных асобаў, якія пакінулі след у жыцці Брэста: князь Уладзімір Васількавіч, вялікі князь ВКЛ Вітаўт, Мікалай Радзівіл Чорны, Андрэй Кіжаватаў, Уладзімір Карват, Уладзімір Калеснік.

Здавалася б, усё агаворана і ўхвалена. Расійская імперыя здолела знайсці сродкі для ўвекавечання 109 знакамітых постацяў, а ў Брэста не той маштаб, хоць і шэсць чалавек — гэта ўсё ж канкрэтныя гістарычныя асобы. Але ў абласной прэсе прайшла інфармацыя, што каардынацыйны савет па ахове матэрыяльнай і духоўнай спадчыны вырашыў зрабіць карэкціроўку ў праекце помніка (а колькі іх ужо было!) і замяніць А. Кіжаватава, У. Карвата і У. Калесніка на сімвалічныя вобразы маці, салдата і летапісца.

З тысячагадовай гісторыі Брэста не здолелі набраць шэсць чалавек, якія пакінулі свой след у горадзе над Бугам?!

Калі ўжо выбралі такую канцэпцыю помніка, то трэба яе прытрымлівацца. А яшчэ лепш было б, каб кожнае стагоддзе мела канкрэтную асобу-прадстаўніка.

Што такое бязлікі летапісец у параўнанні з постаццю Уладзіміра Калесніка, які быў яркім прадстаўніком мінулага стагоддзя? Чалавек ваяваў, яго станаўленне як пісьменніка, крытыка, педагога адбылося ў Брэсце, тут У. Калеснік падрыхтаваў цэлую плеяду навукоўцаў — сваіх паслядоўнікаў. Для Брэста Уладзімір Калеснік — знакавая постаць. Пасля яго смерці ў горадзе, лічу, усё яшчэ няма чалавека, які мог бы прадстаўляць Брэст як творца, навуковец, інтэлігент на такім высокім узроўні.

Адносна вобраза салдата ідэя таксама надуманая, бо ў Брэсцкай крэпасці знаходзяцца якраз грандыёзныя манументы сімвалічных воінаў — гэта ж збіральныя вобразы. Для чаго ўводзіць яшчэ адзін у помнік? Там салдат (напэўна ж, у форме чырвонаармейца) сярод князёў будзе выглядаць, на мой погляд, недарэчна.

Знакамітыя асобы Бацькаўшчыны неабходна вызначаць не па нацыянальнасці, веравызнанні ці класавай прыкмеце, а па тым, што добрае яны для сваёй зямлі зрабілі.

Напомню, што пад Брэстам нарадзіўся К. Лышчынскі, якога за яго погляды спалілі ў Варшаве. Праўда, гэтая гістарычная асоба сёння ўжо незапатрабаваная — ён не верыў у існаванне Бога. Хоць вунь памяць Дж. Бруна ў Італіі ўшаноўваюць — у сэрцы каталіцызму.

Калі мы заклікаем выхоўваць моладзь на слаўных старонках нашай гісторыі, жыцці знакамітых сыноў і дачок краіны, то павінны адмовіцца ад неаб'ектыўнасці, а галоўнае, пазбягаць некампетэнтнасці ў пытаннях гісторыі і культуры.

Уявім, што каля будучага помніка 1000-годдзю Брэста спыніцца група турыстаў. Экскурсавод пра канкрэтных гістарычных асобаў можа апавядаць доўга, а што ён скажа пра летапісца з гусіным пёркам у руцэ?

Мы не павінны забываць пра гістарычную памяць, пры любой магчымасці неабходна аднаўляць яе. А то як яно часам бывае: тут прамаўчалі, а там пагадзіліся — і апынуліся на абочыне гісторыі.

Сёння закладваецца фундамент беларускай дзяржаўнасці, бо паўтара дзясятка гадоў — гэта яшчэ не тэрмін, каб можна было сказаць, што ў нас усё зроблена і працэс станаўлення дзяржавы закончаны. Неабходна спакойна і мэтанакіравана працаваць на суверэнітэт.

Здзіўляе паспешлівасць. Тысячагадовы юбілей Брэста адбудзецца толькі ў 2019 годзе, ёсць час яшчэ падумаць, абмеркаваць, папрацаваць над праектам, навошта гнаць коней?

Тут ёсць вялікая доля прагматызму, бо манументальных заказаў сёння няшмат, а галодных скульптараў — процьма. Сам у гэтай сістэме працаваў. Да выканання помніка, відавочна, будуць падключаны і сталічныя майстры — заказ салідны, то трэба каваць жалеза, пакуль яно гарачае.

Кожны помнік сведчыць пра эпоху, у якую ён быў створаны. Не хацелася б, каб паспешлівасць і мітусня вакол помніка ператварылі яго ў крывое люстэрка нашага часу.

І апошняе. Помнік будзе ўзводзіцца на ахвяраванні людзей, узносы калектываў прадпрыемстваў, устаноў, таму народ павінен ведаць, за што плаціць грошы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Фота БЕЛТА.

Погляд

Кветка пакут Хрыстовых

Год таму, калі мне давалі парастак гэтай кветкі, папярэдзілі: «Пабачыш, расцвіце абавязкова на свята. Зразумела, не на 7 лістапада». Як сапраўдны Фама, я моцна засумнявалася. І дарэмна. Першую кветку, як мне і прадказалі, я пабачыла на Пакроў Божай Маці. А потым пайшлі — адна за адной — на святы, або напярэдадні іх. Апошняя на маіх вачах раскрывала свой бутон у панядзелак, першы дзень праваслаўнага Страснога тыдня. Так яна апраўдвае сваю назву: «страстацвет». Між тым, ёсць версія, што іезуіты бачылі ў кветцы прыладу для катавання Ісуса Хрыста, таму так назвалі расліну.

Батанікі яе называюць Passiflora caerulea, або пасіфлора блакітная. Каб палюбіць гэту расліну, не абавязкова ўжываць запакаяльны лекавы сродак «Нова-пасіт», у склад якога яна ўваходзіць. Дастаткова пабачыць незвычайную кветку і адчуць яе тонкі водар. Яна падобная на вадзяную лілію з вянцом блакітна-фіялетавых тычынак. Па асабістым вопыце скажу — вырошчваць зусім не складана, галоўнае, каб прыжылася. Калі ўмовы яе задаволяць, будзе вельмі хутка выганяць ва ўсе бакі галіны з лістамі, падобнымі на растапыраную далоньку дзіцяці. Любіць, як жанчына, па вясне зрабіць кароткую прычоску — можна не шкадаваць і абразаць на 1/3. Пасля гэтага ёсць гарантыя, што будзе расці яшчэ хутчэй — да 4 метраў у даўжыню, і цвісці — кветкі з'яўляюцца на новых парастках.

Калі знойдзецца месца на сонечным акне, таксама будзе вельмі ўдзячная. Але яе задаволіць і ўсходняе, і заходняе. Расце і на паўночным, толькі кветак значна менш дае. Сакрэты вырошчвання

пасіфлоры вельмі простыя: зімой каб не ніжэй за +7 градусаў, летам выцерпіць і спякоту, але лепш прыцяніць. Вільготнасць любіць, таму паліваць давядзецца рэгулярна. Не будзе супраць, калі яе «падкарміць»: раз у 2-3 тыдні вясной і летам. Гэтай шматгадовай ліяне абавязкова патрэбна апора. Можна купіць у краме, а можна сагнуць дрот і ўваткнуць яго ў глебу. Пасіфлора замацуецца вусікамі і абдыме яго. Расліну можна вырошчваць і як аднагадовую — тады прыйдзецца кожную вясну абразаць і чаранкі садзіць нанова.

У свеце вядома больш за 500 відаў ліян, распаўсюджаных у трапічных лясах Амерыкі, Бразіліі, Парагвая, Аргенціны. Мне было вельмі цікава даведацца аб найбяскорыснейшых сваяках пасіфлоры. Як экзатычныя фрукты, яны вядомыя пад назвамі гранадзіла і маракуя. У Бразіліі даўно наладжана прамысловая вытворчасць соку з маракуі. У Аўстраліі з гэтых пладоў робяць алкагольны напой, а нявыспелыя плады выкарыстоўваюць як гародніну. Між іншым, прыдатныя да яды і плады вышэйназванай блакітнай пасіфлоры. Жыхары Бразіліі мякаць гранадзілы прымяняюць пры галаўным болі, астме, дызентэрыі, неўрастэніі і бяссонніцы, а адвар лісця — пры скурных захворваннях.

Шкада толькі, што дзівосныя кветкі, падобныя на зоркі, так хутка закрываюцца. Але ж на маёй расліне ёсць яшчэ адзін бутон — відаць, цуда-кветку пабачу якраз на Вялікдзень.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Уважаемые акционеры ОАО «Электроремонтный завод»

29 апреля 2009 года
состоится внеочередное общее собрание акционеров
ОАО «Электроремонтный завод»,
расположенного по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 19.

Собрание пройдет по адресу: г. Минск, промузел Колядичи, ул. Бабушкина, 19, третий этаж, зал заседаний.

Повестка дня собрания:

1. О согласовании доли увеличения коммунальной собственности в Уставном фонде ОАО «Электроремонтный завод» на сумму субсидий, выделенных из бюджета г. Минска.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 19 (отдел кадров) с 21.04.2009 г. по 25.04.2009 г. (время работы с 12.00 до 15.00) и в день проведения собрания.

Регистрация участников собрания **с 14.00 до 14.45** по месту проведения собрания.

Начало работы собрания — 29 апреля 2009 года в 15.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра акционеров на 01 апреля 2009 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность!

УНН 100008169

ИНФОРМАЦИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ФИНАНСОВО-ЭКОНОМИЧЕСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ Открытого акционерного общества «МОЛОДЕЧНОЛЕС» за 2008 год

№ стр.	Наименование показателей	Ед. изм.	За отчетный период
1	Выручка от реализации товаров, продукции, работ и услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей)	млн руб.	10 666
2	Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг, управленческие расходы, расходы на реализацию	млн руб.	12 422
3	Прибыль (убыток) за отчетный период, всего в том числе:	млн руб.	-1387
3.1	прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг	млн руб.	-1756
3.2	прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	млн руб.	622
3.3	прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	млн руб.	-253
4	Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли	млн руб.	47
5	Просроченная долгосрочная дебиторская задолженность	млн руб.	—
6	Просроченная долгосрочная кредиторская задолженность	млн руб.	624
7	Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	млн руб.	—
8	Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн руб.	—
9	Количество акционеров всего: в том числе	лиц	1085
9.1	Юридических лиц	лиц	1
9.2	Физических лиц	лиц	1084
10	Среднесписочная численность работающих	чел.	524
11	Обеспеченность акции имуществом Общества	тыс. руб.	0,45

УНП 600066488

Извещение о созыве внеочередного собрания акционеров ОАО «ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД им. Н. ГАСТЕЛЛО»

Собрание акционеров состоится **29 апреля 2009 г.** в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18, актовый зал Общества. Регистрация участников собрания производится в день собрания с 11.45 до 12.45 по месту проведения осбрания.

Повестка дня:

1. О реорганизации ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло» в форме присоединения к нему ЗАО «Амкодор-Унимод».
2. Утверждение договора о присоединении ЗАО «Амкодор-Унимод» к ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».
3. Об увеличении размера уставного фонда ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».
4. Об утверждении решения о выпуске акций ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».
5. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло» и утверждение Устава в новой редакции.

С информацией (материалами), подлежащими предоставлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 23 апреля 2009 года в приемной Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания по месту его проведения.

Наблюдательный Совет ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло»

УНН 100010116

Извещение о созыве совместного собрания акционеров ОАО «ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД им. Н. ГАСТЕЛЛО» и акционеров ЗАО «Амкодор-Унимод»

Собрание акционеров состоится **29 апреля 2009 г.** в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18, актовый зал Общества. Регистрация участников совместного собрания производится в день собрания с 11.45 до 14.00 минут по месту проведения собрания.

Повестка дня:

1. Об увеличении размера уставного фонда ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».
2. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло» и утверждение Устава в новой редакции.

С информацией (материалами), подлежащими предоставлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 23 апреля 2009 года в приемной Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания по месту его проведения.

Наблюдательный Совет ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло»

УНН 100010116

ПРЫНЦ НА «ХУТКАЙ ДАПАМОЗЕ», *або Яшчэ адна шчаслівая гісторыя пра каханне*

У трохмесячнага Арцёмкі татавы вочкі і носік. Засяроджана разглядаючы яркую бразготку, ён нават губкі складвае кружочкам — гэтак жа, як Валера, калі з галавой акунаецца ў цікавую тэлепередачу. Але маладую матулю Лену такое поўнае падабенства ніколькі не засмучае. Галоўнае, што здароўе ў малога таксама бацькава, і яе дзіцячы цэрэбральны параліч ніяк не азмрочыў дзяцінства юнага маладзечанца.

Сёння Валера і Лена Мілош дзеляць свае жыццё на «да сустрэчы» і «пасля сустрэчы». І хоць апошні перыяд доўжыцца крыху болей чым год, ён стаў такім урадлівым на падзеі, што засланіў успаміны дзяцінства і юнацтва.

Валера ўжо амаль і не памятае, як у той час, калі аднагодкі ганялі машынкі, ён алоўкам рабіў уколы ўсім ахвотным. Самым падатлівым пацыентам была бабуля: яна пакорліва ўкладвалася на канапе, а пасля «ін'екцыі» на радасць хлопчыка гучна дзівілася, што і спіна перастала балець, і сэрца. У перапынках паміж «аперацыямі» трохгадовы Валера забаўляў родных уласнымі казкамі, прымушаючы іх гадаць, кім усё ж такі вырасце хлопчык — урачом ці, можа, пісьменнікам? Выбраўшы клас з хімікабіялагічным ухілам, ад творчасці Валера не адрокся і, як гэта звычайна бывае, свой першы верш прысвяціў аднакласніцы. Праз некалькі гадоў твораў набралася на добры зборнік, балазе дзяўчат вакол юнака заўсёды было шмат — і ў профільным класе, і ў медвучылішчы. «Я заўсёды адчуваў сябе быццам у мастацкай галерэі: вакол столькі прыгожага!» — усміхаецца мой суразмоўца. Нядзіўна, што да знаёмства з Ленай ён падышоў з добрым веданнем жаночай псіхалогіі і ўменнем заляцацца...

Пра мужава дзяцінства Лена расказвае з большай ахвотай, чым пра сваё. Ды і мала ў ім было адметнага: хадзіла ў школу, любіла маляваць і, як кожная дзяўчына, марыла выйсці замуж. Вось толькі спіс патрабаванняў да будучага прэтэндэнта на руку і сэрца быў у яе крыху даўжэйшым: «прыгожы», «пяшчотны», а яшчэ — «здаровы»...

Атрымаўшы атэстат, Лена працавала на заводзе, арудавала паяльнікам. Так што калі ў маладой сям'і выходзіць са строю чайнік, пытанні пра тое, каму яго рамантаваць, не паўстае.

На момант знаёмства з Валерам дзяўчына працавала аператарам ЭВМ у цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Пераканаўшыся, што з тэкставым рэдактарам Лена на «ты», кіраўніцтва даверыла ёй набіраць на камп'ютары «Сцяжынку» — самвыдаўскую газету для людзей, хворых на рассеяны склероз. І вось адным лютаўскім днём у яе кабінет зазірнуў сам рэдактар выдання, які з парога адрэкамендаваўся: «Валерый»...

Кабінет у маладой работніцы ўвесь застаўлены тэхнікай. «Яшчэ ў першы візіт мне кінулася ў вочы, што вакол такой прыгожай дзяўчыны адны толькі прыборы і няма ніводнай кветкі», — успамінае Валера. Вырашыўшы, што букет — справа недаўгавечная, у свой наступны візіт ён прынёс Лене гаршчочак з бягоніяй. (Сыходзячы ў дэкрэтны адпачынак, дзяўчына забрала кветку дахаты). «Гэта наша дрэва шчасця!» — смяецца мая суразмоўніца.

Валера выкарыстоўваў любую зачэпку, каб лішні раз зазірнуць да новай знаёмай. Аднойчы прыйшоў збіраць подпісы супраць вясновага палявання на птушак. Тады нават Леніна дырэктар сваё прозвішча паставіла, выразна ўсміхаючыся, маўляў, не ў птушках тут справа.

А Лена ўжо і сама была не супраць змяніць рабочы кабінет на сямейную кухню, тым больш што бацькам Валера спадабаўся. Даведаўшыся, што малады чалавек — доктар, Леніна бабуля палічыла сваім абавязкам паказаць яму ўсе свае лекі. А калі за госцем зачыніліся дзверы, сказала ўнучцы: «Калі ты яго ўпусціш, гэта будзе самая вялікая памылка ў тваім жыцці!». Памыляцца дзяўчына не любіла яшчэ са школы, і ў маі яна ўжо на правах законнай жонкі, як гераіня чэхаўскага «Настаўніка славеснасці», збірала Валеру «ссабойкі», толькі што ў белую

Мне лёс падараваў Сусвет
Яе Вялікасці Жанчыны
І даў кахання запавет,
І я адчуў сябе шчаслівым.
Мая спрагнёная душа
У пошуках яе лунала,
І ведаў Госпад мой і я:
Адзіная мяне чакала...

Кладуцца крокі па жыцці,
З'яднаны вернасцю далоні
Бы лета промні ў вышыні,
У жыцці — вялікім жытнім полі.
Мінае год, прайдуць гады,
Шырокай стала пуцявінка.
З табой мы разам назаўжды:
Ты — майго сэрца палавінка!

Валерый МІЛОШ.

сурвэтку не загортвала.

Крызіс першага года пасля вяселля, пра які так любяць распавядаць псіхолагі, маладую сям'ю не закрануў. «Валера ніколі не скупіцца на кампліменты, нават калі я стаю ў халаце ля пліты,— дзеліцца Лена. — І яму не трэба спецыяльнай зачэпкі, каб купіць жонцы шакаладку». А калі сабраць разам усе ўласныя чатырохрадкоўі, якія Валера дасылаў каханай па SMS, то атрымаецца не больш не менш — паэма. Нават на маё пытанне, чым «зачапіла» яго гэтая дзяўчына, ён паэтычна адказвае: «Я ні ў кога не бачыў такіх вачэй. Яны нагадваюць студню, у якой адбіваюцца зоры».

«Адна бяда — няма на што пажаліцца, — смяецца Лена. — Сяброўкі нават сярдзюць: «Няўжо ён у цябе сапраўды такі харошы, што ты і паскардзіцца не можаш?»

Але ўсе хлопцы харошыя, пакуль не даводзіцца мыць пялюшкі. Хоць Валеру рабіць гэта таксама не давялося. «Мне ў раддоме сказалі: вашаму малому пялюшкі не патрэбныя — такі ён вялікі», — успамінае Лена. Усе і цяпер не перастаюць дзівіцца, як яна, такая стройная, нарадзіла гэткага асілка — 59 см росту, 3900 вагі.

«Напэўна, сакрэт у тым, што я знаходзілася пад наглядам доктара кругласутачна», — усміхаецца маладая матуля. Валера сам падбіраў Лене вітаміны, а пасля нараджэння сына пайшоў у адпачынак, каб быць побач з сям'ёй. «Па першым часе ў мужа куды больш спрытна атрымлівалася пераапранаць сыночка, калыхаць. І гэта нядзіўна: ён ужо дзевяць гадоў працуе на «хуткай дапамозе» ў педыятрычнай брыгадзе».

Складана падлічыць, колькі гузікаў і фасолін Валера выцягнуў з дзіцячых насоў за гэты час. І сем'і пабачыў самыя розныя. Асабліва ўрэзалася ў памяць адна зусім бедная, дзе двухгадовага малога даглядала прабабуля: у іх дома не было ніводнай цацкі! Але ў большасці, вядома ж, сем'і заможныя. Валера звяртае ўвагу, у каго з пацыентаў якія гульні, а ўвечары дзеліцца з жонкай: «Я сёння такую цацку бачыў — трэба і нашаму купіць!»

Сярод апошніх пакупак — дыск з калыханкамі. Але гэтая забава, хутчэй, для бацькі. Валера запамінае мелодыі і потым сам напявае іх сыну, бо ўпэўнены, што лепшая музыка для кожнага малога — голас бацькоў. «І добрыя словы, — падказвае Лена. — Я не веру, што дзіця да года нічога не разумее: калі я расказваю Арцёмку, які ён харошы, які прыгожы, той адразу пачынае ўсміхацца».

Валераўвых добрых слоў хапае не толькі на сям'ю, але і на пацыентаў: летась ён стаў лаўрэатам рэспубліканскага кірмашу сацыяльных праектаў з цыклам вершаў «Падтрымай чалавека ў хваробе, добрым словам яго сагрэй». Каля ста твораў аб'яднаныя адной ідэяй — урач павінен не толькі выпісваць лекі, але і несці пацыентам добры настрой. Гэта правіла Валера пераняў ад сваёй першай напарніцы Ганны Зяньковай: яна назаўсёды застанецца для яго прыкладам сапраўднага доктара, які можа палегчыць боль адным толькі сваім прыходам. Дарэчы, мой суразмоўца ўпэўнены, што ў мастацтве недарма заўсёды было многа медыкаў — узяць хоць бы Чэхава, Булгакава, Разенбаўма: «У дактароў накопліваецца столькі перажытага, што яго ўжо немагчыма насіць у сабе».

Уласныя ўражанні Валера размяшчае на сваёй віртуальнай старонцы, створанай на партале stihi.ru. Нядаўна ён узяў удзел у паэтычнай дуэлі — у наведвальнікаў сайта толькі і было размовы, што пра гэты турнір, з якога Валера, безумоўна, выйшаў пераможцам.

«Я часта пытаюся ў мужа: і як цябе на ўсё хапае? — кажа Лена. — А ён адказвае: «Ведаеш, як гэта ўсё цікава!»

Зараз Валера марыць паспрабаваць сябе ў мастацтве фатаграфіі. Ён спадзяецца, што паспее назбіраць грошай на лічбавую камеру да таго часу, калі Арцёмка, ці як яго ласкава называе прабабуля, «Господин номер один» — будзе гатовы зрабіць свой першы крок. Але галоўная мара маладых бацькоў — гэта, безумоўна, асобная кватэра. Пакуль яны туляцца ў аднапакаёўцы Валераваго бацькі, які велікадушна ўступіў яе дзецям і на час перасяліўся на ўскраіну. Бо калі ў сям'і падрастае дзіця, трэба, каб і аптэка была побач, і крама. Мілошы не раз хадзілі глядзець, як ідзе будаўніцтва дома, які яны ўжо называлі «сваім», але замарудзілі з падачай адной са шматлікіх даведак і без папярэджання былі выкінутыя з чаргі.

Аднак маладыя не крыўдуюць. І кажуць, што калі ў іх нарэшце з'явіцца свая жылплошча, возьмуць у кампанію да Арцёмкі «адмоўнічка»: Лена да гэтай пары ўспамінае, як у раддоме яны цягнулі з-за шкла свае маленькія ручкі.

— Зразумела, калі ўсё будзе добра... — кажа Лена.

Няхай, так і будзе.

Вікторыя КРУПЯНЬКОВА.
Фота аўтара.

Расклад руху электрычак у перадсвяточныя і святочныя дні

Паводле інфармацыі Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі, рух прыгарадных цягнікоў у святочныя і перадсвяточныя дні ў красавіку-маі будзе арганізаваны наступным чынам.

На ўчастках Мінск—Маладзечна, Мінск—Асіповічы, Мінск—Баранавічы, Мінск—Орша 25 красавіка — па раскладзе рабочых дзён; 26 і 27 красавіка, 1-2 і 9 мая — па раскладзе суботы; 28 красавіка, 3 і 10 мая — па раскладзе нядзелі.

У Маладзечанскім вузле: 25 красавіка — па раскладзе рабочых дзён; 26-28 красавіка, 1-3 і 9-10 мая — як па выхадных днях.

На ўчастку Орша—Лепель: 25 красавіка — па раскладзе рабочых дзён; 26-28 красавіка, 1-3 і 9-10 мая — як па выхадных днях.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Недабудаваны музей Ігната Буйніцкага ў Глыбоцкім раёне выстаўлены на таргі

Недабудаваны музей Ігната Буйніцкага ў вёсцы Празарокі Глыбоцкага раёна выстаўлены на таргі, паведаміла начальнік аддзела аўкцыёнаў і конкурсаў Віцебскага абласнога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці «Віцебскаблмаёмасць» Ларыса Шчаглова.

Незавершаны аб'ект будаўніцтва можна будзе набыць з аўкцыёну за адну базавую велічыню 20 красавіка (у цяперашні час адна базавая велічыня складае Br35 тыс.). Пакупніку трэба будзе наладзіць тут прадпрымальніцкую дзейнасць і стварыць новыя працоўныя месцы.

Як адзначыў першы намеснік старшыні Глыбоцкага райвыканкама Віналій Пяткевіч, дом-музей заснавальніка беларускага прафесійнага тэатра было вырашана пабудаваць на яго радзіме ў Глыбоцкім раёне ў сярэдзіне 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Тады быў закладзены падмурак будынка і ўзведзена адна сцяна вышынёй, крыху большай за метр, аднак з-за адсутнасці сродкаў заваршыць будаўніцтва і адкрыць музей так і не ўдалося. Нягледзячы на тое, што даўгабуд выстаўлены на таргі, мясцовыя ўлады не маюць намеру адмаўляцца ад ідэі ўвекавечання памяці свайго земляка. Паводле слоў Віналія Пяткевіча, разглядаецца пытанне аб выдзяленні пад выставачную экспазіцыю памяшкання або адасобленага будынка ў Празароках, дзе пачынала выступаць трупа Буйніцкага.

У 2008 годзе «Віцебскаблмаёмасцю» за адну базавую велічыню было прададзена 55 будынкаў, якія не выкарыстоўваюцца, у малых гарадах і сельскай мясцовасці. Першы аўкцыён сёлета, які адбыўся 3 красавіка, таксама быў выніковым. Будынак былога гандлёвага цэнтра ў вёсцы Гілі Чашніцкага раёна, які пуставаў, прададзены за Br525 тыс., што амаль у 3 разы вышэй за першапачатковы кошт. На думку Ларысы Шчаговай, попыт на нерухомасць, якая не выкарыстоўваецца, абумоўлены ўмовамі, якія дзяржава стварыла для развіцця прадпрымальніцкай ініцыятывы на вёсцы і ў малых гарадах.

Дзіяна КУРЫЛА, БЕЛТА.

Антыкрызісная эканоміка

ХЛЕБАПЁКІ РУШАЦЬ НА ЎСХОД З ВЕЛІКОДНЫМІ КУЛІЧАМІ

Дырэктар хлебазавода Людміла МАЛАКОВІЧ: «Сёлета выпечам 9 тысяч велікодных кулічоў, і трэць з іх адправіцца ў Расію».

Тры тысячы велікодных булак з памежных Клімавічаў адпраўляюцца ў Расію. Мясцовы хлебазавод едзе на кірмаш у суседнюю Смаленскую вобласць.

У кандытарскім цэху хлебазавода пахне па-святочнаму смачна. З печкі вымаюць румяныя велікодныя кулічы. З крыжамі зверху, глазурай і каляровымі ўпрыгажэннямі. Пекары хваляцца: гэта не проста булка, а з дабаўленнем у цеста разынак і жэле!

Гэтыя кулічы ўжо цяпер едуць на Смаленшчыну, дзе на велікодным кірмашы расіяне, няма сумневаў, парасхопліваюць беларускую прадукцыю.

— Мы цяпер на нашу гандлёвую палатку павесілі надпіс «Купляйце беларускае!»: пакупнікі яшчэ ахвотней ідуць да нас і набываюць нашу прадукцыю! — распавядае пра замежны гандаль дырэктар Клімавіцкага хлебазавода Людміла Малаковіч.

Побач з велікоднымі кулічамі — іншая прадукцыя, якая карыстаецца папулярнасцю і ў Клімавічах, і ў Смаленскай вобласці. Напрыклад, вялікія прыгожыя караваі, якімі ў Клімавіцкім раёне цяпер ушаноўваюць перадавікоў пасяўной кампаніі. А вось бісквітныя мішкі, якіх для павелічэння попыту на расійскай тэрыторыі можна жартаўліва называць «медзведзянятамі прэзідэнцкімі». Кексы, бісквіты ў выглядзе сэрцаў і сланечнікаў — усё свежае і смачнае.

Клімавіцкі хлебазавод вырабляе амаль дзве сотні хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў. Асартымент сапраўды вельмі шырокі: ад самага масавага хлеба-цаглінкі «Саломінка», дзе шматлікімі выпрабаваннямі дасягнулі нарэшце ідэальнай якасці і хрумсткай скарыначкі, і да торта «Венецыя вечаровая», якая сапраўды вельмі смачная ў клімавіцкім выкананні і не шкодзіць фігуры дзякуючы раслінным вяршкам. У дадатак — напоі, розныя гатункі квасу, у тым ліку вырабленыя на натуральным сусле.

Хлебазавод першы квартал адпрацаваў з прыбыткам, і ў цяперашніх складаных эканамічных варунках працуе стабільна. Праўда, спецыялісты гавораць: штогод у сувязі з памяншэннем насельніцтва падае попыт на хлеб, але ў Клімавічах імкнуцца выкарыстоўваць усе магчымасці для стабільнай працы. Па-першае, распрацоўваюць новыя віды прадукцыі, дзе націск робіцца на цалкам натуральныя складальнікі, а не на дадаткі, якія палепшаць знешні выгляд.

Другі шлях — пошук новых рынкаў збыту. Клімавіцкія хлебапёкі рушылі на ўсход, у Расію. Удалося скарыстаць выгады геаграфічнага памежжа і добрыя сяброўскія сувязі раённай улады з найбліжэйшымі расійскімі суседзямі.

Спачатку паехалі ў Рослаў — раённы цэнтр у Смаленскай губерні, дзе ў адміністрацыі ёсць нашы землякі. Там вырашылі: клімаўчане хоць і канкурэнты расійскім хлебапёкам, але трэба думаць і пра інтарэсы спажыўцоў. Расіянам падабаецца беларуская прадукцыя. Яны лічаць, што калі беларускае — значыць, якаснае і натуральнае.

За адну суботу на рынку ў рослаўскім мікраёне Клімавіцкі хлебазавод прадае прадукцыі, як дзве фірмовыя крамы ў сваім райцэнтры. Яшчэ больш выгадна ездзіць на вялікія кірмашы ў Смаленск: там апошнім разам за тры дні нагандлявалі амаль на 40 тысяч расійскіх рублёў.

Цяпер клімавіцкія хлебапёкі ездзяць у Расію з выязным гандлем штотыдзень.

— Наша перспектыва — Смаленск і Рослаў, — упэўнена Людміла Малаковіч. — Мы цяпер гандлюем не толькі хлебам і кандытарскімі вырабамі, але і спадарожнымі беларускімі таварамі. Гэта павялічвае прыбыткі.

На Клімавіцкім хлебазаводзе гавораць, што негатыўныя праявы крызісу закранулі іх працу зусім нязначна. Сёння на прадпрыемстве працуе 125 чалавек, сярэдні заробак — 635 тысяч рублёў.

— Зразумела, без хлеба мы нікуды: за любым часам чалавеку патрэбен хлеб, бо ён — крыніца ўсіх патрэбных яму мікра- і макраэлементаў, — разважае Людміла Малаковіч. — Але і нам не выпадае сядзець на месцы і чакаць, калі пакупнікі самі прыйдуць. Трэба вырабляць новую прадукцыю, каб дагадзіць густам людзей, памяншаць выдаткі вытворчасці: летась на энергазберажэнні мы зэканомілі 40 мільёнаў рублёў. Будзем развівацца за кошт пашырэння зносінаў з памежнымі расійскімі тэрыторыямі.

Ілона ІВАНОВА.

Клімавіцкі раён.

Беларусь у студзені-лютым гандлявала са 142 краінамі

Беларусь у студзені-лютым 2009 года ажыццяўляла экспартна-імпартныя аперацыі са 142 краінамі свету. Тавары пастаўляліся на рынкі 100 дзяржаў, імпартавалася прадукцыя са 129 краін, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Асноўнымі гандлёвымі партнёрамі Беларусі ў студзені-лютым былі Расія (46,8 працэнта ўсяго аб'ёму тавараабароту), Нідэрланды (8,8 працэнта), Германія (5,6 працэнта), Украіна (5,3 працэнта), Польшча (3,2 працэнта), Латвія (3 працэнты), Кітай (2,7 працэнта), Злучанае Каралеўства (2,6 працэнта), а таксама Італія і Індыя.

Пастаўкі беларускіх тавараў у Расію па вынніках двух месяцаў 2009 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2008 года скарацціліся на 49,4 працэнта да $837,7 млн і склалі ў аб'ёме экспарту рэспублікі 31,6 працэнта. Экспарт у Нідэрланды зменшыўся на 49,9 працэнта да $528,8 млн. Наступствы сусветнага крызісу адбіліся на гандлі Беларусі і з многімі іншымі краінамі. Так, беларускі экспарт ва Украіну ў студзені-лютым склаў $172,2 млн, або 35,4 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года, у Польшчу — $103,7 млн (53,8 працэнта), Германію — $99,3 млн (61,9 працэнта), Латвію — $178,4 млн (71,6 працэнта). У той жа час ёсць і станоўчыя тэндэнцыі: экспартныя пастаўкі ў Індыю ў студзені-лютым узраслі ў 2,8 раза да $72,9 млн, Венесуэлу — у 2,3 раза ($48,5 млн), Францыю — на 21,3 працэнта ($13,6 млн).

Аб'ём знешняга гандлю таварамі Беларусі ў студзені-лютым 2009 года склаў $6,39 млрд, або 60,4 працэнта да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года. У тым ліку экспарт знізіўся да $2,649 млрд (52,2 працэнта), імпарт — да $3,741 млрд (67,9 працэнта).

Мілена АНУФРЫЁНАК, БЕЛТА.

ПАДУСТЫ «ДАВЯЛІ» ДА КРЫМІНАЛУ

На возеры Панькін Рог Кіраўскага раёна быў затрыманы грамадзянін, які падчас забароны на лоўлю рыбы здабываў яе з дапамогай сетак.

У браканьера канфіскаваны дзве сеткі агульнай даўжынёй 60 метраў і 38 асобінаў рыбы, сярод якіх было і 9 асобінаў падуста, што ўключаны ў Чырвоную кнігу. Пры затрыманні парушальнік аказаў непадпарадкаванне і спрабаваў уцячы. Высветлілася, дарэчы, што грамадзянін летась ужо прыцягваўся судом да адміністрацыйнай адказнасці. Зараз разглядаецца пытанне аб больш суровым пакаранні — узбуджэнні крымінальнай справы.

На Дняпры ў Быхаўскім раёне ў сетку яшчэ аднаго браканьера апроч іншай «здабычы» трапілі два «чырвонакніжнікі»-падусты. І ў гэтым выпадку ўрон прыродным рэсурсам быў нанесены ў буйным памеры, таксама паўстала пытанне аб узбуджэнні крымінальнай справы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДАРАГАЯ ПАЕЗДКА

Суд Драгічынскага раёна абавязаў жыхарку райцэнтра выплаціць штраф у памеры 200 базавых велічынь, гэта значыць 7 мільёнаў рублёў. У такую суму абышлася аўтааматарцы яе паездка. Праўда, паездка была не зусім звычайная. Кіроўца села за руль нападпітку, у такім стане яе затрымалі другі раз на працягу года. Давядзецца плаціць. І думаць.

Яна СВЕТАВА.

Два чалавекі загінулі на месцы, двое — у рэанімацыі

Такі вынік дарожна-транспартнага здарэння, якое адбылося ў Магілёве 15 красавіка а 4-й гадзіне. На вуліцы Крупскай, каля гарадскога моста 28-гадовы вадзіцель на аўтамабілі «Аўдзі-80» не выбраў бяспечную хуткасць, не справіўся з кіраваннем і ўдарыўся ў светлавую апору.

На месцы загінулі два маладыя мужчыны — 25-ці і 27-мі гадоў. Вадзіцель і 22-гадовая дзяўчына трапілі ў рэанімацыю гарадской бальніцы хуткай дапамогі. Медыкі расказалі, што мужчына знаходзіцца ў вельмі цяжкім стане, а дзяўчына — у цяжкім, і цяпер прагноз зрабіць немагчыма.

У прэс-цэнтры Магілёўскай ДАІ папярэдне паведамілі, што вадзіцель быў пазбаўлены правоў у 2007-м годзе за кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане. Вядзецца следства.

Алена КАЗЛОВА.

Фота БЕЛТА.

Шануй сваё!

Мультпарад па-беларуску

Наша анімацыя заваёўвае не толькі сваіх, але і людзей у іншых краінах

Заваёўвае сваіх — гэта праверана на ўласным вопыце. Я нават прапанавала б дзень, калі ў нас можна было ўбачыць новыя працы беларускіх аніматараў, лічыць вялікім святам, прычым не толькі дзіцячым. Ёсць за што.

Эпізод 1, эпічны

Анімацыйны фільм «Аповесць мінулых гадоў» карысна глядзець любому беларусу, незалежна ад узросту. Ды цікава, як высвятляецца, не толькі жыхарам нашай краіны, але і за яе межамі. Напрыклад, на прэстыжным фестывалі анімацыі ў расійскім Суздалі наша «Аповесць» заняла другое месца! Пры тым, што пра гісторыю нашай зямлі яна распавядае на беларускай мове — і нават суседзі зразумелі.

Гэты праект ажыццяўляе на «Беларусьфільме» мэтр беларускай мультыплікацыі Ігар Волчак, які згуртаваў вакол сябе групу майстроў, каб у вельмі даходлівай манеры распавесці гісторыю гербаў нашых гарадоў. Ёсць ужо тры часткі гэтага мультсерыяла, а першая расказала пра гербы Мінска і абласных гарадоў. «...У сярэднявечнай Еўропе рыцарскія знакі адрознівання сталі называцца гербамі... На тэрыторыі Беларусі першыя гарадскія гербы з'явіліся ў сярэдзіне XVI стагоддзя». І далей — пра Мінскі абраз Божай Маці, магілёўскую рысь, брэсцкую стралу... Столькі ведаў атрымліваеш за такі кароткі час — вось што значыць сіла мастацтва, якое ствараюць сапраўдныя чараўнікі: у «Аповесці мінулых гадоў» выкарыстаная ўнікальная тэхніка пяску.

Эпізод 2, жартаўлівы

У той час, калі наша ігравое кіно хварэе на праблему галоўнага героя, у аніматараў яе няма. Калі добра падумаць, то ў беларусаў ёсць сапраўдны народны герой з біяграфіяй — Несцерка, «у якога дзяцей шэсцеро». Яму прысвечаны кнігі, спектаклі. А Ігар Волчак прысвяціў яму яшчэ і анімацыйны серыял. Чарговая серыя «Як Несцерка з кірмашу ехаў» была паказана ў Доме кіно разам з іншымі новымі працамі беларускіх мультыплікатараў. У ёй кемлівы народны герой з дапамогай свайго ката злавіў мыш, якая наводзіла жах на князёўну, і як ратаўнік цяпер разлічвае на яе руку. Засталося для яе здабыць пярсцёнак, пра які ходзяць легенды... Але пра гэта, верагодна, будзе ў пятай серыі, над якой працуе творчая група Ігара Волчака.

Эпізод 3, разумны

Пра кемлівасць беларускага народа разважаў і Міхаіл Тумеля, калі супрацоўнічаў з уладальнікам «Оскара» Аляксандрам Пятровым. Тады і нарадзілася ў нашага мультыплікатара ідэя асобнага мультыплікацыйнага праекта.

— Ідэя праекта «Беларускія прымаўкі» нарадзілася далёка адсюль, за тысячы кіламетраў, у Яраслаўлі, калі я ездзіў па Расіі разам з Пятровым, — распавядае аўтар. — Са мной была кніжачка беларускіх прымавак. Калі я яе гартаў, то было вельмі шкада, што шмат якія трапныя цудоўныя прыклады беларускай мудрасці засталіся толькі на кніжных старонках. Іх рэдка можна пачуць ад некага ў гаворцы. Але можна вярнуць ва ўжытак, калі тыя ж прымаўкі перавесці ў мультыплікацыю, ды яшчэ стылізаваную пад тэхніку беларускай выцінанкі. Я пазнаёміўся з цудоўным майстрам выцінанкі Вячаславам Дубінкам і ўбачыў шэдэўры, якія выходзілі з-пад яго рук. Усе гэтыя пачуцці ў мяне настолькі праніклі, што з'явіўся праект «Беларускія прымаўкі». Мастаком-пастаноўшчыкам на ім працавала Ала Мацюшэўская. Вялікі дзякуй этна-трыа «Тройца», якая прыняла дзейсны ўдзел.

Праект задумваўся як тэлевізійны, але пакуль няма дамоўленасцяў «Беларусьфільма» і тэлебачання наконт яго лёсу — мультык жа не танны. Аднак і беларускі фальклор — рэч дарагая. Гэта той момант, калі кажуць: гандаль тут не да месца!

Эпізод 4, дарагі

Але самае галоўнае наша багацце — гэта таленавітыя людзі, якія ствараюць цудоўныя фільмы. Сапраўды мастацкія — што «Чароўная лаўка» Алены Пяткевіч, што «Казіная хатка» Марыны Карпавай, якая працавала ў рамках расійскага (!) праекта «Гара самацветаў». Што тыя, якія ствараюцца ў Мінску на незалежных студыях, што зробленыя на «Беларусьфільме». Жартаўлівыя, асветніцкія, сур'ёзныя, для душы... З душой створаныя — бо акрабатычныя цуды часам патрабуюцца ад аўтара, які працуе ў складанай тэхніцы класічнай перакладкі, як Ірына Кадзюкова. За свае высокамастацкія і высокадухоўныя мультфільмы яна неаднаразова была адзначана прызамі на вельмі прэстыжных фестывалях свету. Разам з мастаком-пастаноўшчыкам Дзмітрыем Сурыновічам Ірына Кадзюкова стварыла фільм пра гісторыю святых Пятра і Фяўронні.

Аляксандр Ленкін, аўтар серыяла пра прыгоды хлопчыка-іншапланецяніна распавядае пра сакрэты сучаснай анімацыі:

— Калі беларуская анімацыя нараджалася, у нас былі іншыя тэхналогіі. А 30 гадоў таму анімацыя рабілася ўручную. Ёсць традыцыйная анімацыя — класічная перакладка, калі пад станком нараджаецца рух, нейкія сцэны. (У гэтай тэхніцы зроблены славуты «Вожык у тумане», у ёй працуе Пятроў, які атрымаў «Оскара». — **Аўт.**) Аднак сёння шмат што з'яўляецца ў вялікай ступені дзякуючы камп'ютару, у тэхніцы так званай камп'ютарнай перакладкі, але яна таксама вымагае вялікага майстэрства.

Аніматары называюць сваё мастацтва самым чароўным і запатрабаваным кіно. Напэўна, яно не ляжыць на паліцах, таму што яго сапраўды хочацца глядзець і пераглядаць. І нездарма ж у многім дзякуючы працы мультыплікатараў «Беларусьфільм» ведаюць у свеце. Вось бы яшчэ ведаць, дзе і калі нашы мультфільмы паказваюць на радзіме. І не толькі раз на год, падчас прэзентацыі новых прац у Доме кіно.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Аднымі медыкаментамі артэрыяльную гіпертэнзію не перамагчы

36,6°

У Беларусі налічваецца прыкладна 1,3 млн чалавек з павышаным артэрыяльным ціскам. Прычым 40—45 працэнтаў з іх — людзі з высокай і вельмі высокай рызыкай развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў, паведаміла загадчыца лабараторыі артэрыяльнай гіпертэнзіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Таццяна НЯЧОСАВА.

Паводле яе слоў, ад гэтай немачы пакутуе ад 30 да 40 працэнтаў дарослага насельніцтва ва ўсіх развітых краінах свету. І, на жаль, паводле прагнозаў спецыялістаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, іх колькасць з кожным годам будзе павялічвацца.

Як расказала Таццяна Нячосава, адна з прычын развіцця артэрыяльнай гіпертэнзіі — генетычная схільнасць, якая, як правіла, узмацняецца яшчэ і знешнімі фактарамі: псіхаэмацыянальныя нагрузкі, якія пастаянна павялічваюцца, маларухомы лад жыцця, лішняя вага, курэнне, высокі ўзровень халестэрыну, няправільнае харчаванне — перавага тлустай, вострай і салёнай ежы.

Акрамя гэтага, апошнім часам спецыялісты ўсё часцей выдзяляюць такі фактар развіцця артэрыяльнай гіпертэнзіі, як стрэс. А нядаўна расійскія вучоныя нават увялі ў карыстанне новы тэрмін — «захворванне эканамічнага крызісу», прычым гэта хвароба характарызуецца дзвюма асноўнымі прыкметамі: павышэннем артэрыяльнага ціску і трывожнасцю. Да высокага ціску могуць прывесці таксама іншыя хваробы чалавека, напрыклад захворванні нырак або шчытападобнай залозы.

У Беларусі на дыспансэрным уліку знаходзяцца 864 тыс. 300 пацыентаў з артэрыяльнай гіпертэнзіяй. Аднак выявіць захворванне — яшчэ палова справы. Эфектыўнасць лячэння залежыць і ад таго, наколькі правільна яно было прызначана, і ад таго, як пацыент выконвае рэкамендацыі ўрача. У 2008 годзе ў Беларусі было праведзена сацдаследаванне з мэтай вывучэння прыхільнасці саміх пацыентаў з артэрыяльнай гіпертэнзіяй да прызначанай тэрапіі, а таксама веданя ўрачамі міжнародных і нацыянальных рэкамендацый па лячэнні гэтага захворвання і таго, як яны рэалізуюць веды на практыцы.

Вынікі апытання паказалі, што беларускія ўрачы ў поўным аб'ёме ведаюць сучасныя міжнародныя рэкамендацыі і выкарыстоўваюць іх. Аналіз жа анкетавання саміх пацыентаў паказаў, што 86 працэнтаў хворых з павышаным артэрыяльным ціскам маюць дома танометры. Але самакантроль артэрыяльнага ціску пастаянна ажыццяўляюць прыкладна 55 працэнтаў пацыентаў, 41 працэнт — эпізадычна, 4 працэнты — увогуле не мераюць ціск. Штодзень прымаюць прэпараты 64 працэнты апытаных, а вось 16,6 працэнта хворых прымаюць іх толькі пры дрэнным самаадчуванні. Дарэчы, такі варыянт лячэння з'яўляецца самым небяспечным: ён можа стаць прычынай парушэння мазгавога кровазвароту.

На жаль, практычна ні адзін з апытаных пацыентаў, якія пакутуюць ад артэрыяльнай гіпертэнзіі, не назваў галоўнай умовай лячэння хваробы змяненне ладу жыцця. Большасць рэцыпіентаў звязваюць эфектыўнасць лячэння толькі з медыкаментозным лячэннем і адказнасць за сваё здароўе скільныя перакладваць на плечы ўрачоў.

Аднымі медыкаментамі артэрыяльную гіпертэнзію не перамагчы, лічыць Таццяна Нячосава. «Калі хворы не хоча займацца сабой, не сочыць за вагой, узроўнем халестэрыну і г.д., пазбегнуць сардэчна-сасудзістых захворванняў складана. Чалавек павінен усвядоміць прычыну сваёй хваробы і змагацца з ёй, разумеючы, што здароўе — самае галоўнае ў жыцці», — рэзюмавала спецыяліст.

Вольга ШВАЙКО, БЕЛТА.

«Лепш у мяне забралі б машыну!»

Беражы жыццё!

П'яны чалавек і «абаранак» аўтамабіля — рэчы несумяшчальныя. Гэта чорным па белым напісана ў правілах дарожнага руху, пра гэта ведае кожны школьнік, і бабулькі на лавачцы, абмяркоўваючы гора суседкі, сыходзячца на меркаванні, што «добры быў хлопец, вось толькі выпіць любіў. А пасля — не б дома ціхенька спаць, дык ён пачынаў, бы з ланцуга сарваўшыся, гарцаваць на машыне. Вось і даездзіўся»...

«Адчапіся! Гэта маё жыццё», — не раз даводзілася чуць падобныя словы падчас сваркі. Што ж тычыцца п'яных кіроўцаў, то яны, акрамя таго, што рызыкуюць сваім жыццём, дык яшчэ і робяцца забойцамі ні ў чым не вінаватых людзей. **Толькі летась па віне нецвярозых кіроўцаў загінуў 271 чалавек.**

На дарозе страчваць і маці, і бацьку, і сына, і дачку, пад коламі аўтамабіля гінуць цэлыя сем'і... А яны маглі б жыць, радаваць поспехамі сваіх блізкіх, прыносіць карысць грамадству.

На днях у Маладзечне 24-гадовы кіроўца мікрааўтобуса п'яны выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з аўтамабілем «Мазда». У выніку загінуў кіроўца іншаматкі і яго жонка, якая сядзела побач. Іх 21-гадовая дачка знаходзіцца ў цяжкім стане ў бальніцы.

— Малады чалавек нават не змог пракаментаваць, як адбылося здарэнне, бо проста гэтага не памятаў, — гаворыць **намеснік начальніка УДАІ МУС Беларусі Максім ПАДБЯРОЗКІН**. — Я цвёрда перакананы, што да такіх злачынцаў, па віне якіх загінулі людзі, павінны прымяняцца больш жорсткія меры пакарання, чым наяўныя (на сёння верхняя мяжа за аўтатранспартнае злачынства — сем гадоў пазбаўлення волі).

Акрамя таго, Максім Падбярозкін адзначыў, што мікраўтобус, на якім рухаўся парушальнік, быў ім украдзены з прадпрыемства. Узнікае пытанне: няўжо работнікі не звярнулі ўвагі на з'яўленне на тэрыторыі прадпрыемства нецвярозага чалавека з вуліцы? Чым думаў яго пасажыр, калі дазволіў знаёмаму выехаць на дарогу?

— Аднымі заканадаўчымі актамі, як і аднымі намаганнямі работнікаў Дзяржаўтаінспекцыі, праблему вырашыць складана, — падкрэсліў мой суразмоўца. — Трэба каб да барацьбы са свавольствам на дарозе падключыліся працоўныя калектывы. А людзі, замест таго, каб толькі абмяркоўваць і асуджаць п'яных кіроўцаў, пачалі рэальна змагацца за жыцці сваіх блізкіх.

— Максім Міхайлавіч, вось вы сказалі, што шукаеце паплечнікаў у барацьбе з п'янымі кіроўцамі. Што ў сілах зрабіць звычайны чалавек?

— Кожны кіраўнік павінен падтрымліваць цесную сувязь з супрацоўнікам міліцыі, які замацаваны за яго прадпрыемствам. Парушыў работнік закон — неадкладна трэба даць яму прынцыповую ацэнку, у тым ліку і на месцы працы. Калі ж правапарушальнік адчуе слабінку, то пішы прапала. «Сышло адзін раз з рук, міне і другі», — будзе думаць ён. Але больш за ўсё засмучае абыякавасць блізкіх людзей, сяброў. У якасці ілюстрацыі прывяду надзённую сітуацыю. Муж прыйшоў з працы п'яны. Жонка пачала крычаць на яго. Ён — у адказ. Пасварыліся. Мужчына адразу ж хапаецца за ключы. Выходзіць, садзіцца за руль і едзе куды вочы глядзяць. І самае цікавае, што родныя не паведамляюць аб гэтым у органы міліцыі. Хоць трэба біць у званы! **Бо чалавек пасля ўжывання спіртных напояў не можа адэкватна ацэньваць дарожную сітуацыю, арыентавацца ў дарожных абставінах, якія могуць змяніцца ў кожную хвіліну. Лепш папярэдзіць бяду (паведаміць па тэлефоне 102, каб прыехаў наряд міліцыі), чым дапусціць, каб ваш блізкі чалавек загінуў сам ці забіў ні ў чым не вінаватых людзей.**

Нярэдка чужыя людзі самі падпіхваюць чалавека на злачынства.

У гэтым супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі перакананыя на свае вочы падчас правядзення эксперыменту на Віцебшчыне.

— Да машыны, паблізу якой стаяла кампанія маладых людзей, падышоў міліцыянер у грамадзянскай форме, — расказвае Максім Падбярозкін. — Ён увайшоў у вобраз настолькі п'янага чалавека, які нават не можа трапіць ключом у замок дзвярэй, каб адчыніць машыну. Мінакі асуджальна ківалі галавой і працягвалі свой шлях, а маладыя людзі аж за жываты трымаліся ад смеху... Пакуль сярод «гледачоў» не знайшоўся смяльчак, які, замест таго, каб выклікаць міліцыю, дапамог «акцёру» не толькі справіцца з дзвярыма, але і завесці машыну. Усе стаялі з адкрытымі ратамі і чакалі працягу спектакля.

Вось гэта насцярожвае больш за ўсё. Пакуль ёсць людзі, якія падпіхваюць чалавека на здзяйсненне злачынства ці на смерць, складана будзе навесці парадак. Нам трэба разам прыйсці да таго, каб у грамадстве падобныя факты выклікалі не абыякавасць і ўсмешку, а непрыняцце.

Фота БЕЛТА.

Канфіскацыя аўтамабіля: «за» і «супраць»

Ужо даўно хадзілі чуткі наконт таго, што будзе павялічана адказнасць у дачыненні да п'яных кіроўцаў. Нарэшце Міністэрства юстыцыі Беларусі распрацавала адпаведны праект нарматыўнага акта. Ён зараз знаходзіцца на ўзгодненні ў зацікаўленых дзяржаўных органах. Мяркуецца, што за паўторнае на працягу года пасля прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці кіраванне транспартным сродкам нападпітку будзе канфіскоўвацца аўтамабіль.

Намеснік начальніка УДАІ МУС Беларусі Максім ПАДБЯРОЗКІН:

— Калі чалавек нават пасля таго, як аднойчы панёс адказнасць, зноў свядома садзіцца за руль пад градусам, то хто гарантуе, што ён не зробіць гэта і ў трэці, і ў чацвёрты раз. Таму лічу, што трэба пазбавіць яго спакусы сесці за руль і стаць патэнцыйным забойцам — канфіскаваць аўтамабіль.

Але не заўсёды злосны парушальнік закону рухаецца на сваім транспартным сродку. Таму трэба ўсім разам выпрацаваць механізм прыняцця рашэння ў такой сітуацыі (магчыма вінаваты павінен будзе выплаціць суму грошай, эквівалентную кошту машыны). Але аб гэтым гаварыць рана, бо сам механізм яшчэ толькі прапрацоўваецца, усе зацікаўленыя ведамствы будуць уносіць свае прапановы, і па вынніках разгляду гэтых прапаноў (і з улікам меркавання жыхароў рэспублікі) будзе выпрацавана нейкае рашэнне.

Намеснік генеральнага пракурора Беларусі Аляксандр ЛАШЫН:

— Я сам чуў, як п'яны вадзіцель, які на пешаходным пераходзе збіў маці з дзяўчынкай, падчас сустрэчы з журналістамі сказаў: «Забраў бы ў мяне першы раз суд гэту машыну, я б піў, але за руль бы не сеў». Гэта прызнанне яшчэ раз пацвярджае неабходнасць унясення зменаў у заканадаўства. Забіраць аўтамабілі ў нецвярозых вадзіцеляў, на мой погляд, азначэнна неабходна, каб яны адчувалі большую адказнасць. Я асабіста лічу, што трэба канфіскоўваць транспартныя сродкі ў п'яных вадзіцеляў незалежна ад таго, каму аўтамабіль належыць. І няхай пасля ўладальнік аўтамабіля разбіраецца ў грамадзянскім судзе з тым, каму ён даверыў ключы.

Павел, кіроўца са стажам:

— Я супраць прымусовай канфіскацыі. Няхай бы суд прызначаў суму штрафу, якая б адпавядала кошту аўтамабіля. А вінаваты сам вырашаў, плаціць грашыма ці, калі няма чым заплаціць, аддаць машыну. Акрамя таго, калі я даў сваяку ці сябру машыну, каб праведаць бацькоў, а ён у гасцях выпіў і вяртаўся дадому «падшафэ», то чаму забіраць будуць маю машыну? Ён няхай і разбіраецца. Іншая сітуацыя, калі я даверыў ключы п'янаму чалавеку — выступіў саўдзельнікам злачынцы, то тут можна казаць і аб канфіскацыі.

Паважаныя чытачы, свае меркаванні і прапановы наконт увядзення такой меры адказнасці, як канфіскацыя аўтамабіля можна накіроўваць на адрас рэдакцыі нашай газеты, а таксама на адрас Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь (220004, г. Мінск, вуліца Калектарная, 10, E-mail: kanc@minjust.by).

Надзея ДРЫЛА.

РУП «Белспецконтракт»

проводит 6-й открытый аукцион по продаже объектов республиканской собственности 19 мая 2009 года

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/ наработка в м/ч	Начальная цена продажи объекта (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
21.	Грузовой Урал-4320, ш. 065232, дв. 988276	войсковой части 61732, н.п. Цель, Осиповичского района	1986	134880	10 000 000	1 000 000
22.	Грузовой КамАЗ-43105, ш. 006906, дв. 863182	войсковой части 48668 г. Ст. Дороги	1986	35680	15 000 000	1 500 000
23.	Грузовой КамАЗ-43105, ш. 0017057, дв. 201437	войсковой части 48668 г. Ст. Дороги	1988	186794	13 000 000	1 300 000
24.	Грузовой КамАЗ-43106, ш. 0005437, дв. 312873	войсковой части 48668 г. Ст. Дороги	1990	112355	10 000 000	1 000 000

6-й аукцион состоится в 11.00 19 мая 2009 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, РУП «Белспецконтракт».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 15 мая 2009 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца. 2, комн. 604, РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 19 мая 2009 года.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Денежные средства перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: р/с 3012008660018 в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. Без НДС.

Справки по тел.: (017) тел./факс 224 88 05, 224 54 15.
Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com.

Антыкрызісная эканоміка

«Гэта не яйкі Фабержэ, гэта нашы шакаладныя велікодныя яйкі»

Сёлета, як ніколі, выставе-кірмашу «Брэст. Садружнасць» паспрыяла надвор'е. На плошчы каля лядовага палаца і лёгкаатлетычнага манежа гандлёвыя палаткі, экспазіцыя сельскагаспадарчай і іншай тэхнікі, будаўнічых матэрыялаў працавалі зранку. А ў выставачных павільёнах вытворцы як найлепш выстаўлялі і афармлялі свой тавар. Сёлета разам з вялікімі прадпрыемствамі заўважаны невялічкія прыватныя фірмы, фермерскія гаспадаркі.

На ўваходзе ў першую залу выставы адразу звярнуў на сябе ўвагу стэнд «Брэстхлебпрама». За разнастайнасцю відаў хлеба, булачак, пірагоў, печыва ўвагу прыцягвалі аграмадныя велікодныя яйкі, упрыгожаныя кветкавымі кампазіцыямі. Першае, што сарвалася з вуснаў: «Адкуль такія яйкі Фабержэ?» І тут жа голас у адказ: «Гэта не яйкі Фабержэ. Гэта нашы шакаладныя яйкі». Намеснік генеральнага дырэктара прадпрыемства па якасці Надзея Мукасей з здавальненнем расказала, што зрабіла гэтую прыгажосць з чыстага шакаладу брэсцкі кандытар Ганна Міхайлоўская. Яшчэ Надзея Адамаўна паведаміла, як прадпрыемствы аб'ядноўваюць, так бы мовіць, свой адказ крызісу. Паўсюдна распрацоўваюцца новыя ўзоры прадукцыі. На Баранавіцкім хлебазаводзе ўкаранілі ў вытворчасць шакаладную глазуру. Цяпер не давядзецца купляць такі патрэбны кампанент за межамі вобласці ўсім прадпрыемствам канцэрна. А на выставу баранавіцкія кандытары прывезлі незвычайны пірог з карамельнымі лебедзямі. Столінскія хлебапёкі асвоілі вытворчасць мяккай вафлі, на рынку прадаюцца такія вырабы пад назвай венскія вафелькі. Цяпер будуць свае. Кобрынскія калегі столінцаў таксама абяцаюць пацешыць новымі прысмакамі на аснове вафель, але пакуль не раскрываюць сакрэт, якімі.

Падчас адкрыцця выставы губернатар Брэстчыны Канстанцін Сумар вітаў усіх яе ўдзельнікаў, шматлікіх замежных гасцей. Добрае слова ў адрас форуму таксама прагучала ад кіраўнікоў адміністрацый Валынскай і Цярнопальскай абласцей Украіны, прадстаўнікоў Люблінскага ваяводства Польшчы, парламента Чэхіі, урада Масквы. Выстава працягнецца яшчэ тры дні. Пачаў работу таксама інвестыцыйны форум, на які прыехала 250 удзельнікаў з 16 краін свету.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Крупнейшее предприятие «Белрыба»
в связи с расширением производства в г. Браславе
ПРИГЛАШАЕТ НА РАБОТУ:
- СМЕННОГО МАСТЕРА ЦЕХА;
- ИНЖЕНЕРА ПО ОБОРУДОВАНИЮ С В/О;
- ОБРАБОТЧИКОВ МОРЕПРОДУКТОВ.

Достойная заработная плата; система премий и поощрений; доброжелательный коллектив; лояльный руководитель; хорошие условия труда.

УНП 190000166
Тел.: (8 02153) 31 5 16, 31 2 70

ЖЫЦЦЁ НАПРАКАТ

Кошты пунктаў пракату маніторыла Настасся ЗАНЬКО

Свая кішэня

Лямпавыя тэлевізары і пішучыя машынкі

Заходзіш у Дом пракату па вуліцы Куйбышава і нібыта вяртаешся на дваццаць гадоў таму. Старыя лямпавыя тэлевізары, відэамагнітафоны, пральныя машыны-малюткі. Разам з лямпавымі тэлевізарамі стаяць і больш «маладыя» мадэлі. І гэта ўсё таксама можна ўзяць напракат. Асартымент досыць вялікі, такія ж вялікія і разбежкі па кошце. У прэйскуранце Дома пракату значацца чорна-белыя тэлевізары тыпу «Верас» і «Юность», якія каштуюць ад 3600 да 16 500 рублёў у месяц. Кошт каляровых тэлевізараў вар'іруецца да 24 600 рублёў у месяц, у асноўным гэта тэлевізары айчыннай вытворчасці.

Можна ўзяць напракат халадзільнік (ад 15 000 да 33 000 рублёў) і маразільнік (ад 27 000 да 34 800 рублёў), пральную машыну (7200 рублёў), мікрахвалевую печ (19 500 рублёў), абагравальнік (17 700 рублёў), а таксама іншыя бытавыя прыборы. Калі захочацца панастальгаваць, кошт на месяц касетнага магнітафона — 5100 і відэамагнітафона — 25 800 рублёў, а фотаапарата — 20 700 рублёў. Сучасная тэхніка каштуе не нашмат даражэй: пракат DVD-плэера будзе 27 000 рублёў у месяц.

Калі вы актыўны спартыўны чалавек, то на экіпіроўку турыста на суткі вы патраціце мінімальна 7060: заплечнік (ад 1150 да 1760 рублёў), палатка (ад 2600 да 4290 рублёў), спальнік (3310). Калі ў вас веласіпедная прагулка, то кошт дарослага веласіпеда «Аист» складзе ад 8530 рублёў, дзіцячага трохколавага — 1130. Надзіманыя матрацы каштуюць 970 рублёў за суткі, гумавыя лодкі — ад 7230 да 12 720 рублёў, таксама за суткі. На роліках можна пакатацца за 6 220 рублёў за суткі. Узяць з сабой бадмінтон абыдзецца 530 рублёў за суткі.

Кошт музычных інструментаў вар'іруецца ад 9000 у месяц за акардэон, баян, да 17 400 рублёў за піяніна «Беларусь».

Напракат можна ўзяць халадзільнік (ад 15 000 да 33 000 рублёў у месяц) і маразільнік (ад 27 000 да 34 800 рублёў), пральную машыну (7200 рублёў), мікрахвалевую печ (19 500 рублёў), абагравальнік (17 700 рублёў), а таксама іншыя бытавыя прыборы.

Згодна з прэйскурантам можна ўзяць напракат нават пішучую машынку (ад 12 900 да 14 700 рублёў за месяц) і ложак-тумбу (21 600 рублёў).

Для дзяцей ёсць ложкі, хадункі, вагі, каляскі і г.д, для нямоглых дарослых — спецыяльныя хадункі, кастылі.

— Лямпавыя тэлевізары ў нас зараз не бяруць, таму што мадэлі састарэлі, а так яны працуюць і ўсё нармальна, а пішучых машынак у нас у наяўнасці няма, — кажуць у пракаце прадаўцы.

Другі дом пракату, які я наведала, размяшчаецца на вуліцы Казінца. Асартымент тут нашмат меншы, чым на Куйбышава. Палову памяшкання займаюць піяніна: каліські тут быў пракат музычных інструментаў.

— Нашы кліенты — гэта ў асноўным студэнты, пенсіянеры, навасёлы, маладыя, а таксама малазабяспечаныя сем'і, — кажа Ганна Бабкова, прыёмшчык Дома пракату па вуліцы Казінца. — Напрыклад, у чалавека тэлевізар зламаўся, а пакуль ён купіць іншы, можа ўзяць напракат. Зараз стала больш складана. Магчыма, з-за крызіснай сітуацыі. Людзі тлумачаць гэта тым, што ім радзей плацяць зарплату. Раней быў аванс — зарплата, а зараз ледзь у зарплату ўкладваюцца, і многім яе затрымліваюць. Таму ў нас неяк пакуль дрэнна з выручкай. А раней яна была большая. Кожны дзень мы здавалі амаль мільён. Што для нашага пракату дастаткова шмат. У нас ёсць людзі, якія вельмі доўга карыстаюцца нашымі паслугамі. Такім людзям дазволена выкупляць па дамоўленым кошце рэчы, якімі яны карысталіся.

Вясельная сукенка і аўтамабіль з шафёрам

У адрозненне ад дзяржаўных дамоў пракату, якія займаюць прапануюць самы разнастайны асартымент рэчаў — ад халадзільніка да піяніна, прыватныя называюцца «салонамі» і маюць вузкую спецыялізацыю. Яны ў асноўным займаюцца пракатам аднаго-двух відаў рэчаў. І менавіта тых, якія нельга знайсці ў дзяржаўных дамах пракату.

Напрыклад, сетка салонаў пракату аднаго з мінскіх прадпрымальнікаў прапануе дзіцячыя рэчы, а таксама будаўнічыя інструменты. Кошт дзіцячых вагаў вар'іруецца ад 35 000 да 40 000 рублёў у месяц.

Прыватныя пункты пракату прапануюць стацыянарныя камп'ютары і ноўтбукі. Гэта пераважна мадэлі Pentium 3. Кошт звычайнага камп'ютара складае 80 000 рублёў у месяц і 20 000 у суткі, ноўтбука — 135 000 і 35 000 рублёў адпаведна. Для параўнання: месячная выплата па крэдыце на сярэдні ноўтбук складае каля 180 000 рублёў у месяц. Праз год рэч будзе ваша!

Пракат выпускных, вясельных і вячэрніх сукенак вясной становіцца досыць актуальным. Кошты тут вар'іруюцца ад 20 да 120 у.а. за суткі. Калі ж салон будзе шыць сукенку па вашых параметрах і вы першая будзеце браць яе напракат, то мінімальны кошт павялічыцца да 50 у.а. за суткі. Па прызнанні прадаўца аднаго з салонаў, у іх суткі — паняцце ўмоўнае.

— Можаце ўзяць сукенку ў чацвер вечарам, а ў панядзелак вярнуць. І заплаціце за адны суткі.

Пракат аўтамабіля залежыць ад класа і маркі. Кошт, напрыклад, «Пежо» будзе вар'іравацца ад 46 да 90 у.а. за суткі. Пры ўмове, што вы самі сядзеце за руль «жалезнага каня». З шафёрам аўтамабіль будзе каштаваць плюс ад 14 да 26 у.а. за гадзіну. Можна таксама ўзяць напракат мінівэн або мікрааўтобус.

Захаваліся і салоны пракату дыскаў і відэакасет. Кошт адных сутак складае 2500, серыялы даюцца на двое сутак па такой жа цане.

У сталіцы можна знайсці прыватны пракат прычэпаў да аўтамабіляў, горных веласіпедаў і да т.п.

Пракат выпускных, вясельных і вячэрніх сукенак вясной становіцца досыць актуальным. Кошты тут вар'іруюцца ад 20 да 120 у.а. за суткі. Калі ж салон будзе шыць сукенку па вашых параметрах і вы першая будзеце браць яе напракат, то мінімальны кошт павялічыцца да 50 у.а. за суткі.

Аляксей Пятровіч, дырэктар ПСУП «Беленус», якое займаецца пракатным бізнэсам:

— Звычайна ў пункт пракату звяртаюцца два кліенты ў дзень. Папулярнасцю карыстаюцца рэчы для дзяцей і інструменты. Колькасць кліентаў з пачатку крызісу знізілася прыкладна на 30 працэнтаў. Я гэта звязваю са спыненнем пакупак новых кватэр і, як вынік, адсутнасцю рамонтных прац. З дзіцячым асартыментам прыкладна такая ж сітуацыя. Тыя, хто раней мог дазволіць сабе шалі напракат для таго, каб сачыць за вагой дзіцяці дзеля асабістай цікавасці, зараз бяруць іх толькі па парадзе ўрача. Пасля дэвальвацыі ў нас падняліся коштры ў сувязі з тым, што салоны пракату размешчаны на кірмашах з высокай арэнднай платай, якая разлічваецца, выходзячы з еўра. Акрамя таго, у пракаце мы выкарыстоўваем рэчы імпартнай вытворчасці, кошты на якія таксама падняліся пасля дэвальвацыі. Узнаўляць жа фонд давядзецца ўжо па новых коштах. Да крызісу можна было весці прыбытковы бізнэс, сёння ж рэнтабельнасць наблізілася да нуля. У нашай сферы прыбытак залежыць ад пакупной здольнасці грамадзян, а зараз яна вельмі нізкая.

Прасцей купіць

— Насамрэч, узяць рэч напракат лягчэй, чым набыць яе адразу, асабліва для студэнта, якому складана адразу выкласці вялікую суму, — кажа Дар'я Гуштын, студэнтка БДУ. — Мы ўдзвюх з суседкай узялі напракат халадзільнік. Зараз у месяц плацім 23 000 рублёў, а бралі на пачатку года за 21 тысячу. Гэта нямала, асабліва для студэнта. Я думала, што яны значна таннейшыя. Але ад халадзільніка як адмовішся? Канешне, больш выгадна назбіраць грошай і набыць такі ж халадзільнік. Яму ж гадоў дваццаць ужо. Увогуле, прасунутыя студэнты не бяруць рэчы напракат, яны праглядаюць розныя аб'явы кшталту «Аддам задарма» ў інтэрнэце і газетах.

Абітурыент-2009

ПРАФЕСІЙНЫ АРЫЕНЦІР АД «ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ»

Вызначыцца, якім прафесійным шляхам рухацца далей, выпускнікам 2009 года дапаможа даведнік для абітурыентаў сярэдніх спецыяльных навучальных установаў, выпушчаны выдавецтвам «Вышэйшая школа».

Даведнік, які выйшаў накладам 8 тысяч асобнікаў, утрымлівае правілы прыёму ў ССНУ, найбольш поўную і ўдакладненую інфармацыю аб формах навучання, спецыяльнасцях і спецыялізацыях, кваліфікацыі, якую можна атрымаць па выніках навучання, тэрмінах навучання, уступных іспытах, прахадным бале ў мінулым годзе, арыенціровачным плане прыёму, арыенціровачным кошце навучання, а таксама магчымасці атрымаць месца ў студэнцкім інтэрнаце. Пазначаны ў даведніку і спецыяльнасці, на якія прымаюцца асобы з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, а таксама змешчаны новыя праграмы ўступных іспытаў на 2009 год.

Надзея НІКАЛАЕВА.

БЕЛАРУСКІЯ ВІТАМІНЫ: швейцарская якасць па даступнай цане

Купляй сваё!

Тэмп сучаснага жыцця няспынна паскараецца. У сувязі з бясконцымі стрэсамі і высокім узроўнем псіхічнай нагрузкі патрабаванні да арганізма чалавека павышаюцца — асабліва ў перыяд фінансава-эканамічнага крызісу. Для таго, каб з годнасцю супрацьстаяць яго наступствам, мы павінны — апроч іншага — быць здаровымі. Адзін з важных кампанентаў моцнага здароўя — штодзённае забеспячэнне арганізма ўсімі неабходнымі вітамінамі і мінераламі, аднак дасягнуць балансу выключна за кошт прадуктаў харчавання надзвычай складана. Самае простае і эфектыўнае рашэнне — прыём вітамінна-мінеральных комплексаў. Ужо летам айчынныя вытворцы парадуюць спажыўцоў дзясяткам адпаведных прафілактычных прэпаратаў пад гандлёвай маркай «Унівіт». На паліцах аптэк з'явіцца беларускія вітаміны для жанчын, для мужчын, для падлеткаў, універсальныя вітаміны, вітаміны прыгажосці і г.д. Па якасці яны не саступаюць заходнім аналагам, а цана іх будзе даступнай для большасці беларускага насельніцтва.

... Да апошняга часу прафілактычных вітамінных прэпаратаў выраблялася ў Беларусі вельмі мала. Іх доля на ўнутраным рынку не перавышала некалькі працэнтаў. Адзіны вытворца (прыватнае прадпрыемства «Вітус», якое спецыялізуецца на хуткарастваральных полівітамінных комплексах) не мог задаволіць усе патрэбы беларусаў, таму львіную долю сегмента занялі амерыканскія і расійскія фірмы. Па падліках спецыялістаў, беларускі рынак вітамінных прафілактычных прэпаратаў сёння ацэньваецца ў 20 мільёнаў долараў. І большая частка гэтых грошай па-ранейшаму «выходзіць» з краіны.

Для выпраўлення сітуацыі год таму кіраўнік дзяржавы паставіў перад айчыннымі навукоўцамі задачу арганізаваць маштабную вытворчасць айчынных прафілактычных вітамінных прэпаратаў, каб на сто працэнтаў задаволіць патрэбы краіны. Пры Акадэміі навук было створана вопытна-прамысловае прадпрыемства «Акадэмфарм», якое ў самы бліжэйшы час выпусціць на рынак цэлую лінейку новых вітамінна-мінеральных прэпаратаў і метабалічных комплексаў пад гандлёвай маркай «Унівіт».

— Усе прэпараты створаны па арыгінальнай рэцэптуры на аснове апошніх распрацовак айчынных навукоўцаў, — патлумачыў **дырэктар Інстытута фармакалогіі і біяхіміі НАН Беларусі Дзмітрый РАМАНОЎСКІ**. — Яны вылучаюцца аптымальна збалансаваным утрыманнем вітамінаў і мінералаў, неабходных для забеспячэння нармальнага метабалізму. Без перабольшвання можна сцвярджаць, што вітамінна-мінеральныя комплексы «Унівіт» — гэта лепшае, што было створана чалавецтвам у азначаным кірунку за апошні час, і сёння прынесена на беларускі рынак. Гэта швейцарская якасць па беларускай цане.

...Лекавыя сродкі з'яўляюцца стратэгічным таварам. Ад іх шмат у чым залежыць стан здароўя нацыі і поспех медыцынскай практыкі. Акрамя таго, лекавыя і прафілактычныя прэпараты — гэта рэальны артыкул даходаў дзяржавы. Аднак для таго, каб можна было весці размову аб сур'ёзных прыбытках, нашай краіне неабходна развіваць уласную хімічную індустрыю. Пакуль што большасць неабходных субстанцый (кампанентаў) беларускія фармацэўтычныя прадпрыемствы экспартуюць з-за мяжы. Напрыклад, для вітамінна-мінеральных комплексаў «Унівіт» сыравіну пастаўляюць Германія, Швейцарыя і Індыя.

— Гістарычна так склалася, што яшчэ ў СССР фармацэўтычная прамысловасць была дастаткова слабай, — развівае тэму Дзмітрый Раманоўскі. — На тэрыторыі Саюза не было буйных хіміка-фармацэўтычных заводаў, якія маглі б забяспечваць поўны цыкл — ад хімічнага сінтэзу да выпуску гатовага прэпарата. Большасць прадпрыемстваў сінтэзу знаходзілася ў сяброўскіх сацыялістычных краінах — Венгрыі, Славакіі, Харватыі, Польшчы. Пасля распаду Саюза высветлілася, што ўласнай хімічнай індустрыі для фармацэўтыкі ў нас няма. Стварыць такую індустрыю — актуальная для Беларусі задача, але вырашыць яе «знаскоку» складана. Увогуле, беларуская фармацэўтычная прамысловасць мае вялікі рэсурс росту. Сёння прадпрыемствы толькі канцэрна «Белбіяфарм» вырабляюць лекаў у год на суму каля 130 мільёнаў долараў (прычым на ўнутраным рынку застаецца толькі палова, 50 працэнтаў ідзе на экспарт). Ёмістасць беларускага рынку лекавых прэпаратаў сёння складае каля 500 мільёнаў долараў, а рэальны патэнцыял фармацэўтычнай прамысловасці для Беларусі можна абазначыць лічбай 1 мільярд долараў. Столькі магла б выпускаць наша айчынная прамысловасць, але для гэтага патрэбны інавацыі, якія з'яўляюцца залогам паспяховага развіцця любой галіны вытворчасці.

Пра тое, якім прарывам для нацыянальнай фармакалагічнай індустрыі можа стаць адна ўдалая распрацоўка, сведчыць досвед харвацкай фармацэўтычнай кампаніі «PLIVA». Сусветную вядомасць яна заваявала дзякуючы свайму інавацыйнаму прэпарату сумамед (азітраміцын), які паказаў выключную эфектыўнасць пры лячэнні інфекцыйных захворванняў і запаленняў. Правільнае пазіцыяніраванне яго на рынку дазволіла кампаніі атрымаць салідны прыбытак. Пачынаючы з 70-х, у свеце штогод прадаецца сумамеду на адзін мільярд долараў.

Кітай і Індыя сёння маюць шматганажную вытворчасць лекавых сродкаў. Ёсць азіяцкія фірмы, якія цалкам забяспечваюць патрэбы сусветнага рынку ў пэўным прэпараце.

— Нельга сказаць, што гэта недасягальна і для Беларусі, — адзначыў Дзмітрый Раманоўскі, — але для гэтага патрэбны значныя намаганні і вялікія інтэлектуальныя патэнцыі. Фармакалогія і фармацэўтыка застануцца запатрабаванымі на многія дзесяцігоддзі. У перспектыве Беларусь можа стаць такім жа вытворцам лекаў, як Харватыя ці Швейцарыя. Калі ў нас з'явіцца адпаведная нацыянальная задача, лекі з Беларусі могуць стаць такім жа брэндам, як і беларуская тэхніка.

Асартымент прадпрыемства «Акадэмфарм» не будзе абмежаваны толькі вітамінамі. Да канца гэтага года на рынку з'явіцца цэлая група метабалічных рэгулятараў: прэпараты для ўмацавання здароўя мужчын, для нармалізацыі вагі цела, для паляпшэння работы мозгу і павышэння працаздольнасці, прэпараты, якія паніжаюць рызыку развіцця сардэчна-сасудзістых, анкалагічных захворванняў і г.д.

Інга МІНДАЛЁВА.

БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 апреля 2009 года
ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»
220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 8
(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2009 г.	01.04.2008 г.
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	10 736,2	6 073,1
3	Средства в Национальном банке	1102	8 747,2	8 555,5
4	Ценные бумаги:	1103	2 904,8	0,0
	для торговли	11031	2 904,8	0,0
	удерживаемые до погашения	11032	0,0	0,0
	в наличии для продажи	11033	0,0	0,0
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	23 680,8	13 204,1
6	Кредиты клиентам	1106	68 252,8	60 006,0
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	0,0	0,0
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	25 075,1	18 022,7
9	Прочие активы	1109	1 392,5	1 495,5
10	**ИТОГО активы**	**110**	**140 789,4**	**107 356,9**
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
12	Средства Национального банка	1202	1 991,9	0,0
13	Кредиты и другие средства банков	1205	11 326,2	9 672,9
14	Средства клиентов	1206	75 455,8	59 562,5
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	5 534,1	64,1
16	Прочие обязательства	1209	3 754,8	3 534,4
17	**ВСЕГО обязательства**	**120**	**98 062,8**	**72 833,9**
18	**КАПИТАЛ**			
19	Уставный фонд	1211	19 989,1	16 864,4
20	Эмиссионные разницы	1212	0,0	0,0
21	Резервный фонд	1213	3 018,8	2 550,2
22	Накопленная прибыль	1214	5 581,9	4 763,2
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	14 136,8	10 345,2
24	**ВСЕГО капитал**	**121**	**42 726,6**	**34 523,0**
25	**ИТОГО обязательства и капитал**	**12**	**140 789,4**	**107 356,9**
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**			
27	Требования	1301	49 447,5	29 656,8
28	Обязательства	1302	31 866,7	18 328,1

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2009 года
ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»
(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2009 г.	01.04.2008 г.
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	3 906,0	2 428,3
2	Процентные расходы	2012	2 201,3	1 144,4
3	**Чистые процентные доходы**	**201**	**1 704,7**	**1 283,9**
4	Комиссионные доходы	2021	2 099,1	1 823,1
5	Комиссионные расходы	2022	148,8	87,2
6	**Чистые комиссионные доходы**	**202**	**1 950,3**	**1 735,9**
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	852,6	865,6
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	3,5	-4,0
9	Доход в форме дивидендов	205	0,0	0,0
10	Чистые отчисления в резервы	206	-49,5	-0,7
11	Прочие доходы	207	974,7	1 171,7
12	Операционные расходы	208	3 551,0	3 427,0
13	Прочие расходы	209	440,8	174,4
14	Налог на прибыль	210	491,3	550,2
15	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**	**1 052,2**	**902,2**

И.о. Председателя Правления **Д.М. Богуш**
Главный бухгалтер **Н.А. Кузьмицкая**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 20 от 13.11.2008 г. УНП 100195493. ОАО «Белорусский Индустриальный Банк».

Погляд

ПАСЛЯ ЗІМЫ ЖУРАВІНЫ СМАЧНЫЯ, але танныя

Летась закуплялі...

Збіраўся зімой у Любашава, што на Ганцаўшчыне, каб паглядзець, як у гэтую пару года людзі ідуць на балота па журавіны. Чырвоныя ягада на лапіках снегу — даволі прывабная карціна.

Але не выпала: то снегу было па калена, то ішлі дажджы...

Патэлефанаваў старшыні Любашаўскага сельсавета Уладзіміру Гардзею і пачуў:

— А журавіны ў нас і вясной збіраюць. Не так масава, як восенню, але ідуць на балота. Найперш тыя, хто не мае працы і хоча зарабіць нейкі рубель. Праўда, і цана за ягаду невысокая — крыху большая за дзве тысячы... Не сезон, хоць сваю якасць журавіны пасля зімы і не страцілі.

Лічыцца, што калі ягада зімой перамерзне, то становіцца смачнейшай — не такой кіслай і пры гэтым усе вітаміны застаюцца ў журавінах.

Але чаму за ягады плацяць не пяць тысяч, як у сезон, а толькі паўцаны?

Праблема тут са збытам. На рынку ў Баранавічах можна журавіны паспрабаваць прадаць і па больш высокай цане. Даводзілася бачыць, як з тым слоікам ягад стаяць людзі (чамусьці на вочы трапляліся найперш, мужчыны), але пакупнікоў мала. Паназіраў нейкі час і не прыкмеціў, каб нехта журавінамі пацікавіўся.

Ды няхай чалавек і прадасць некалькі кілаграмаў тых ягад на рынку, але улічваючы кошт білета з Ганцавічаў да Баранавічаў, прыбытку асаблівага няма. Іншая справа — здаць журавіны нарыхтоўшчыку оптам: дзесяць кілаграмаў прынёс з балота і атрымаў грошы. Цяганіны менш, а 20-25 тысяч рублёў — таксама заробак.

А як з журавінамі ў мясцовым райспажыўтаварыстве?

Адказвае намеснік старшыні па нарыхтоўках Аляксандр Ермаковіч:

— Пра закупку нашай арганізацыяй журавін не можа ісці гаворкі. Летась мы купілі ў насельніцтва 200 тон журавін — больш за ўсіх на Брэстчыне. Але на сёння ў нас засталася 41 тона гэтай ягады, і няма надзеі яе збыць. Ужо паўтара месяца возім на машыне журавіны ў Мінск, і калі ўдасца прадаць дзве скрынкі, то гэта добра.

Абзваніў усе перапрацоўчыя прадпрыемствы Беларусі, на многіх сам пабываў — журавіны там не патрэбныя. Ды і па вобласці не прададзена спажыўкааперацыяй 250 тон журавін. Крызіс даецца ў знакі і былыя пакупнікі чакаюць.

Вось такая сітуацыя. Выходзіць, калі прыватнік плаціць дзве тысячы за кілаграм, то па сённяшнім часе — гэта добра.

Не ясна, як будзе ісці нарыхтоўка ягад у сезон. Знойдуцца пакупнікі на чарніцы з журавінамі ці нават па нізкай цане яны не будуць нікому патрэбныя?

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

В публикации бухгалтерского баланса ЗАСО «Белнефтестрах» (газета «Звязда» № 66 от 9.04.2009 г.) достоверность баланса и отчета о финансовых результатах составлена и подтверждена ОДО «Промаудит».

ПЫТАННЕ НА ПАЎМІЛЬЁНА

У Беларусі з'явіўся свой элітарны клуб знаўцаў

...Памятаеце дзіцячую гульню — «так» і «не» не гаварыць, чорны з белым не насіць? У дарослых усё наадварот, ва ўсякім разе, калі гаворка датычыцца элітарнага клуба знаўцаў і гульні «Што? Дзе? Калі?». Чорная (або чорна-белая) вопратка тут абавязковая не толькі для знаўцаў, але і для ўсіх прысутных на гульні, а адказы на мудрагелістыя пытанні трэба фармуляваць настолькі дакладна, каб на пытанне вядучага: «Вы ўпэўнены ў сваім адказе?» з чыстым сумленнем адказаць: «Так».

На гэтым тыдні тэлеканал АНТ прадстаўляе гледачам першую серыю беларускіх гульняў «Што? Дзе? Калі?». Падобныя нацыянальныя версіі ўжо былі знятыя, напрыклад, у Грузіі, ва Украіне і ў Азербайджане, цяпер ліцэнзію на вытворчасць праекта набыла і Беларусь. А нам удалося пабываць на адной з першых гульняў — з удзелам каманды Андрэя Супрановіча, самай маладой у беларускім элітарным клубе знаўцаў.

Як Ойча наш

Чорна-белы дрэс-код — гэта не капрыз арганізатараў, аднак абавязковая ўмова гульні. У ёй увогуле ўсё распісана дакладна. Гледачам нельга гучна перагаворвацца — па-першае, каб не адцягваць увагу гульцоў, за спінамі якіх стаіць публіка, па-другое, каб увесь гэты фонавы шум не перашкаджаў гукарэжысёрам — памяшканне для гульні зусім невялікае, мікрафонаў шмат, чутны літаральна кожны гук. Не вітаюцца жавальныя гумкі — нізавошта не ўгадаеш, у які момант аператар павернецца да цябе, а потым тлумач знаёмым, чаму ты на экране з перакошаным тварам. «І калі адчуеце, што страчваеце прытомнасць, пастарайцеся зрабіць гэта ціха, незаўважна — суседзі, калі гэта ўбачыце, падхапіце дзяўчыну пад рукі, а потым акуратна вынесіце на свежае паветра», — папярэдзіў рэдактар тэлегульні Павел Забаўскі. Мы пасмяяліся, але, як высветлілася, дарэмна. Хоць у мінскай студыі не так спякотна і душна, як, напрыклад, у бакінскай, але падобныя выпадкі былі. Як былі і надзвычай рассеяныя госці, якія ўмудрыліся згубіць у студыі некалькі завушніц, бранзалет і нават... крэдытную картку. «Шкада, што на ёй не аказалася грошай», — жартуе хтосьці з публікі, але тут жа ўсе робяцца сур'ёзнымі — каманда займае месцы за сталом.

На стале — 13 сектараў з пытаннямі: тузін дасланы па пошце гледачамі, адзін — «Эксперт» — падрыхтаваны спонсарамі гульні. Кажуць, ён адзін з найбольш складаных. Але і гледачы не промах — пераканацца ў гэтым можна, уключыўшы вечарам АНТ і паглядзеўшы чарговую гульню. Нават калі вядучы прадстаўляе «пытанне задае студэнт з Мар'інай Горкі», узровень складанасці гэтага пытання можа быць зусім не студэнцкі! І спрачайся потым колькі хочаш аб тым, што на пытанне «для чаго?» нельга адказаць «грыфы злятаюцца на пах» — калі фармулёўка адказу недакладная, жаданае ачко — і 500 тысяч рублёў, між іншым — атрымліваe аўтар пытання. Некалькі разоў каманда Андрэя Супрановіча на гэтых недакладных фармулёўках якраз і зрэзалася, давялося нават браць адзіную наяўную падказку — дапамогу клуба — каб вывесці канчатковы лік 5:6 на карысць знаўцаў. А калі нехта палічыць гэты вынік слабенькім, бо ён сам, седзячы дома перад тэлевізарам, шчоўкаў тыя пытанні, як арэшкі, — хачу нагадаць прапісную ісціну: атмасфера на гульні зусім не тая, што на канапе, часам ад напружання літаральна звініць у паветры...

Па-за кадрам

Зрэшты, узгаданую гульню прыхільнікі «Што? Дзе? Калі?» напэўна бачылі, таму постфактум разбіраць палёты не мае сэнсу. Лепш раскажам пра тое, што не пакажуць па тэлевізару.

Пакой, дзе адбываецца гульня, — гэта і не пакой зусім. Уся прыгажосць з люстэркамі, насценнымі лямпамі, вялікімі дзвярыма — гэта насамрэч дэкарацыі пасярод студыі. Між іншым, па памерах скапіраваныя з такіх жа дэкарацый у Нясумным садзе, 6х8 м з дакладнасцю да сантыметра.

Беларускія знаўцы падчас гульні сядзяць на звычайных офісных крэслах. Толькі колцы ў крэслаў абматаныя клейкай стужкай, каб не каталіся туды-сюды, а стаялі надзейна на адным месцы.

Асобная дэтэктыўная гісторыя звязаная з ваўчком, стрэлка якога паказвае на чарговае пытанне для гульні. Як расказаў аўтар праекта, вядучы беларускага «Што? Дзе? Калі?» Алесь Мухін, «у крамах, пра якія мы ведалі, ужо амаль нічога не было, таму на заводзе забралі літаральна апошнія ваўчкі — 5 штук, і знайшлі адзінага майстра, які шмат гадоў перарабляе ваўчкі менавіта для тэлеклуба. Бо паміж дзіцячым і тэлевізійным ваўчком ёсць невялікія адрозненні — напрыклад, унутры павінен быць жакей на кані, а сам ваўчок крыху цяжэйшы».

Цяжка было знайсці і гонг, прычым з такім пытаннем сутыкнуліся не толькі беларусы, але і ўкраінцы, і азербайджанцы. Яшчэ два абавязковыя элементы — чорную скрыню (тры штукі розных памераў) і знак музычнай паўзы — зрабілі на АНТ, дакладна скапіраваўшы маскоўскі ўзор. «Мы старалiся, каб людзі, якія будуць глядзець праект, сказалі — гэта цікава, гэта як у Маскве», — заўважае Алесь, ведаючы звычку тэлегледачоў парацца — і яму, і гульні. Барыс Крук, напрыклад, паказаўся толькі на 8-м годзе вядзення праграмы...

Арыя замежнага госця

За гульнёй моладзевай зборнай назіралі не толькі беларусы, але і прыезджыя госці, у тым ліку вядомы тэлевядучы, бард, трохразовы ўладальнік «Хрустальнай савы» і ўладальнік «Брыльянтавай савы» Барыс Бурда. Усміхаўся, хмурыўся, у падказцы «Дапамога клуба» праявіў сябе актыўней за ўсіх — словам, калі б знаўцы часцей падымалі вочы ад стала, то па эмацыянальнай рэакцыі Барыса Аскаравіча маглі б угадаць і даць значна больш правільных адказаў.

Бліц для Алеся МУХІНА:

Што (будзе галоўным прызам)?

— Хрустальная сава, безумоўна. Па праграме імпартазамяшчэння саву мы знайшлі тут, у Беларусі *(смяецца)*. Але дзе канкрэтна — сакрэт фірмы. Яна вельмі прыгожая — сядзіць на пяньку, па якім зроблены памятны надпіс. Па памерах наша сава крыху меншая, чым у маскоўскім клубе, таму мы яе называем малой хрустальнай савой. Адразу даваць вялікую саву беларускім знаўцам — або гледачам, як атрымаецца — я лічу, няправільна; трэба пачынаць з малога. Бо ў нас усё толькі пачынаецца.

Дзе (жывуць самыя разумныя знаўцы)?

— Моцных гульцоў хапае паўсюдна. Мяне яшчэ падчас адбору вельмі парадаваў Гродзенскі рэгіён, там аказалася вельмі моцная школа. Мы думаем, калі такія прыемныя адкрыцці будуць і далей, пяройдзем на рэгіянальны прынцып — будуць гуляць каманды з абласцей.

Калі (будуць наступныя гульні)?

— Мы вырашылі зламаць стэрэатып: у гледачоў праграма «Што? Дзе? Калі?» асацыюецца з суботнім вечарам, калі многія ўжо клююць носам. А беларускія гульні будуць выходзіць у самы рэйтынгавы час, серыямі па пяць гульняў. Плануем, што сёлета будуць знятыя яшчэ некалькі серый, але з датамі наступных гульняў пытанне яшчэ адкрытае.

раўноўваць мясцовы тэлепраект з маскоўскім.

Чаму, адказваючы на пытанне ці падтрымліваючы дыялог з вядучым, знаўцы глядзяць на экраны з лікам гульні, як быццам звяртаюцца да нябачнага бажаства? Адказ просты: адразу пад экранамі над сталом прымацаваныя мікрафоны. А вось ганаровым гасцям і прадстаўнікам спонсараў, адзін з якіх абараняе інтарэсы гульцоў, другі — гледачоў, уздымаць галовы так высока не трэба — некалькі высокаадчувальных мікрафонаў звісаюць са столі.

Вядучы ж сапраўды нябачны — але сядзіць ён не на другім паверсе, а ў асобным пакоі, адкуль адсочвае гульню па маніторах. На яго, дарэчы, правіла «чорнае і белае насіць» не распаўсюджваецца — пакуль што выходзіць у студыю да знаўцаў Алесь Мухін не збіраецца, лічыць, што да гэтага трэба

— Барыс Аскаравіч, як вам убачанае? Вядучы гульні выказаў меркаванне, што маладой камандзе не хапіла ўпэўненасці ва ўласных сілах...

— Гэта, па-мойму, абсалютна правільна з дакладнасцю наадварот. Каманду падвяла неверагодная ўпэўненасць у сваёй геніяльнасці і самазадаволенасць. Гэта маладыя, здольныя гульцы, якія могуць сябе выдатна паказаць, калі зразумеюць, што яны не багі і нават не анёлы. Я, калі вельмі рэзка выказаўся аб іх, меў на мэце не пакрыўдзіць іх, але прымусіць сабрацца і думаць, а не браць з ходу пытанне, палічыўшы яго празмерна простым. Думаць, разважаць — гэта няпроста, але калі б яны не пачалі гэта рабіць, то не пераадолелі б сябе і не пераламілі б ход гульні. А рахунак 6:5 заўжды добры, хто б ні перамог. Давайце не будзем засмучацца з-за няўдач маладых гульцоў — галоўнае, каб яны самі зразумелі, што яны не перамаглі, не паказалі сябе як каманда. У некаторых могуць быць бліскучыя шанцы і вялікая будучыня, але ўстрэсванне ім проста неабходнае.

— Яшчэ адно пытанне — наконт вядучага. На ваш погляд, наколькі манера Алеся Мухіна адрозніваецца ад звыклай гледачам манеры вядзення гульні маскоўскага клуба?

— Правільным адказам будзе — адрозніваецца. І гэта самае галоўнае. Бо не варта спрабаваць быць другім Барысам Круком і, крый божа, другім Уладзімірам Варашылавым — у нас быў першы, не трэба падробак пад яго. Вядучы — як сілы прыроды, як лёс, павінен быць то мяккім, то жорсткім; каб гульня была падобная на жыццё, роля вышэйшых сілаў у ёй цалкам належыць вядучаму. Алесь Мухін павінен быць не кімсьці другім, а першым Мухіным. І, мне здаецца, гэта ў яго атрымліваецца, уражанне ад яго работы цалкам пазітыўнае.

З першых вуснаў

— Па шматгадовым назіранні за гульнёй склалася ўражанне, што вядучы гульні — гэта дастаткова з'едлівая асоба, строгі, часам нават прыдзірлівы да гульцоў. А вы, наадварот, стараліся дапамагчы знаўцам, падштурхнуць да правільнага адказу... Свядома выбіралі такі вобраз? — цікавімся ў Алеся Мухіна адразу пасля гульні.

— Ведаеце, я лічу, што самы правільны вобраз — той, які адпавядае псіхалогіі вядучага, яго жыццёваму вопыту. Я спецыяльна не выпрацоўваў форму вядзення гульні, стасункаў са знаўцамі. Натуральна, вядучы не можа быць цалкам бесстаронны, але, напэўна, вы звярнулі ўвагу — калі знаўцы хапалі сутнасць пытання, нягледзячы на некаторыя недакладнасці, ім быў залічаны правільны адказ, а калі яны мяне не чулі і ўпіраліся ў свой варыянт, я прысуджаў ачко гледачам...

— Маладой камандзе вы далі своечасовую і, магчыма, нават вырашальную параду. Якія парады можаце даць, як капітан каманды ШДК, будучым гульцам, якія яшчэ будуць праходзіць адборы?

— Напэўна, дам дзве парады. Людзі, якія хочуць гуляць у «Што? Дзе? Калі?», павінны не баяцца паказацца дурнямі, абмяркоўваючы свае развагі ўслых. Бо розум мы можам паказаць толькі дзеянямі, а ў гульні гэта — абмеркаванне пытання. Усе мы ўнутры інтэлектуальныя людзі, важна толькі накіраваць свой інтэлект у патрэбны бок, у дадзеным выпадку — выявіць вонкі. Што датычыцца капітана, тут адваротная парада: капітан не павінен імкнуцца быць або здавацца самым разумным чалавекам у камандзе, ён павінен задаваць дурныя пытанні: «А чаму вы лічыце так? А што ёсць у гэтай краіне?» і г.д. А яшчэ ён павінен быць вельмі ўпэўненым у сабе і рашучым чалавекам, каб сумець настаяць на сваім пункце гледжання і даць яго ў якасці правільнага адказу. Увогуле, дзверы ў тэлеклуб у нас для ўсіх адчыненыя — ужо прайшлі адбор каля 500 чалавек, будуць яшчэ адборы, так што — спрабуйце!

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота аўтара.

БЫЛЫ МІЛІЦЭЙСКІ НАЧАЛЬНІК ПАДАЗРАЕЦЦА Ў КАРУПЦЫІ

Былы начальнік Баранавіцкага аддзела дэпартамента аховы МУС Беларусі падазраецца ў карупцыі. Пра гэта паведаміла старшы памочнік пракурора Брэсцкай вобласці Вольга Дзмітрук: «Ён падазраецца ў тым, што незаконна, насуперак інтарэсам службы, з карыслівай і іншай асабістай зацікаўленасці прыцягваў падпарадкаваных яму работнікаў да выканання ў працоўны час будаўнічых і іншых работ для сябе асабіста і сваіх родных». 31 сакавіка гэтага года падазроны быў звольнены з органаў МУС за парушэнне службовай дысцыпліны. Крымінальную справу прыняў да сваёй вытворчасці следчы па найважнейшых справах пракуратуры Брэсцкай вобласці.

Кар. БЕЛТА.

Усміхнёмся!

Паводка. Эмчээсаўцы ратуюць людзей, здымаючы іх з дахаў хат, з дрэў, з платоў. Тут выратавальнікі заўважаюць капялюш, які плавае па вадзе. Прычым плавае дзіўна — уздоўж плота туды-сюды.

— Што гэта?! — пытаюцца выратавальнікі.

— Ды гэта Пятровіч. Ён яшчэ ўчора сказаў: «Будзе заўтра дождж, не будзе — мне адна трасца. Па-любому буду араць...»

☺

Насуперак парадам вайскоўцаў, ніколі не заплюшчвайце вочы і не падайце нагамі ў бок ядзернага выбуху, бо ў любым выпадку вы бачыце гэта шоу першы і апошні раз у жыцці.

☺

Хлопец жаліцца прыяцелям:

— Мяне гэтыя каты дасталі! Мяў ды мяў... Я на іх ужо свайго сабаку выпускаў...

— І што каты?!

— Ды што каты... Шчанюкі нікому не патрэбныя.

☺

Выбары прэзідэнта Бразіліі прайшлі так напружана, што пераможцу давялося вызначаць па пенальці.

☺

У офісе гандлёвай фірмы з'яўляецца інтэлігентнага выгляду чалавек і проста з парога, радасна ўсміхаючыся, вітае ўсіх прысутных:

— Добры быў дзень! Я з падатковай...

НАДВОР'Е на заўтра



СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.06	20.13	14.07
Віцебск —	5.53	20.06	14.13
Магілёў —	5.57	20.03	14.06
Гомель —	5.57	19.57	14.00
Брэст —	6.22	20.28	14.06
Гродна —	6.26	20.25	13.59

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Фядоссі, Мікіты.*
К. *Ксеніі, Марыі, Юліі, Бенядзікта.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Дзве даты

16 красавіка

1619 год — надрукавана «Граматыка» Мялеція Сматрыцкага («Грамматики словенския правильное синтагма...»), архіепіскапа Полацкага і Віцебскага, якую Міхаіл Ламаносаў разам з «Арыфметыкай» Л. Магніцкага і «Псалтырыю рыфмотворной» Сімяона Полацкага называў «брамай сваёй вучонасці».

1934 год — ЦВК СССР сваім рашэннем устанавіў найвышэйшую ступень адзнакі: гаваровае званне Героя Савецкага Саюза. Гэтае званне за часы існавання СССР прысвоена 12 772 чалавекам, у тым ліку многім беларусам і ўраджэнцам Беларусі: толькі ў гады Вялікай Айчыннай вайны такім чынам былі ўзнагароджаны 448 нашых землякоў.

Цытата дня

«Тыя ж самыя сродкі, што робяць чалавека здольным разбагацець, перашкаджаюць яму атрымаць асалоду ад багацця».

Антуан Рыварольскі.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 — № 10 (299)

Забяспечым сябе цыбуляй-сеянкай

Мы ўжо прывыклі, што кожную вясну закупляем цыбулю-сеянку ў месцах продажу насення. І глебу падрыхтавалі па правілах, і падкормлівалі як належыць, а вось цыбуля пайшла ў стрэлкі, бо захоўвалі сеянку, відаць, не па правілах. Таму самае надзейнае — вырасціць свой пасадачны матэрыял, прычым неабавязкова захоўваць яго да вясны. Цыбуліны дыяметрам 1 см можна пасадзіць увосень, пад зіму, і на наступны год ужо ў ліпені ў вас будуць вялікія цыбуліны, якія добра выспеюць.

Каб мець свой пасадачны матэрыял да восені, ранняй вясной (у красавіку — пачатку мая) патрэбна правесці загушчаную сяўбу цыбулі. На 1 кв. м спатрэбіцца 8—10 г насення. Можна высяваць насенне любых гатункаў: Стрыгуноўскі мясцовы, Штутгартар рызен, Бяссонаўскі мясцовы і інш. Вось толькі паўднёвыя гатункі, напрыклад, Каба, могуць вымерзнуць.

Пры падрыхтоўцы глебы на 1 кв. м уносяць 30—35 г суперфасфату, 20—25 г калійных угнаенняў (лепш сульфат калію) і 10—15 г амічнай салетры. Для сяўбы рыхтуюць невысокія градкі (вышынёй 15—20 см). Робяцца неглыбокія баразёнкі так, каб паміж імі свабодна праходзіла матыка. Насенне высяваецца шырокай палосой (3—4 см), затым яго прысыпаюць слоем зямлі 1—1,5 см, якую трошкі трамбуюць і злёгку мульчыруюць торфам або перагноем. Мульча засцерагае глебу ад перасыхання, утварэння скарынкі, а ўсходы — ад замаразкаў.

Каб паскорыць з'яўленне ўсходаў, перад сяўбой насенне цыбулі суткі вытрымліваюць у вадзе, мяняючы яе 2—3 разы. Калі сеяць намоченым насеннем у вільготную зямлю, усходы з'яўляюцца на сёмы—восьмы дзень, сухое насенне прарастае праз два—тры тыдні.

Глебу рыхляць паміж радамі на глыбіню 4—5 см. Пасевы цыбулі сеянкі не падкормліваюць. Каб зберагчы расліны ад пашкоджанняў цыбульнай мухай, калі з'явіцца першы сапраўдны лісток, іх абпудрываюць сумессю тытунёвага пылу з вапнай у суадносінах 1:1 або апырскваюць 0,2—0,3-працэнтным растворам карбафосу.

Як толькі пачнуць палягаць лісты, сеянку выкопваюць з зямлі, раскладваюць на градцы і прасушваюць. З градкі плошчай 1,5—2 кв. м можна атрымаць столькі сеянкі, што яе будзе дастаткова, каб пасадзіць градку ў 15—20 кв. м.

Лепшыя папярэднікі для цыбулі — агуркі, кабачкі, гарох, таматы і зяленіўныя культуры, пад якія ўносілі арганічныя ўгнаенні.

Не варта размяшчаць цыбулю пасля капусты, якая нярэдка паражаецца бактэрыяльнымі захворваннямі, небяспечнымі і для цыбулі.

Свежы гной пад цыбулю не ўносяць, інакш расліны дрэнна растуць.

Перад пасадкай сеянку трэба прагрэць на працягу 8 гадзін пры тэмпературы 40—42 °С — гэта ў некаторай ступені засцеражэ ад з'яўлення стрэлак. Высаджваць цыбулю можна толькі тады, калі прагрэецца зямля і міне небяспека замаразкаў. Сеянку высаджваць на глыбіню 3 см.

Не спяшайцеся напоўніць кампоставую кучу

Вясной, як толькі сыдзе снег, паказваюцца парасткі дзьмухаўцу. Пакуль яны не паспелі падрасці, выкапайце карані, памыйце ў сцёкавай вадзе, не замочваючы, парэжце на кавалачкі і высушыце. Дзьмухавец — гэта сапраўдная скарбонка карысных рэчываў, пра якія чалавецтва ведала яшчэ ў глыбокай старажытнасці. Авіцэна лячыў сокам свежай расліны хворых на вадзянку і ўкушаных скарпіёнам. Сучасныя траўнікі выкарыстоўваюць яго карані ў якасці агульнаўмацавальнага, лёгкага жаўцягоннага і паслабляльнага сродку. Дзьмухавец нармалізуе абменныя працэсы ў арганізме, у выглядзе парашку карані прымаюць пры атэрасклерозе (сутачная доза 5 г сухога кораня, здробненага ў кавамолцы), але для дасягнення эфекту трэба прымаць некалькі месяцаў. Гэта расліна — незаменны кампанент у травяных зборах, што выкарыстоўваюцца пры лячэнні цукровага дыябету, захворванняў скуры.

Карані дзьмухаўцу змяшчаюць такую вялікую колькасць калію, таму ён павінен стаць «надзейнай апорай» любога сардэчніка. Адвар сухой травы выкарыстоўваецца пры захворваннях страўніка, утварэнні камянёў у жоўце- і мочавыводных шляхах.

Поліўка для раслін

Мала хто ведае, што выкарыстанне звычайнай рыбацкай юшкі ці рыбнага супу ў якасці фосфарных угнаенняў садзейнічае павышэнню ўраджаю на градках, асабліва там, дзе раслінам не хапае фосфару. Зразумела, для ўгнаенняў або падкормкі раслін не абавязкова браць цэлую рыбіну. Дастаткова і адходаў — касцей і лускі. Паварыце іх нядоўга — і поліўка для раслін гатовая. Фільтраваць яе не трэба.

Такую падкормку звычайна праводзяць пры пасадцы бульбы. На вядро вады — адзін літр поліўкі. Напрыклад, у час веснавых работ, калі замест гною ў пасадачныя ямы кладзецца кампост, яго трэба паліць рыбнай вадой. Спрактыкаваныя агароднікі кажуць, што вынік даволі ўражвае, таму што ўраджай раслін, падкормленых супам, атрымліваецца ў паўтара—два разы большы.

Трава ад дзевяноста хваробаў

У садзе на лекавай клумбе, а калі ў вас такой яшчэ няма, то ў найбліжэйшым лузе вы знойдзеце зверабой гравучы. Сваю ваяўнічую назву зверабой атрымаў не выпадкова: ім могуць атруціцца жывёлы, прычым белай масці ці белаплямістыя і толькі ў сонечныя дні. Ёсць у гэтай расліны яшчэ адна прыгожая назва: у Беларусі яе называюць святаяннікам. Лісты святаянніку яйкападобныя ці прадаўгаватыя, невялікія, характэрная іх прымета — шматлікія цёмныя і белыя крапінкі, якія густа засяваюць зялёныя ліставыя пласцінкі. Калі паглядзець на ліст святаянніку на святло, то ён здаецца нібы праколатым, ці працятым, за што святаяннік і атрымаў такую назву.

Святаяннік валодае ўнікальнымі лекавымі ўласцівасцямі, нездарма даўней яго называлі «травой ад дзевяноста хваробаў». Пра гэту расліну народныя лекары гаварылі: «Як нельга спячы хлеб без мукі, так без святаянніку нельга лячыць многія хваробы». Здаўна гэтай раслінай лячылі самыя розныя немачы. І цяпер настой п'юць пры прастудзе, хваробе сэрца і проста для ўмацавання арганізма, выкарыстоўваюць у якасці кроваспыняльнага сродку, прымочак пры гнойных ранах, апёках. Дзякуючы бальзамічнаму паху святаяннік можна выкарыстоўваць як прыправу.

Зараз усё большай папулярнасцю карыстаюцца кветкава-травяныя гарбаты, у склад якіх уваходзіць святаяннік. Так, напрыклад, завараная гарбата з высушаных лістоў суніц, ажыны, кіпрэю ляснога, маліны, кветак ліпы і святаянніку з дабаўленнем лістоў чорных парэчак і травы чабору валодае агульнаўмацавальным, крывацвторным і процісклератычным дзеянне, паляпшае абмен рэчываў, а па смаку і водару не саступае славутаму кітайскаму чаю. Святаяннік выкарыстоўваюць для прыгатавання танізавальнага напою «Байкал». З такімі ўнікальнымі ўласцівасцямі ён не застаўся незаўважаным і ў касметыцы.

Збярыце, нарыхтуйце святаяннік і выкарыстоўвайце па меры неабходнасці, а зрэзаныя і высушаныя пучкі травы ўпрыгожаць ваш дом.

Бульба па-бараўлянску

Колькі гадоў можна вырошчваць бульбу аднаго гатунку на адным і тым жа месцы? Вы, відаць, скажаце, што не больш за 3—4 гады, як і раяць вучоныя-спецыялісты ці дасведчаныя агароднікі, таму што бульба выраджаецца, гатунак лепш замяніць на іншы і, натуральна, лепш і месца памяняць. Шчыра кажучы, так думаю і я. Але не будзем спяшацца рабіць паспешлівыя высновы.

— Ужо дзевятнаццатую вясну я саджаю адзін і той жа гатунак бульбы на адным месцы, — кажа наш сталы чытач, які са «Звяздой» не разлучаецца з 1944 года, Сямяновіч Анастас Лявонцевіч. Жыве ён у пасёлку Бараўляны, што пад Мінскам.

У 1990 годзе пляменнік даў мех галандскай бульбы. Які гэта гатунак, не памятаем, але мы яе называем проста Галандкай. І з таго часу я толькі яе і саджу. І самае галоўнае, што клубні прыгожыя на выгляд, жоўценькія, разварыстыя. Вараная можа ляжаць хоць тыдзень, не мяняючы колеру.

— Саджу бульбу як мага раней, — кажа Анастас Лявонцевіч, — як толькі сыдзе снег і зямля крышачку прагрэецца. Сёлета ўжо 10 красавіка пасадка была завершана. І раней бы пасадзіў, у пачатку месяца, ды толькі згодна з месяцовым календаром з 4 па 7 красавіка ні садзіць, ні сеяць не рэкамендавалася. А ў мінулым годзе, калі вясна выдалася ранняя, бульба была пасаджана 15 сакавіка. Стараюся пасадзіць раней, таму што ў першай палове жніўня я ўжо ўбіраю агарод і сею рэдзьку алейную. Патрэбен час, каб яна зацвіла, а потым перакопваю, і вясной зямля — нібы пух. Ніякіх угнаенняў на свой участак не купляю, ні арганічных, ні мінеральных. Летам не бывае макрыцы, драцянік таксама не гуляе ў маёй бульбе. Так што з рэдзькай алейнай рай і для мяне, і для бульбы.

У агародзе бульбай занята ўсяго соткі чатыры, але хапае на тры сям'і. У Анастаса Лявонцевіча ў горадзе жывуць два сыны з сем'ямі, якія ядуць бульбу толькі з дзядулевага агарода. Відаць, лёгкая рука ў гаспадара, як часам у народзе кажуць.

Да майго прыходу на стол была пададзена смажаная бульба, жоўценькая апетытная, ад яе зыходзіў такі водар, што не пачаставацца было грэх. Рэцэпт прыгатавання бульбы «па-бараўлянску» гаспадар пакінуў у сакрэце.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 287 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.444 Індэкс 63850. Зак. № 2048. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ЧЫРВОНЫЯ ПЯТНІЦА І СУБОТА

Пятніцу і суботу перадвелікоднага тыдня беларусы назвалі Чырвонымі ад таго, што мянавіта ў гэтыя дні фарбавалі яйкі і выпякалі пасху. Пятніца на Перадвелікодным тыдні атрымала назву Вялікая, Красная, Чырвоная, Велікодная.

● У Перадвелікодную пятніцу, дзень, калі быў укрыжаваны Хрыстос, беларусы трымаліся самага строгага посту (ужываць ежу дазволена было толькі пажылым, дзецям і хворым).

● У Перадвелікодную пятніцу глядзелі на вуліцу праз вокны, прыкмячалі, каго ўбачаць першым:

— калі мужчыну, гэта прадказвала поспех на тры месяцы;

— калі сталую жанчыну, то тры месяцы будуць ісці па чарзе няўдачы з поспехам;

— калі маладую жанчыну — тры месяцы пройдуць без складаных праблем;

— калі сям'ю — да міру ў сям'і, да прымірэння тых, хто пасварыўся;

— калі сабаку — да тугі, ката — да прыбытку, птушку — да новага знаёмства і добрых вестак;

— інваліда — да смерці блізкага чалавека.

● Лічыцца, што калі чалавек захварэў у Перадвелікодную пятніцу (трапіў у бальніцу), то хутка стане на ногі.

● Гэтую замову трэба было чытаць у Перадвелікодную пятніцу, стаўшы на калені перад плашчаніцай Ісуса Хрыста, каб вяліся пчолы:

«Перад плашчаніцаю жаркую свячу палю і паліць буду, Госпада хваліў і хваліць буду. Госпада міласэрнага прашу і малю ўсімі нябеснымі сіламі: зарадзі, Госпадзі, вазможную, прэўкрасную дзявіцу-пчаліцу, вазмажы, вазрадуй, вазвесялі. Прашу Госпада міласэрнага не лі сябе, лі гасподнія божыя ахвяры: ва ўсі храмы гасподнія буду жаркія свечы паліць і тройськім пакланеннем пакланяцца, атныні да канца веку».

● Калі вы заўважылі, што ў вашай хаце робіцца штосьці дрэннае, то трэба ў Перадвелікодную пятніцу пайсці ў царкву і прынесці дадому недагарэўшую свечку, якая была ў вас у час набажэнства. Дома запаліце яе і абыдзіце ўсе пакоі: там, дзе свечка пачне моцна трашчаць, вы знойдзеце нейкую рэч, якая звычайна і з'яўляецца сурочанай.

● Прадказвалі, якім будзе надвор'е, па чатырох перадвелікодных днях: чацвер — вясна, пятніца — лета, субота — восень, нядзеля — зіма. Калі мокры чацвер, значыць і вясна будзе з дажджом, і г.д.

● Перадапошні дзень перад Вялікаднем называлі *Краснай, Велікоднай, Вялікай, Чырвонай суботай*. У некаторых рэгіёнах існавала такая назва — Таўкушчы дзень.

● Самай галоўнай і адказнай справай у Вялікую суботу было фарбаванне яек — сімвала Вялікадня.

● Увесь дзень да вечара ў цэрквах асвячаюць спецыяльныя велікодныя стравы. Іх уладкоўваюць на ручніках (абрусах), у куліч ставяць свечку, якую запальваюць перад пачаткам асвячэння. Адно з яек неабходна напалову абабраць, каб на яго трапіла асвечаная вада: «каб святасць лепш прайшла».

● Ручнік, на якім вы асвячалі куліч у час велікоднага набажэнства, добра дапамагае ад сурокаў, калі насіць яго на сабе.

● Згодна з народнымі ўяўленнямі, калі не спаць ноч на Вялікдзень, вы будзеце захаваныя ад хваробаў, забяспечыце сабе шчаслівы шлюб, багаты ўраджай і поспех.

Калі на ўсяночнай на Вялікдзень моцна трашчаць свечкі ў царкве, лета будзе з дажджом, з частым градам і маланкамі.

Дождж у велікодную ноч абяцае халоднае лета, а ціхае цёплае надвор'е — цёплае лета.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗВЯЗДА 16 красавіка 2009 г.

АДЗНАЧЫЎШЫ 60-ГОДДЗЕ, БЕЛАРУСКАЯ МІС НА ВАЧАХ МАЛАДЗЕЕ

Суразмоўца журналістаў «Звязды» — дырэктар Беларускай машынавыпрабавальнай станцыі Уладзімір Міхайлавіч БУРДЫКА

ЗНАЁМІМ З СУРАЗМОЎЦАМ. Уладзімір Міхайлавіч Бурдыка родам з Барысаўскага раёна. Закончыў знакаміты БІМСГ.

Пяць гадоў у саўгасе «Прамень» Капыльскага раёна на пасадзе галоўнага інжынера сталі добрай жыццёвай школай. Потым — праца ў Прыямінскім аддзяленні «Сельгастэхнікі» на «малой радзіме», і там жа ў «Сельгасхіміі», начальнікам механізаванага атрада. У 1985 годзе пераведзены ў Міністэрства сельскай гаспадаркі, дзе працаваў па 2003 год на пасадах ад інжынера да намесніка дырэктара дэпартамента па механізацыі і тэхнічным нагляду сельскай гаспадаркі. У 2003 годзе ўзначаліў Беларускую МІС.

Беларуская машынавыпрабавальная станцыя ў пасёлку Прывольны пад Мінскам *(больш звыклая абрэвіятура, якая стала шырока вядомым брэндам, — Беларуская МІС)* — адзіная ў краіне. Летась яна адсвяткавала сваё 60-годдзе. Была створана ў сістэме машынавыпрабавальных станцый Савецкага Саюза, якіх налічвалася 33. У сістэму ўваходзілі таксама два навукова-даследчыя інстытуты па выпрабаванні новай сельскагаспадарчай тэхнікі. У той час станцыя называлася Заходняй і з'яўлялася адной з вядучых. Тут праходзілі выпрабаванні машыны, якія распрацоўваліся канструктарскімі арганізацыямі вялікай дзяржавы для выкарыстання ў глебава-кліматычнай зоне Беларусі, у асноўным для пераўвільготненага клімату, тарфяна-балотных глебаў, а яшчэ для меліярацыйных работ. У рэспубліку пастаўляліся машыны, якія выраблялі заводамі Саюза, у тым ліку і беларускімі. Але з развалам СССР перад нашай краінай паўсталі новыя задачы — забеспячэнне патрэбаў аграпрамысловага комплексу сельскагаспадарчай тэхнікай уласнай вытворчасці.

— Я ў той час працаваў у Мінсельгасхарчы, з'яўляўся намеснікам начальніка Галоўнага ўпраўлення механізацыі і тэхнічнага прагрэсу і па абавязках службы займаўся развіццём уласнага машынабудавання, — расказвае **Уладзімір Міхайлавіч**. — Першая праблема, з якой тады сутыкнулася наша краіна, было забеспячэнне машынамі для апрацоўкі глебы, засмечанай камянямі. А раней так званыя камяністыя плугі выпускаліся толькі заводамі «Адэсагелбамаш» і «Алтайсельмаш». Мы спрабавалі дамовіцца з імі аб выпуску прадукцыі і для нас, я пабываў на абодвух гэтых заводах, але дасягнуць такога пагаднення не змаглі. У іх былі свае праблемы, і давялося ў Беларусі наладжваць уласную вытворчасць, у першую чаргу механізмаў для апрацоўкі глебы і сяўбы. У гэтым плане разгарнулася работа на Мінскім заводзе шасцерняў, на Аршанскім трактарарамонтным заводзе і ў Мінойтах.

Усе выпрабаванні праводзіліся ў нас, тут даваліся ацэнкі і заключэнні, рэкамендацыі аб вытворчасці з тым, каб агрэгаты забяспечвалі рэалізацыю прагрэсіўных тэхналогій вырошчвання сельскагаспадарчых культур у нашай краіне і былі канкурэнтаздольнымі на знешніх рынках. Каб былі больш якасныя, больш надзейныя і эканамічныя ў параўнанні з плугамі, якія выпускаліся раней. Калі такую ацэнку навінцы мы давалі, то агрэгат ставілі на паток.

Сёння гэта паспяховыя заводы, яны занялі сваю нішу на рынку і забяспечваюць сельскагаспадарчую вытворчасць не толькі Беларусі, але і пастаўляюць машыны расіянам.

Зараз працягваецца ўдасканаленне прадукцыі. Рэалізуецца шэраг праграм і Цэнтрам па механізацыі НАН Беларусі, і Аграрна-тэхнічным універсітэтам у плане стварэння больш надзейных, зносаўстойлівых рабочых органаў да гэтых плугоў. Лемех, долата, адвал патрэбна выпускаць больш дасканалымі, з большым рэсурсам. Такая задача пастаўлена Урадам, і нядаўна мы раблі справаздачу аб той рабоце, якая праведзена. У прыватнасці, Мінскім трактарным заводам, які аб'яднаў шэраг прадпрыемстваў — Мінскі завод шасцерняў, Смаргонскі завод і заняўся не толькі арганізацыяй вытворчасці плугоў, але і ўдасканаленнем рабочых органаў да іх і да іншых глебаапрацоўчых машын: культыватараў, сеялак, нажоў да касілак, для здрабнення кармоў.

Разам з завадчанамі мы развіваем на нашых прадпрыемствах не проста выпуск новых машын, а забяспечваем сельскагаспадарчую вытворчасць сучаснымі машынамі, вось што важна. Галоўная задача машынавыпрабавальнай станцыі — не дапусціць у вытворчасць тэхніку з недапрацаванай канструкцыяй, канструкцыйна недасканалую, эканамічна неэфектыўную і таму немэтазгодную.

Разам з вытворцамі займаліся механізацыяй апрацоўкі глебы, сяўбы, нарыхтоўкі кармоў. З цягам часу выйшлі на новы ўзровень задач. Спачатку, як вядома, «Гомсельмаш» спецыялізаваўся на выпуску машын для нарыхтоўкі кармоў. Але існуе такая сусветная практыка, што калі фірма выпускае машыны для нарыхтоўкі кармоў, то яна павінна выпускаць і збожжаўборачныя камбайны (гэта эканамічна апраўдана). Стаяў барабан, які рэжа, — паставілі іншы, які малоціць. Дасягаецца вялікая ступень уніфікацыі. Па гэтым шляху, па настойлівай просьбе Мінсельгасхарча, пайшоў і «Гомсельмаш», які наладзіў у рэспубліцы вытворчасць збожжаўборачных камбайнаў. Сёння выпускаецца поўны шлейф машын, яны забяспечваюць патрэбы сельскагаспадарчай вытворчасці Беларусі, мы закрылі патрэбнасць у такіх імпартных машынах. Пуцёўку ў жыццё гомельскім «стэпавым караблям» давала наша машынавыпрабавальная станцыя.

Якраз на прыкладзе «Гомсельмаша» відаць даволі эфектыўная сумесная работа па выпуску сучасных машын. І перад вытворцамі, і перад намі пастаўлена задача па стварэнні ўласнага беларускага «Ягуара». Вядома ж, праслаўлены прадукт фірмы «Клаас», як і іншыя лепшыя монамашыны для нарыхтоўкі кармоў, узяты як прататып, як прыклад для творчага паўтарэння. У гэтым кірунку ёсць пэўныя поспехі, ужо працуюць на палях рэспублікі прыкладна паўтары сотні машын КВК-800. Канструкцыя машыны ўдасканальваецца, ёсць ужо больш магутная КВК-800-16 (450 кс), і гэта не мяжа. Так што будзем забяспечаны сваімі машынамі і для нарыхтоўкі кармоў. І не толькі здрабняльнікамі. Патрэбны яшчэ і касілкі, і валкавацелі, і прэс-падборшчыкі, машыны для перавозкі рулонаў. Такая работа вядзецца таксама на «Бабруйскаграмашы», і на тым жа «Гомсельмашы», на іншых прадпрыемствах. Па сутнасці тэхналогія нарыхтоўкі кармоў у рэспубліцы поўнасцю машынізаваная.

Да слова, сёння краіна выпускае недзе 85-87 працэнтаў наменклатуры машын, неабходных для сельскагаспадарчай вытворчасці (у добрай памяці савецкія часы выпускалася толькі 13 працэнтаў). Вытворчасць асноўных відаў сельскагаспадарчых культур забяспечваюць беларускія машыны. Дасягаецца прамая эканомія ад імпартазамяшчэння і не меншая эканомія на абслугоўванні і сэрвісе. А яшчэ гэта працоўныя месцы для нашых людзей, заработная плата, падаткі ў дзяржаўную скарбонку і мясцовыя фонды.

Падчас нядаўняга наведвання Гомельскай вобласці кіраўнік краіны паставіў задачу шырэй забяспечыць унутраныя патрэбнасці Беларусі ў сельскагаспадарчай тэхніцы.

— Станцыя таксама, відаць, павінна ўвесь час перааснашчацца, каб паспяваць за развіццём машын?

— Перш за ўсё мець у сябе адпаведную базу, без якой немагчыма правільна ацэньваць новыя машыны. За апошнія пяць гадоў мы цалкам перааснасцілі свой парк трактароў — купілі ўвесь іх шлейф, правялі значную работу па перааснашчэнні выпрабавальным абсталяваннем, набылі новыя перасоўныя лабараторыі з тым, каб была магчымасць працаваць непасрэдна ў полі. І галоўныя выпрабаванні праводзім менавіта ў полі, у рэальных умовах эксплуатацыі.

Паралельна з гэтым вядзём работу па абнаўленні калектыву, па яго амаладжэнні. Прыходзяць новыя, высокаадукаваныя маладыя спецыялісты, якія цудоўна дапаўняюць касцяк з вопытных работнікаў-ветэранаў. Кожны год прымаем па 5-7 маладых спецыялістаў. Для таго, каб яны тут замацаваліся, засталіся працаваць, выдзяляем ім пакоі ў інтэрнаце. Вядзём перапланіроўку і мадэрнізацыю наяўных інтэрнатаў пад жыллё для маладых сем'яў. Так што за апошнія пяць гадоў мы значна памаладзелі.

Вядзём работу і па стварэнні належных умоў працы. Параўнайце: два-тры камп'ютары на ўсю МІС пяць гадоў таму і цэлы камп'ютарны парк зараз. Сёння для кожнага выпускніка ўніверсітэта, які прыходзіць да нас працаваць, — камп'ютар на стале, лічбавы фотаапарат, відэакамера з тым, каб ён мог усім гэтым карыстацца і больш эфектыўна працаваць у палявых умовах. І парк сучасных, надзвычай дасканалых вымяральных прыбораў.

Клапоцімся пра павышэнне матэрыяльнай зацікаўленасці. Замацаванню людзей садзейнічае неблагая для прыгараднага пасёлка заработная плата на ўзроўні мільёна ста тысяч рублёў. Мы выконваем не толькі тыя праграмы, якія фінансуюцца з бюджэту, але праводзім і пазабюджэтныя выпрабаванні — па дагаворах з прадпрыемствамі і прыватнымі фірмамі, і такім чынам зарабляем сродкі для далейшага развіцця. Аб'ёмы нашых паслуг кожны год растуць. Калі пяць гадоў таму яны складалі два з паловай мільярды, то цяпер перавышаюць пяць мільярдаў. У краіне ў апошнія гады развіваецца сельскагаспадарчае машынабудаванне, і нашымі заказчыкамі сталі не толькі такія знакамітыя калектывы, як «Гомсельмаш», але і Мінойтаўскі рамонтны завод, Калінкавіцкі рамонтны завод, Віцебскі матарарамонтны завод, Гомельскі «Агракамплект», які выпускае даільныя ўстаноўкі, альбо Брэсцкая «Прамтэхніка» і Нясвіжская «Сельгастэхніка», што выпускае ўстаноўкі для ахалоджвання малака, і іншыя.

Больш як 100 заводаў у рэспубліцы вырабляюць сельскагаспадарчую тэхніку. І мы нарошчваем аб'ёмы прыёмачных, перыядычных, кваліфікацыйных, сертыфікацыйных і іншых выпрабаванняў. Колькасць сертыфікацыйных расце кожны год, бо з'яўляемся не толькі выпрабавальным цэнтрам, але і органам па сертыфікацыі сельскагаспадарчай тэхнікі — вядзём яе выпрабаванні і выдаём сертыфікат адпаведнасці як на беларускія, так і на імпартныя машыны, што пастаўляюцца да нас у краіну. Тым самым бяром на сябе адказнасць за тое, што гэтыя машыны адпавядаюць дзейным у нашай краіне нарматыўна-прававым актам, патрабаванням па бяспецы яе выкарыстання.

Характэрна, што ў апошнія гады развіццё машынабудавання ў нас ідзе ў кааперацыі з замежнымі фірмамі. Гэта новая з'ява ў нашым жыцці, і яна сведчыць, што замежныя фірмы бачаць перспектыву ў развіцці сельскай гаспадаркі ў Беларусі і ідуць на сумесную, каапераваную вытворчасць з нашымі прадпрыемствамі. Разумная кааперацыя дае магчымасць выпускаць сучасныя машыны з выкарыстаннем камплектуючых частак замежнай вытворчасці, якія вызначаюць высокі тэхнічны ўзровень машыны і забяспечваюць больш эфектыўную і надзейную яе работу. Такі шлях падтрыманы і ўхвалены і Міністэрствам прамысловасці, і Урадам — шлях скааператванай, сумеснай вытворчасці. Па такім шляху пайшлі Шчучынскі рамонтны завод і Навукова-практычны цэнтр — для стварэння самаходных машын для ўборкі лёну. У гэтым канкрэтным выпадку супрацоўніцтва карыснае яшчэ і таму, што ў нас у рэспубліцы такога вопыту няма, а наладжванне сумеснай вытворчасці з вядучымі сусветнымі лідарамі «Дэпортэрам» (Бельгія), «Дэхонтам» (Францыя) дазволіць нам ужо ў гэтым годзе мець на палях сваёй краіны сучасныя самаходныя ільноўборачныя машыны.

З сусветным лідарам па бульбаўборачнай І бульбаапрацоўчай тэхніцы фірмай «Грыме» мы супрацоўнічаем у стварэнні машын для рэалізацыі тэхналогій вытворчасці бульбы і іншых машын. Дзякуючы гэтаму выпуск бульбасаджалак пачалі эксперыментальны завод Навукова-практычнага цэнтра па механізацыі і Мотавела. Ужо гэтай вясной Ураду будзе прадэманстравана тое новае, што робіцца на гэтых двух заводах. У прыватнасці, новыя саджалкі з адначасовай, за адзін праход, падрыхтоўкай глебы і пасадкай.

Для далейшага развіцця машынабудавання ў рэспубліцы карысным і эканамічна мэтазгодным стаў бы, лічым, пераход на ацэнку не асобных машын, а цалкам тэхналогій, тэхналагічных комплексаў машын з выхадам на канчатковы вынік. Пры падтрымцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і ў супрацоўніцтве з навукова-прамысловым цэнтрам НАН Беларусі мы такую задачу пачалі вырашаць. І сёлета паспрабуем першай ацэньваць тэхналогію вырошчвання бульбы.

Ацэнка ўсёй тэхналогіі з выхадам на сабекошт актуальна яшчэ і таму, што ўведзены новы паказчык — энергаэфектыўнасць. Новая тэхналогія павінна быць менш стратнай у сэнсе спажывання паліва, электрычнай і цеплавой энергіі. І мы вядзём ацэнку, наколькі тэхналогія, якая прапануецца, ці новая машына, комплекс машын больш эфектыўныя за ранейшыя.

— Пазнаёмце, калі ласка, са структурай МІС.

— Вядучае падраздзяленне — лабараторыя выпрабаванняў машын для вырошчвання, уборкі і пасляўборачнай апрацоўкі сельскагаспадарчых культур. Узначальвае яе надзвычай вопытны спецыяліст Уладзімір Вячаслававіч Казанскі. Адначасова з іншай тэхнікай яны займаюцца і выпрабаваннем збожжаўборачных камбайнаў. Сёння вельмі актуальным стала пытанне ацэнкі камбінаваных глебаапрацоўча-пасяўных машын для вырошчвання лёну вытворчасці Брэсцкага электрамеханічнага завода, Віцебскага матарарамонтнага завода і «Лідагрампраммаша». Машыны павінны быць універсальнымі — прымяняцца для пасеву як збожжавых культур, так і лёну. За зімовы перыяд іх канструкцыі былі дапрацаваны, і ў хуткім часе мы зможам правесці палявыя выпрабаванні, машыны да нас ужо паступілі і прайшлі стэндавыя выпрабаванні. А палявыя правядзём у льносеючых гаспадарках ці на землях ільнозаводаў.

Вялікую работу праводзіць лабараторыя выпрабаванняў машын для апрацоўкі глебы, унясення ўгнаенняў і абароны раслін, якой кіруе Яўген Якаўлевіч Грэк. Нам паступілі на выпрабаванні сучасныя машыны для ўнясення мінеральных угнаенняў вялікай грузападымальнасці, і гэтай вясной мы павінны праверыць іх у полі ў рэальных умовах эксплуатацыі. Акрамя таго тут працягваецца работа па ацэнцы рэсурсу рабочых органаў плугоў. Да яе прыцягнуты і вопытныя спецыялісты лабараторыі выпрабаванняў энергетычных, землярыйных, пагрузачных і транспартных сродкаў, меліяратыўных машын і энергаацэнкі сельгастэхнікі, якую ўзначальвае Аляксандр Уладзіміравіч Вашчула.

Як мы ўжо гаварылі, важныя задачы вырашае орган па сертыфікацыі сельскагаспадарчай тэхнікі і трактароў пад кіраўніцтвам намесніка дырэктара Аляксандра Вікенцьевіча Караткевіча. Праводзіцца вельмі вялікая работа па ацэнцы стану вытворчасці на прадпрыемствах і выдачы сертыфікатаў адпаведнасці на выпускаемыя машыны. А выдаюцца сертыфікаты на аснове пратаколаў выпрабаванняў лабараторыі ацэнкі бяспечнасці, эрганомікі і экалагічнасці сельскагаспадарчай тэхнікі, ёю кіруе Канстанцін Пятровіч Бычкоў, таксама адзін са старэйшых нашых работнікаў. Найважнейшая задача лабараторыі — дапусціць у вытворчасць толькі тыя машыны, што будуць цалкам бяспечнымі для жыцця і здароўя людзей, якія на іх будуць працаваць.

Значнае развіццё ў нашай бульбасеючай рэспубліцы атрымлівае цяпер вытворчасць машын для механізацыі бульбаводства і агародніцтва, таму мы ставім на гэтых напрамках задачу стварыць канкурэнтаздольныя машыны, якія б адпавядалі сучасным патрабаванням. Ужо ёсць першыя вынікі. Так, у гэтым годзе ў Беларусі будзе 15 новых бульбаўборачных камбайнаў, якія выпрабаваны ў нас. Ёсць і новыя бульбасаджалкі, якія таксама прайшлі ў нас выпрабаванні. Ёсць новыя бульбакучавыдзяляльнікі, якія таксама прайшлі ў нас выпрабаванні. Ёсць новыя бульбакучавыдзяляльнікі, якія таксама прайшлі ў нас выпрабаванні. Ёсць новыя бульбакучавыдзяляльнікі, якія таксама прайшлі ў нас выпрабаванні.

Дырэктар дакладвае С.С. СІДОРСКАМУ і членам Урада аб выніках выпрабаванняў новых камбінаваных глебаапрацоўча-пасяўных агрэгатаў.

— Такіх прыкладаў, на жаль, колькі заўгодна. Практычна па кожнай машыне, якая прадстаўляецца нам на выпрабаванні, мы даём да двух дзясяткаў заўваг распрацоўшчыку і вытворцу. Кожны дзень я знаёмлюся і падпісваю такія аналітычныя дакументы. Так што свой хлеб апраўдваем. Варта сказаць, заводы ахвотна ўносяць змены ў канструкцыю, а калі патрэбна, то і ў тэхналогію вытворчасці, таму што атрыманая ад нас інфармацыя толькі на карысць справе.

— Тым больш што вы бачыце тэндэнцыі, якія існуюць за мяжой.

— Мы наведваем выстаўкі ў Гановеры, бываем на замежных фірмах-вытворцах і бачым, чым Захад «дыхае». Там кожная фірма, кожнае прадпрыемства-вытворца выпускае не адну машыну, а набор машын. Знакаміты «Клаас», які выраблял збожжаўборачныя камбайны, кормакамбайны, касілкі, прэсы, чамусьці захацеў яшчэ мець і свой трактар. Усё проста: ён хоча прапанаваць фермеру, вяскоўцу тэхналогію вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі і набор патрэбных машын пад яе. «Убяры маім «Ягуарам», прымяні на маім трактары мае касілкі, і ты атрымаеш эканамічны эфект». Гэта — адзін кірунак. Другі — спецыялізацыя саміх вытворцаў сельскагаспадарчай тэхнікі. Гэта значыць, для выпуску збожжаўборачнага камбайна і «Клаас», і іншыя фірмы заказваюць камплектуючыя часткі на спецыялізаваных прадпрыемствах. Існуе кааперацыя спецыялізаваных фірмаў.

Калі мець на ўвазе набор машын, то па такім шляху пачынаем рухацца і мы. Сёння вяскоўцу патрэбен не «голы» трактар, а трактар у камплекце з навяснымі ці прычапнымі механізмамі і агрэгатамі пад віды работ. Калі для сваіх патрэбаў ён купляе трактар 3022, то да яго набывае і васьмікорпусны плуг — мінойтаўскі ці завода шасцерняў, набывае камбінаваны глебаапрацоўчы пасяўны агрэгат, а таксама раскідальнік і інш. З тым, каб задзейнічаць трактар цалкам, тады ён будзе эканамічна эфектыўны.

У прамысловасці ў нас таксама пашыраецца спецыялізацыя і кааперацыя. І гэта нармальна, калі да мінойтаўскага, скажам, плуга падыдзе долата і лемех ад любога іншага. Лягчэй з запчасткамі, зручней эксплуатаваць тэхніку.

— Напрошваецца пытанне: як вы ўплываеце на гэтыя працэсы?

— Мы пастаянна выходзім з прапановамі ў міністэрства, маем і прамыя даручэнні Урада. Як выходзім? Пратаколы нашых выпрабаванняў у парадку інфармавання накіроўваюцца Савету Міністраў, Міністэрству эканомікі, Міністэрству прамысловасці, Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі, распрацоўшчыку і вытворцу. Для аналізу і прыняцця рашэнняў.

Мы ўважліва сочым за тэндэнцыямі, якія праяўляюць сябе не толькі на замежных, але і на айчынных прадпрыемствах. І калі гэта, скажам, устойлівая тэндэнцыя да страты якасці, то абавязкова адзначаем у пратаколах перыядычных выпрабаванняў. У якасці прыкладу магу спаслацца на пнеўматычную сеялку аднаго з перыферыйных заводаў. Вытворцы аднатыпных сеялак у Еўропе пайшлі далёка наперад, канструкцыя іх значна змянілася, з'явіліся новыя прыстасаванні для задзелкі насення, больш дасканалыя механізмы кантролю якасці высеву — з электронным прывадам, у адрозненне ад нашых механічных. А ў нас удасканаленя канструкцыі не адбывалася, і яна не да канца адпавядае сучасным патрабаванням. Усё гэта мы прааналізавалі, звярнулі ўвагу на пэўнае таптанне на месцы, прапанавалі выканаць мадэрнізацыю па аналагах і развіваць канструкцыю далей. Тым больш, што патэнцыял у нашых заводаў-вытворцаў ёсць.

— Станцыя вядзе выпрабаванні шмат гадоў. Але патрабаванні пастаянна растуць, крытэрыі мяняюцца і становяцца больш жорсткімі?

— З развіццём і ўдасканаленнем сельскагаспадарчых тэхналогій мусяць мяняцца і машыны. Тым больш, што задачы па ўраджайнасці ставяцца кожны год новыя. У той жа час востра паўстала і пытанне энергаэфектыўнасці. Кожная машына нагул павінна быць больш эканамічнай і нават эканамічна мэтазгоднай. Гэтыя крытэрыі становяцца надзвычай актуальнымі цяпер. Мінсельгасхарч ставіць перад намі такія задачы, і мы гэтыя паказчыкі адсочваем.

— Патлумачце, калі ласка, якія вы ўсё ж праводзіце выпрабаванні, якія бываюць іх віды?

— Самымі першымі і найбольш важнымі з'яўляюцца прыёмачныя — гэта выпрабаванні новага ўзору машыны, які распрацаваны па тэхнічным заданні заказчыка. У тэхзаданні бяруцца пад увагу паказчыкі бяспечнасці і функцыянальныя паказчыкі: прадукцыйнасць, расход паліва, энергазатраты. Якасныя паказчыкі: глыбіня задзелкі, раўнамернасць і г.д. Пасля падвядзення вынікаў гэтых выпрабаванняў прымаецца рашэнне дзяржаўнай прыёмачнай камісіяй аб пастаноўцы навінкі на вытворчасць.

Кожнае прадпрыемства абавязана самастойна правесці кваліфікацыйныя выпрабаванні. Яму перадалі канструктарскую дакументацыю, прадпрыемства вырабляе ўстановачную партыю машын і падвяргае іх кваліфікацыйным выпрабаванням. Правярае, ці адпавядае на практыцы выпушчаная ім машына тым крытэрыям, якія выкладзены ў тэхнічных умовах. У тым ліку па бяспечнасці. Правяраецца, наколькі гатова і сама вытворчасць.

Адначасова з гэтым праводзяцца сертыфікацыйныя выпрабаванні.

Наступныя — кантрольныя, перыядычныя. Адзін раз у два-тры гады вытворцы перыядычна выпрабоўваюць сваю серыйную машыну. Зноў жа глядзім, наколькі яна адпавядае тэхнічным умовам.

А таксама — параўнаўчыя, калі на адным і тым жа полі працуюць у аднолькавых умовах некалькі агрэгатаў, і можна параўнаць, наколькі яны больш эфектыўныя ў дачыненні адзін да аднаго. Летась па даручэнні Урада мы праводзілі такія доўгатэрміновыя выпрабаванні плугоў — імпартных і айчынных. Пасля іх нарадзілася жорсткае даручэнне Урада трактарнаму заводу і распрацоўшчыкам айчынных плугоў па далейшым удасканаленні трактароў, паляпшэнні канструкцыі плугоў і рабочых органаў да іх. У прыватнасці, на імпартных трактарах прыменена камп'ютарная сістэма кіравання ўсяго агрэгата на паваротах і разваротах, і эканомяцца секунды, нават хвіліны, якія потым складваюцца ў гадзіны.

— Увесь свет жыве на раздзяленні працы і кааперацыі. З гэтай тэндэнцыяй звязаны вашы паездкі за мяжу?

— Найчасцей мы ездзім для таго, каб ацаніць стан вытворчасці ў пастаўшчыкоў машын. На месцы бачым, як яны выраблюцца, па якой тэхналогіі, якія там для гэтага ўмовы — «сам пан склепаў» ці існуе профільная адладжаная вытворчасць з робататэхнічнымі лініямі і г.д.

— А чым выкліканы вашы бясконцыя камандзіроўкі па Беларусі? Вас жа немагчыма застаць на месцы.

— Выпрабавальнікам сядзець на месцы няма чаго. Іх работа — у полі, разам з тэхнікай, што здае «іспыты» ў абсалютна рэальных умовах. Каб своечасова зарыентаваць вытворцу і, магчыма, папярэдзіць яго аб тэхнічных памылках. На лабараторных выпрабаваннях можна атрымаць толькі прыблізныя звесткі, а дакладны вынік даюць канкрэтнае поле з яго канкрэтнай глебай — суглінкам ці тарфянікам, ці наогул пясчаністай глебай, і канкрэтныя механізатары з іх узроўнем падрыхтоўкі. Такія паказчыкі, як глыбіня, якасць задзелкі — гэта толькі там, у полі. Так што ў асноўным увесь наш калектыў калясіць па Беларусі, а з ім і дырэктар.

У нас за апошнія гады склаўся надзвычай працаздольны калектыў, з якім у нас поўнае ўзаемаразуменне. Існуе агульная скіраванасць на адну задачу — забеспячэнне якасці паставак тэхнікі ў вёску.

Пастаянна вядзецца прафесійная вучоба. Нашы спецыялісты праходзяць перападрыхтоўку ў БелГІСе, БелГІМе, яны маюць сертыфікаты як эксперты-аўдытары, і гэтыя дакументы патрэбна пастаянна пацвярджаць. Акрамя таго вучым людзей самі, на месцах. А таксама нашы работнікі вучацца ў ВНУ, а некалькі спецыялістаў — у аспірантуры. Без вучобы ніяк нельга, мы павінны авалодваць новымі метадамі кантролю і новым апаратным комплексам. Быць у курсе тых змяненняў, якія адбываюцца ў нарматыўных прававых дакументах, наогул у заканадаўстве — беларускім і расійскім. Справа ў тым, што мы акрэдытаваны ў якасці тэхнічнага незалежнага выпрабавальнага цэнтра Федэральнага Агенцтва па тэхнічным рэгламентаванні і метралогіі (Дзяржстандарта Расійскай Федэрацыі) і Міністэрствам сельскай гаспадаркі Расіі ў сістэме добраахвотнай сертыфікацыі сельскагаспадарчай тэхнікі па паказчыках прызначэння.

Прафесар Аляксандр КАРАТКЕВІЧ.

І айчынныя прадпрыемствы-вытворцы могуць, выпрабоўваючы тэхніку ў нас, атрымліваць наша заключэнне, нашы пратаколы для атрымання сертыфікатаў Расійскай Федэрацыі на пастаўку тэхнікі ў Расію. Гэтым карыстаюцца і «Гомельагракамплект», і «Бабруйскаграмаш» і многія іншыя прадпрыемствы. Але нам бы хацелася, каб нашымі паслугамі ў гэтым плане беларускія вытворцы карысталіся часцей, такая магчымасць у нас ёсць.

Размову аб сертыфікацыі сельскагаспадарчай тэхнікі падтрымаў намеснік дырэктара Беларускай МІС, доктар тэхнічных навук, член-карэспандэнт Міжнароднай інжынернай акадэміі ***Аляксандр Вікенцьевіч КАРАТКЕВІЧ****.*

— Хочам мы гэтага ці не, але глабалізацыя эканомікі ідзе высокімі тэмпамі. Спажыўцу прапануецца шмат відаў аднароднай прадукцыі, якая вырабляецца на вельмі далёкіх ад яго, спажыўца, прадпрыемствах. Сёння мы карыстаемся і кітайскімі, і бельгійскімі, і паўночнаамерыканскімі таварамі. А давайце ўспомнім, што было ў самым пачатку прамысловай вытворчасці. Маленькая майстэрня, спажывец жыў побач з гэтай майстэрняй, асабіста ведаў яе гаспадара — вытворцу той прадукцыі, якой ён карыстаўся. Паміж імі існавала пэўная ступень даверу. Тым не менш нават у тыя часы вытворца стараўся неяк пазначыць свой тавар, ставіў нейкую метку, нейкую маркіроўку, каб гэтая прадукцыя была пазнавальнай і карысталася большым даверам.

А цяпер, калі спажывец аддаліўся ад вытворцы (ці наадварот), паўстае важнае пытанне: а як забяспечыць, каб прадукцыя, якую выпускае вытворца, была карыснай і бяспечнай для жыцця, здароўя чалавека, яго маёмасці? Як захаваць ступень даверу, якая існавала некалі? Многія разумныя галовы думалі над гэтым, і нічога лепшага не прыдумалі, як прапанаваць Міжнароднай арганізацыі па стандартызацыі ўвесці сістэму пацвярджэння адпаведнасці патрабаванням. Ёсць спецыяльныя, натыфікаваныя органы (у нас яны называюцца атэставаныя, акрэдытаваныя органы), якія маюць права ацаніць прадукцыю і пісьмова пацвердзіць, што гэтая прадукцыя адпавядае патрабаванням, устаноўленым у гэтай краіне. Вось карэнны рынцып усёй сертыфікацыі. Яна раздзяляецца на тры віды. Калі пацвярджэнне адпаведнасці ажыццяўляецца ў форме сертыфікацыі: пропуск на рынак прадукцыі вытворцы ці пастаўшчыка дае трэці, незалежны ад вытворцы і спажыўца орган (у нашым выпадку — МІС). Другі варыянт: калі пра тое, што прадукцыя — належнай якасці, заяўляе альбо сам вытворца, альбо прадавец. Але таксама пісьмова, і, паводле заканадаўства многіх краін, бярэ на сябе адказнасць — фінансавую, эканамічную, юрыдычную, любую — што гэтая прадукцыя адпавядае пэўным патрабаванням. І трэці від — так званая акрэдытацыя, калі арганізацыі атрымліваюць паўнамоцтвы ад адпаведных органаў на тое, што яны маюць права выконваць гэтыя работы.

Мы сёння карыстаемся міжнародным раздзяленнем працы, закупляем тэхніку, камплектуючыя, запасныя часткі, якія выпускаюцца ў розных краінах. І важна, каб імпарт быў належнай якасці, адказваў нашым патрабаванням і нашым умовам. І менавіта сертыфікат адпаведнасці ёсць дакумент, які пацвярджае якасць і бяспечнасць гэтай прадукцыі, што яна адпавядае патрабаванням, устаноўленым у гэтай краіне.

Вось такую адказную работу прыняў на сябе і наш орган па сертыфікацыі сельскагаспадарчай тэхнікі і трактароў. На яго ў рэспубліцы ўскладзены асноўныя работы па арганізацыі сертыфікацыі прадукцыі — айчыннай і замежнай. Патрабаванні да яе прад'яўляюцца аднолькавыя, і мы правяраем метадам выпрабаванняў адпаведнасць гэтай прадукцыі вызначаным у нашай краіне крытэрыям.

Мы па-свойму ўплываем на якасць тэхнікі, бо на няякасную сертыфікат не выдадзім. Да апошняга часу дзейнічаў тэхнічны кодэкс практыкі, якая ўсталявалася — ТКП 5.1.02 ад 2004 года, ён зацвярджаны Дзяржстандартам Беларусі і вызначаў парадак сертыфікацыі прадукцыі. Яго мы і прытрымліваліся, ім кіраваліся. Але ён утрымлівае агульныя палажэнні па сертыфікацыі, таму летась наш калектыў (пад навуковым кіраўніцтвам Аляксандра Вікенцьевіча. — **Рэд.**) стварыў спецыяльна Тэхнічны кодэкс ТКП 5.2.23—2008 год па сертыфікацыі сельскагаспадарчай тэхнікі, і з 1 красавіка 2009 года ён уступіў у сілу. Была выканана гіганцкая работа, затое дакумент упарадкаваў усе працэдуры па сертыфікацыі сельскагаспадарчай тэхнікі на тэрыторыі Беларусі. Дакумент зацверджаны Дзяржстандартам, узгоднены з шэрагам зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў, з навуковымі інстытутамі і большасцю заводаў сельскагаспадарчага машынабудавання.

Мы — той трэці бок, які не залежыць ні ад вытворцы, ні ад спажыўца, а толькі ад яго вялікасці Факта. Ёсць факт адпаведнасці — атрымлівайце сертыфікат. Ёсць неадпаведнасць хоць бы па адным параметры — выбачайце, калі ласка, але патрэбна распрацоўваць карэктуючыя мерапрыемствы, уносіць змены ў канструкцыю, камплектацыю і дапрацоўваць узор.

Гэта закон для ўсіх, хто хоча паставіць сваю прадукцыю ў Рэспубліку Беларусь. Інакш, згодна з нашым заканадаўствам, якое стаіць на абароне спажыўцоў, яна не дапускаецца на рынак. Для парушальнікаў вызначаны жорсткія меры адміністрацыйнай і матэрыяльнай, нават крымінальнай адказнасці. Існуе прадуманая сістэма, якая ўтрымлівае ўсіх удзельнікаў рынкавых адносінаў у прававым полі. Шкада толькі, што не ўся наменклатура машын, якія прымяняюцца ў сельскагаспадарчай вытворчасці, уваходзіць у пералік для абавязковай сертыфікацыі. На наш погляд, пералік павінен быць шырокім, нават усеабдымным. Сёння ў ім, напрыклад, няма такіх машын і энергаацэнкі сельгастэхнікі, якую ўзначальвае Аляксандр Уладзіміравіч Вашчула.

Мы наведваем выстаўкі ў Гановеры, бываем на замежных фірмах-вытворцах і бачым, чым Захад «дыхае». Там кожная фірма, кожнае прадпрыемства-вытворца выпускае не адну машыну, а набор машын. Знакаміты «Клаас», які выраблял збожжаўборачныя камбайны, кормакамбайны, касілкі, прэсы, чамусьці захацеў яшчэ мець і свой трактар. Усё проста: ён хоча прапанаваць фермеру, вяскоўцу тэхналогію вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі і набор патрэбных машын пад яе. «Убяры маім «Ягуарам», прымяні на маім трактары мае касілкі, і ты атрымаеш эканамічны эфект». Гэта — адзін кірунак. Другі — спецыялізацыя саміх вытворцаў сельскагаспадарчай тэхнікі. Гэта значыць, для выпуску збожжаўборачнага камбайна і «Клаас», і іншыя фірмы заказваюць камплектуючыя часткі на спецыялізаваных прадпрыемствах. Існуе кааперацыя спецыялізаваных фірмаў.

Калі мець на ўвазе набор машын, то па такім шляху пачынаем рухацца і мы. Сёння вяскоўцу патрэбен не «голы» трактар, а трактар у камплекце з навяснымі ці прычапнымі механізмамі і агрэгатамі пад віды работ. Калі для сваіх патрэбаў ён купляе трактар 3022, то да яго набывае і васьмікорпусны плуг — мінойтаўскі ці завода шасцерняў, набывае камбінаваны глебаапрацоўчы пасяўны агрэгат, а таксама раскідальнік і інш. З тым, каб задзейнічаць трактар цалкам